Беларуская газэта. Заснаваная ў 1906 ў Вільні. Адноўленая там жа ў 1991, з лістапада 1996 выходзіць у Менску штотыднёва

НАША НІВА

№ 31 (69)
4 лістапада
1996 г

выходзіць у панядзелкі

ТЭЛЕПРАГРАМА
20 MTV
1 Сьпіс кніжных бэст сэлераў новага тыдня
ПРЭС-РЭЛІЗ
6 Сьвет за тыдзень. Кароткія навіны
РЭФЭРЭНДУМ
7 Шчыры размова. Французскае права
СПАЖЫВЕЦ
10 Што хаваецца за баўгарскай этыкеткай?
12 Літва ў «Экстазі»
Інфарматар

Адвакат Г. Паганяйла:

«Калі сёньня мы згубім аднаго Адамовіча, то заўтра мы згубім тысячы»

Карэспандэнт «НН» Сяргей Харэўскі ўзяў інтэрвію ў адваката Славаміра Адамовіча Гарыя Паганяйлы.

«Наша Ніва»: Спадар Паганяйла, нашыя чытачы ўжо ведаюць Вас завочна ў зьвязку з крымінальнай справай паэта Славаміра Адамовіча. Вы рызыкнулі ўзяцца за абарону асобы, якой супрацьстаіць цэлая машына аўтарытарнага рэжыму. Раскажыце крыху пра сябе.

Г.Паганяйла: Я нарадзіўся 14 кастрычніка 1943 году ў лягеры каля станцыі Плесецк Архангельскай вобласьці, дзе адбывала свой тэрмін — пятнаццаць гадоў пазбаўленьня волі — мая маці, Паганяйла Юлія Пятроўна. Яна туды патрапіла ў 1938, сьледам за мужам, які тут, у Беларускай вайсковай акрузе, займаў пасаду адказную пасаду — начальніка праванога апэратыўнага аддзела штабу акругі. Ён праходзіў па справе камандзіра акругі Ўбарэвіча. Муж маёй маці загінуў падчас катаваньняў. Справа нават не дайшла да суду.

Я, як бачыце, нарадзіўся значна пазьней. Тыя, хто знаёмы з тым, што рабілася ў савецкіх лягерах, мяне зразумеюць. Мой сапраўдны бацька ад мяне не адмаўляўся, ягонае імя ўпісанае ў маю мэтрыку. Ён быў зь лягернае адміністрацыі. Бадай, дзякуючы такому павароту, маей маці, у пэўным сэнсе, пашанцавала... Яна ж была прысуджаная да расстрэлу, як жонка ворага народу. Тыя дзеці, што нараджаліся ў лягерах, да трох гадоў заставаліся пры маці, пасьля іх адбіралі ў дзетдом. І так да 1961. Бяз права жыць у пэўных рэгіёнах, гарадах і г.д. Маці вызвалілі крыху раней — у 1954, але з-за свайго статусу і стану здароўя яна не магла ўзяць мяне. У 1954 пашанцавала і мне: аслабленых дзетдомаўцаў, па сьмерці Сталіна, з Поўначы разьмеркавалі на Поўдзень. Я скончыў школу ў Крыме.

А ў 1957 маці і яе муж, Паганяйла Іван Хведаравіч (пасьмяротна) былі рэабілітаваныя. Па рэабілітацыі, Мінгарвыканкам вылзяліў маці хрушчоўку. Так сям'я сабралася. У 1962 я пайшоў у войска. Па вяртаньні, у 1965 паступіў на юрфак БДУ. Абраў сабе прафэсію адваката. Працаваў спачатку ў Магілёве, пасьля ў Касьцюковіцкім раёне, народным судзьдзём у Быхаўскім раёне. Пасьля — Міністэрства юстыцыі. Дзесяць гадоў быў начальнікам аддзела адвакатуры ў Міністэрстве. А ў 1989 вярнуўся да адвакацкай практыкі

Працяг на старонцы 2

Фірма "Концессия"
рэалізуе
ЗАПЧАСТКІ
да МТЗ і НЯМЕЦКАЙ с/г тэхнікі
ШЫНЫ
ЦЭМЭНТ
ШЫФЭР
Магчымы бартэр на с/г прадукцыю
т/ф (017) 220-36-76

ДЗЯДЫ

Камэнтар на старонцы 2

Гісторыя

КАСТРЫЧНІЦКІ ПЕРАВАРОТ

На галоўнае пытаньне — пра тое, чаму бальшавікі перамаглі ў барацьбе за ўладу ў Петраградзе ў 1917 годзе, дагэтуль не існуе адназначнага адказу...

Камэнтар гісторыка і дакумэнты на старонцы 13

Гаворыць выключанае радыё

31 кастрычніка Менгарвыканкам даў дазвол супрацоўнікам забароненага радыё 101,2FM і Беларускай Асацыяцыі Журналістаў правесьці пікетаваньне на пляцы Волі (плошча Свабоды). Пікет адбудзецца 5 лістапада з 9 да 11 гадзінаў, пасьля з 16 да 18 гадзінаў каля будынку Саюза кампазытараў. Арганізатары пікету патрабуюць неадкладнага вяртаньня ў эфір радыё 101,2 і забесьпячэньня свабоды слова ў краіне! Запрашаем усіх радыёслухачоў, нашых сяброў і прыхільнікаў. Жыве Беларусь!

Калектыў радыё 101,2
Беларуская Асацыяцыя Журналістаў

ІРА вяртаецца

Працяг. Пачатак у №29.

Увосень 1922 году ўрад Ірляндзкага даміньёну запатрабаваў у Дайля (ірляндзкага парлямэнту) надзвычайных паўнамоцтваў для барацьбы з ІРА. Новая антытэрарыстычная стратэгія прадугледжвала ўвядзеньне масавых экзэкуцыяў, наскоранае судаводзтва ў справах рэспубліканцаў і г.д.

Толькі ў студзені 1929 г. было расстраляна 34 сябры ІРА, а да траўня колькасьць пакараных сягнула за 700. У вязьніцах апынулася амаль 13.000 рэспубліканцаў. Хоць ІРА завочна прысудзіла ўсіх дэпутатаў Дайля, якія галасавалі за новыя паўнамоцтвы ўраду, да сьмерці, урад і парлямэнт не паддаліся на пагрозы і працягвалі жорсткую лінію рэпрэсіяў адносна ІРА. У такой сытуацыі лідар ІРА Дэ Валера аддаў загад аб капітуляцыі і зьвярнуўся да парлямэнцкіх формаў барацьбы.

Радыкальнае крыло ІРА адмовілася раззбройвацца. Застаўшыся ў меншасьці, яно займалася пераважна дробнымі правакацыямі (узрывы помнікаў ангельскім каралям у Дубліне, лякальныя сутычкі з паліцыяй. Але ў 1927 годзе (праўда, са сваёй ініцыятывы) баявік ІРА забіў вядомага сваімі праангельскімі поглядамі міністра О'Хігінса.

Між тым на пачатку 30-х гадоў эканамічны крызыс пачаў спрыяць кан'юнктуры нацыяналістычнай апазыцыі, якую ўзначальваў Дэ Валера. Ягоная партыя «Фіяна Фэйл» (Ваяры Ірляндыі) пачынае перадвыбарчую кампанію, да якой падключаецца і ІРА. У 1932 г. Фіяна Фэйл прыходзіць да ўлады. Дэ Валера выконвае свае абяцаньні перад ІРА: яе імя рэабілітаванае, актывістам арганізацыі прапанаваныя пасады ў сілавых структурах рэспублікі, а вэтэранам гарантуюцца пэнсіі.

Працяг на старонцы 4

Помнікі нашы

Стары замак

Хто ня ведае гары Гедыміна (альбо папросту Замкавай) у Вільні? Тут Гедымін заклаў свой пасад. Аднак мураваны замак быў пастаўлены пазьней, у 1393 г. Праўда, падмуркі закладаліся яшчэ за Мяндоўгам, аднак частыя крыжацкія штурмы зводзілі працу муляроў на нішто. І толькі ў 1397-м зьявіліся вежы.

Чаго толькі ні пабачыў замак на сваім вяку! Напрыканцы XVIII ст. ён быў ужо зусім занядбаным, пра што сьведчаць і шматлікія акварэлі і гравюры Смуглевіча, Янушэвіча, Пешкі ды іншых. Але муры яшчэ стаялі, а вежа мела чатыры ярусы...

У 1831-м расейцы спляжылі замак і зрабілі тут фартэцыю. У 1838 г. зь вежы, ад якой пакінулі толькі ўломак з цокалю і аднаго паверху, зрабілі каланчу, дабудаваўшы тры паверхі з дрэва. Амаль так ён і датрываў да нашага стагодзьдзя, пакуль не згарэў... Зьдзічэлыя спаруды сталі месцам для забаваў віленчукоў. Такую пародыю на былую веліч і засьпеў Янка Купала: «Над Вяльлёй-ракой, Па гары крутой Туман сьцелецца; Ні то лом-ламок, Ні то дом-дамок Там віднеецца...»

У 1914 г. расейцы ізноў зрабілі на рэштках замку форт, але не пакарысталіся... Пакарысталіся немцы. Яны моцна ўгрызьліся ў гару, зрабіўшы ў ёй і сховішчы і склады і агнявыя кропкі з розных бакоў, падвёўшы разнастайныя камунікацыі. Тоны нямецкага бэтону і да сёньня схаваныя ў тоўшчы гары. Пасьля ізноў пажар, доўгае занядбаньне. У 1930-м польскія архэолягі і рэстаўратары правялі грунтоўную кансэрвацыю замка і дабудавалі тры паверхі вежы. Такою «вежа Гедыміна» і дайшла да нашага часу.

Будаўнікі, якія ўсё мінулае лета шчыравалі на Верхнім замку, згарнулі працу. Улетку йшло ўпартае змаганьне з апаўзьнямі. Напершы былі давед зеныя да ладу ва дасьцёкі. Сёньня ўжо ўся Гедымінава гара у павуціньні замаскаваных лівнёвых вадасьцёкаў, пра што і не здагадваюцца наведнікі замку.

На працягу стагодзьдзяў ад вільгаці і ветру схілы гары няўхільна спаўзалі, а месцамі сталі настолькі стромымі, што часам абвальваюцца самі. Сёлета ўсходні схіл гары да самага пласту моранай гліны ўмацаваны жалезабэтоннымі палямі, а пазьней тут будзе падсыпаны пласт зямлі.

Магчыма, ня ўсе віленчукі заўважылі й тое, што частка дрэваў высечана. Пад гэтую апэрацыю падпалі толькі хворыя расьліны.

Ва ўмацаваньні мае патрэбу сёньня ўся гара. Не вылучаецца асабліваю надзейнасьцю і яе заходні схіл, на краі якога стаіць замкавая вежа, называная «вежай Гедыміна», хаця збудаваў яе ўнук заснавальніка Вільні — Вялікі князь Вітаўт.

Працяг на старонцы 16

Падпіска дзеля знаёмства

У другім паўгодзьдзі многія ўстановы атрымліваюць «Нашу Ніву» бясплатна. Дзякуючы клопату Беларускага Фонду Сораса, наша газэта прыходзіць у навучальныя ўстановы, школы, музэі і клюбы па ўсёй Беларусі. За мінулыя месяцы Вы пазнаёміліся з «НН», і ў новую падпісную кампанію Вам будзе лягчэй зрабіць свой выбар — ці працягнуць падпіску самастойна, ці адмовіцца ад яе.

Рэдакцыя вельмі разьлічвае на Ваш удзел. З свайго боку мы мяркуем у новым, 1997-м годзе павялічыць колькасьць старонак газэты, пашырыць нашыя рубрыкі, прысьвечаныя гісторыі і культуры, увесьці некалькі новых тэматычных палосаў. Значна пашырыцца таксама наш «Інфарматар». Адным словам, тыднёвік стане больш арганізаваным, зьмястоўным і прыгожым.

Не забудзьцеся працягнуць Вашу падпіску на «НН».
Выпісаць тыднёвік можна на кожнай пошце.
Наш індэкс: 63125.

Самаўспамін

Асэнсаваньне адносінаў да сьмерці належыць да фундамэнтальных тэмаў сьвядомасьці чалавека, што асабліва заўважаецца пры разглядзе культураў старажытнага сьвету. Падчас падарожжаў сьвядомасьці утварылася нават тапаграфія царства памерлых — уваход туды ахоўвае сабака — вартавы Аіда, на скрайнім захадзе («захад», «захад сонца» — сымбаль паміраньня) за ракою Акіян, якая абмывае зямлю, знаходзіцца асфадэлеў поплаў, дзе блукаюць цені памерлых. Аіда — уладара царства памерлых — называюць «шчодрым» і «гасьцінным», бо сьмяротная доля не праміне ніводнага чалавека. Аіду не прыносяць ахвяраў, у яго няма нашчадкаў і нават жонку ён здабыў незаконным шляхам. На ўвесь далейшы эўрапейскі сьветапогляд паўплываў спэцыфічны грэцкі рацыяналізм у падыходзе да факту сьмерці: сакратаўска-плятонаўская лінія філязофіі знаходзіць апірышча ў час сьмерці у вечнасьці, зыходзячы з вучэньня пра бесьсьмяротнасьць душы; эпікурска-стаіцысцкая лінія шукае суцяшэньня ва ўсьведамленьні фатальнай непазьбежнасьці кругазвароту жыцьця й сьмерці.

Народная сьвядомасьць праз культ продкаў сфармавала свой спосаб пераадоленьня трагізму сьмерці. Сьвядомасьць пазбаўляецца бездані пад нагамі й над галавою, бо зьяўляюцца прасторы, заселеныя душамі продкаў, зьяўляюцца кропкі адліку мінулага й будучага часоў. Цяпер вядома, куды сыходзяць мінулыя пакаленьні й куды сыйдзем мы. Зь цягам часу, пры аслабленьні сваяцкіх і абшчынных сувязяў сьмерць усё больш перажываецца ня столькі як сьмерць продка, а як свая ўласная, і культ продкаў трымаецца ўжо ня толькі на непасрэдна жывым пачуцьці, але шмат у чым паводле традыцыі. У Новым часе, спужаўшыся сваёй экзыстэнцыі, чалавек зноў робіць спробы ўзнаўленьня культу продкаў.

Трэба узгадаць яшчэ адзін сюжэт, засвоены й далей пашыраны хрысьціянствам — сьмерць атаясамляецца з нараджэньнем. Хрысьціянская іканаграфія выпрацавала канон Mater dolorosa (Маці тужлівая), якая трымае на каленях цела свайго памерлага сына. Але потым наступіць уваскрашэньне. Ужо псыхааналіз давядзе, што енк перад сьмерцю ў сваёй неўсьвядомленасьці атаясамляецца зь енкам пры аддзяленьні, якое перажываецца ў траўматызьме нараджэньня.

Тут будзе важным прасачыць шлях мадэрнізацыі Дзядоў ад толькі пачуцьця да традыцыі у беларусаў. Дзяды — гэта памерлыя, якіх ушаноўваюць, што генэтычна зьвязана з старажытнымі ўяўленьнямі пра продкаў як ахоўнікаў роду, нашчадкаў, гаспадаркі. Паступова Дзядамі сталі зваць памінальны абрад, рытуальную вячэру ў памяць памерлых родзічаў. Урэшце Дзядамі быў названы дзень, калі адбываецца абрад. Найноўшая беларуская традыцыя утварыла новую зьяву на Дзяды — мітынг-рэквіем. Па-за палітычным кантэкстам беларуская нацыянальная думка ўзнавіла старую традыцыю, але адначасова зьдзейсьніла сьветапоглядны прарыў, разбурыўшы аптымістычную пэрспэктыву адчуваньня часу, якую прадукуюць таталітарныя атэістычныя рэжымы. Беларускі нацыяналізм паспрабаваў закрануць тэму сьмерці, забясьпечыўшы гэтым сабе патрэбу ў самаўзнаўленьні.

Алег Дзярновіч

Упартыя Людзі

Выглядзячы на сваю аддаленасьць ад цэнтру Менску, мікрараён Зялёны Луг уважаюць за выгоднае месца жытлаваньня. Тут няма сьмярдзючых прадпрыемстваў, тут сасновыя лясы й Цнянскае возера. Але вось ужо амаль дзесяць гадоў Зялёны Луг на адзін дзень з пэрыфэрыйнага «спальнага» раёну ператвараецца ў цэнтар грамадзкага жыцьця сталіцы. Штогод на Дзяды менчукі прыходзяць у Курапаты.

Вялікае ўрачыстае шэсьце на ускрайку гораду ня можа не пакідаць уражаньне фантасмагарычнасьці. Людзі зьбіраюцца ў цэнтры, і рушаць з гораду каб... Не вярнуцца? Сёлетні «Курапацкі марш» наймацней выглядаў як нейкі сыход. Калёна ня толькі не зьбірала на шляху новых людзей, але й паціху губляла сваіх удзельнікаў. «Як у апошні шлях», — пракамэнтаваў акцыю адзін дзядок.

«Дзяды» 30 кастрычніка 1988 году лічацца адпраўным пунктам разьвіцьця незалежніцкага дэмакратычнага руху ў Беларусі. Тады шмат юнакоў упершыню сустрэліся з ідэяй Беларускай Мары. Шмат хто адчуў плячо аднадумцаў і паверыў у сябе. За той час сьвята спазнала разнастайныя трансфармацыі. У пэўны момант яно нават прыдбала было адценьне штучнасьці й афіцыёзу. Але пасьля зьмены ўлады ў 1994 годзе шмат хто згубіў магчымасьць для спэкуляваньня на «лубочном» Адраджэньні. Рэчы вярнуліся да сваёй сутнасьці разам з атмасфэрай андэграўнду ва ўмовах таталітарызму. Таму, на сёньняшнія Дзяды прыйшлі незаангажаваныя людзі.

Яны былі такія ж шчырыя, як 30 кастрычніка 1988 году. Падзея васьмігадовай даўніны адрозьніваецца ад сучаснай сваёй узьнесласьцю. Сваёй вераю. Хоць восем гадоў таму было няшмат падставаў для аптымізму: эпоха Савецкага Саюзу падавалася бясконцай, а ўласныя сілы — невялікімі на тле тагачаснай «чырвонай імпэрыі». Але сёньня мы жывем у сваёй незалежнай дзяржаве. Сёньня мы не спадзяемся ні на кога, акрамя сябе. Можа праз гэта Дзяды-96 былі малалюдныя й прыцішаныя. Можа праз гэта дзядку-дэманстранту падалося, што прыйшоўшы да забітых у Курапатах продкаў, можна не вярнуцца да хаты.

Прыцемкі, дробны дождж. Дзятва «чыстага» Зялёнага Лугу рассыпалася на пагорках, назіраючы дзіўную и прыгожую карціну: сьцягі над бясконцай зьмейкай людзей. Чым бліжэй да лесу, тым болей міліцыянтаў. Урэшце, на дарозе паміж шматпавярхоўкамі й Курапацкім урочышчам зьяўляюцца асноўныя сілы ахоўнікаў парадку. Цікава, што можа зрабіць натоўп у лесе, каб справакаваць гэтую армаду на дзеяньні? Распачаць пажар? Пачаць валіць дрэвы? Людзі амаль не зьвяртаюць увагі на міліцыянтаў. Нягучна размаўляюць, запальваюць сьвечкі... На месцы высьветлілася, што прыйшло ня больш за дзьве-тры тысячы чалавек. Агульны настрой, як ніколі, адпавядае прычыне сходу — смутак. Хвіліна маўчаньня. Пачатак прамоваў...

А ўжо праз пятнаццаць хвілінаў да тралейбуснага прыпынку пацёк струмень людзей. Сустрэліся, пагаварылі, прайшліся колькі кілямэтраў да Курапатаў, і дадому. У людзей былі падставы для прыкрасьці. З-за недарэчных для такой акцыі воклічаў «Луку — на муку!», з-за нешматлюднасьці, з-за адсутнасьці падтрымкі новых разнамасных апазыцыянэраў... з-за «гадзкага жыцьця»... З-за надвор'я, урэшце. Бадай, большасьць з тых, хто сустрэўся зь Беларускай Марай 30 кастрычніка 1988 году ля Маскоўскіх могілак, на гэтыя Дзяды засталіся дома. Ці быў сярод удзельнікаў акцыі хоць адзін падлетак, які з убачанага зрабіў якое-кольвек адкрыцьцё? Наўрад ці ён мог у гэты дзень сустрэцца з пачуцьцём моцы й веры. Хутчэй, ён убачыў упартых, якія не жадаюць хаваць сваю Мару. Я ведаю, чаму сёлета ў «Курапацкім маршы» амаль ня ўдзельнічала моладзь. Яна ня менш упартая, але ейная Мара толькі нараджаецца. І ў гэтай Мары пакуль няма месца сьціпласьці.

Севярын Квяткоўскі

ПАЛІТЫЧНЫ КАМЭНТАР

Савецкія палкоўнікі супраць беларускіх генэралаў

Тое, што каманда А.Лукашэнкі пазбаўляецца «ненадзейных» кадраў, — ужо не зьдзіўляе. Тым больш, калі справа тычыцца кадраў, якія зьвязаныя зь Беларусяй сваім нараджэньнем, службовай дзейнасьцю, хто мае сэнтымэнт да гэтае зямлі, хто ўважае Беларусь за свой дом і не абцяжараны ідэямі расейскага панславізму, гэта значыць, — патэнцыйна небясьпечны для сёньняшняй улады. Незаангажаванасьць міністра абароны генэрала Мальцава ў палітычных гульнях рэжыму вырашыла ягоны лёс.

Пра магчымую адстаўку міністра абароны гаварылася шмат, бо надта ненатуральна выглядала яго постаць побач зь пераважнай большасьцю прэзыдэнцкіх агальцоў, а пасада у генэрала, у сьвятле апошніх падзеяў у краіне, станавілася, можна сказаць, вызначальнай. Трэба думаць, цяпер з былым расейскім палкоўнікам Чумаковым А.Лукашэнка будзе адчуваць сябе больш камфортна. Пакуль. Што тычыцца скандальнага выпадку, зь якім зьвязаная адстаўка міністра, то ня будзем наіўнымі — існуе тысяча і адзін спосаб у патрэбны момант зрабіць любога міністра п'яным.

Цяжка верыцца у тое, што генэрал, ведаючы свой плян на дзень, тое, дзе і ў якім складзе яму прыйдзецца выступаць, «дазволіў сабе» забыць, у якіх умовах ён існуе. Апошнія падзеі ў дзяржаве гавораць за тое, што Мальцаў мусіў быў пазбавіцца сваёй пасады і быў яе пазбаўлены. Такая вэрсія выглядае найбольш праўдападобнай. Чаму быў абраны менавіта такі варыянт адстаўкі? Пэўна дзеля таго, каб пазьбегнуць разьвіцьця далейшых падзеяў такога кшталту, як у выпадку з былым міністрам унутраных спраў — генэралам Захаранкам, які сёньня — ледзь ня лідар аб'яднанай апазыцыі і, што самае непрыемнае для рэжыму — досыць папулярны ў народзе. Дарэчы, сп. Захаранка на пытаньне пра адстаўку Мальцава адказаў, што прыклад на месяц таму ў яго зьявілася інфармацыя, што генэралу Мальцаву прапанавалі напісаць рапарт. Што ж тычыцца алькаголю, то, наколькі ён ведае Мальцава, міністар абароны ў гэтых справах быў памяркоўны. Захаранка таксама ня выключыў таго варыянту, што Мальцава п'яным зрабілі.

Сапраўды, арыентуючыся на рэфэрэндум 7 лістапада, Лукашэнка жадаў мець на гэтай пасадзе больш надзейную для сябе асобу. Адмовіўшыся напісаць рапарт, так бы мовіць, па ўласным жаданьні, міністар абароны прымусіў прэзыдэнта і ягоных палкоўнікаў карэктаваць пляны. ...вось рэакцыя. Калі гэтыя меркаваньні маюць пад сабой глебу, то генэрал Мальцаў хутка папоўніць шэрагі апазыцыі. Іншага шляху і магчымасьці адказаць у яго не застаецца. Закранутая годнасьць чалавека і афіцэра.

Напэўна, гэта не апошняя адстаўка ў бліжэйшай будучыні. Ня трэба быць асабліва пільным, каб прасачыць пэўную тэндэнцыю рэжыму ў адносінах да сілавых ведамстваў. З-за межаў краіны прывозяцца палкоўнікі і прызначаюцца другімі асобамі ў сілавых міністэрствах, а пры зручных, і нават нязручных момантах становяцца асобамі першымі. Дзеля чаго? Каб у час ікс наган ня даў асечкі. А час ікс сьпее.

Падобна, што гэткага ж лёсу не пазьбегне і старшыня дзяржбясьпекі сп. Мацкевіч — апошні зь беларускіх магіканаў сярод сілавікоў. Рэжым алергуе на самыя нязначныя праявы тутэйшасьці і самастойнасьці сярод тых, хто займае ключавыя пасады. Рэжыму трэба пасьпець, часу засталося няшмат. Таму саромецца ў сродках не выпадае. Палкоўнікі атакуюць генэралаў. Генэралы, пазбавіўшыся пасады, разам зь ёю пазбаўляюцца комплексаў улады. Усё гаворыць за тое, што рэшта восені мусіць прынесьці сур'ёзныя клопаты палкоўнікам, генэралам і ўсім астатнім. Калі палітыку пачынаюць вызначаць армейскія чыны, то з намінацыі тэатар яна пераходзіць у намінацыю палігон. Але гэта, як кажуць, ужо зусім іншая гісторыя.

Алег Дашкевіч

«Калі

(працяг са стар. 1)

«НН»: Ці ў Вашай практыцы справа Адамовіча — першая, зьвязаная зь літаратурай?

Г.П.: Гэта наогул першая справа на маёй памяці! З часоў апошняе вайны, дакладней, з 1939, гэта першая ў краіне справа, заведзеная з нагоды стварэньня мастацкага твора. Хіба што можна ўзгадаць справу Пушкіна, калі ён хадзіў на ўгодкі БНР з транспарантам па праспэкце і называў гэта хэпэнінгам. Але тут пытаньне спрэчнае... А вось рэпрэсіі за твор, які можна тыражаваць — гэта ўпершыню пасьля Сталіна. Творы забаранялі, кнігі ліквідавалі, выставы зачынялі, аднак упершыню за кратамі апынуўся паэт за верш. Аналягаў гэтае справы у гісторыі пасьляваеннай Беларусі няма.

Калі я толькі пазнаёміўся са справаю Славаміра, зь ягоным абвінавачаньнем, мне стала ясна, што любы больш-менш пісьменны школьнік ня ўгледзеў бы ў вершы «Убей президента!» таго, што ў ім угледзелі нашыя «чэкісты». Там жа толькі асацыяцыі, абагульненыя вобразы. Гэта ягонае сьветаўспрыманьне. У вершы няма ні канкрэтнага прозьвішча, ні канкрэтнай пасады (прозьвішча чаго?).

Само завядзеньне гэтае справы — гэта ўжо шараговы факт з рэчышча тае палітыкі, якую праводзіць адміністрацыя Лукашэнкі, а значыць і падпарадкаваныя ёй праваахоўныя органы ў дачыненьні да іншадумцаў. У Адамовіча патрапіла рыкашэтам ад масаванае атакі на апазыцыю, задушэньня незалежных крыніцаў інфармацыі. Мэта ў тых, хто сёньня пры ўладзе — запалохаць людзей, творчую інтэлігенцыю, журналістаў.

«НН»: Калі мы з Вамі пазнаёміліся, паўтаілы таму, Вы ўнікалі палітыкі, і былі вельмі абачлівыя ў падборы словаў...

Г.П.: Унутрана я адразу зразумеў характар гэтае справы. Аднак, пакуль я меў толькі факт прыцягненьня асобы да крымінальнае адказнасьці па канкрэтных пунктах абвінавачаньня: заклік да зьдзяйсьненьня тэрарыстычнага акту, спроба парушыць дзяржаўную мяжу, нашэньне халоднае зброі, — я ня меў фармальных падставаў тыражаваць думку пра тое, што гэта палітычны пераслед. Але, як толькі я на практыцы пераканаўся, што перасьлед вязьня на відавочна надуманых матывах і справа ўсяляк зацягваецца, што абвінавачаньне нічым не абгрунтоўваецца і зьвязанае выключна з ТВОРЧАЙ дзейнасьцю, я гатовы гаварыць пра гэта ўго...

Калі зачыняеш дзьверы на ўсе замкі, кухня здаецца крэпасьцю. Тут можна казаць усё, што хочаш, гатаваць бульбу ці боршч, ці бутэрброд з гарбатаю, і ня слухаць радыё. Можна пазбавіцца няпэўнага і нязвыклага адчуваньня нечыяй нябачнай прысутнасьці за сьпінаю. Халера ведае навошта яно і адкуль. Менск «ціська» на сьвядомасьць, але гэта заўважна тады, калі вяртаесься. Не з далёкай вёскі ці мястэчка, а з-за межаў тваёй краіны.

Упершыню, адразу перапрашаюся за гэткую згадку, Менск ціснуў пасьля вяртаньня з Каўказу. Я доўга не магла ўсьвядоміць, як гэта можа быць, бо тут не было ні бэтээраў, ні аўтаматчыкаў, ні блёкпастоў, ні руінаў. Ні штокрокавых, надакучлівых напамінаў пра кулі і міны, ні маразоў пад дваццаць, ні вакзала зь няпэўным рухам транспарту, ні абяцаньняў дэпартаваць нахабных замежных журналістаў...

Але амаль год таму тут ужо не было спакою.

«Вас, баб, нельга браць на вайну, бо яна вам западае ў душу», — сказаў адночы старэйшы калега, які не вылазіць з «Чорнага бусла».

Як бы там ні было, раней усе, хто сутыкаўся з войнамі, маглі прыехаць на радзіму як дамоў. Сёньня радзіма сьціснулася да памераў уласнай кухні. А ў радыё знаёмы голас не дазваляе «ўносіць рас

"Наша Ніва" незалежны тыднёвік НАША НІВА
заснаваны ў 1906
адноўлены ў 1991
заснавальнік і выдавец Павал Жук
рэдактар Сяргей Дубавец
адказны сакратар Алег Дзярновіч
мастацкі рэдактар Сяргей Харэўскі
навіны Уладзімер Бараніч
рэдактар дадатку "Інфарматар" Андрэй Лапцёнак
макет Віктар Корзун
вёрстка Іна Жызьнеўская
набор Таццяна Чуйвід
стыль і карэктура Паўлюк Канавальчык
пры ўдзеле Сяргея Шупы
прадстаўнік рэдакцыі ў Гомелі Зьміцер Бартосік (тэл. 56-94-36)
АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ
220123 Менск, а/с 71
Тэл./факс 239-78-49
E-mail: edit@niva.minsk.by
Падпісны індэкс 63125
Пасьведчаньне аб рэгістрацыі перыядычнага выданьня № 581 ад 4-га ліпеня 1996 г., выдадзенае Дзяржаўным камітэтам друку Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, пр. газэты «Известия», д. 8, кв. 173.

Адвакат Г. Паганяйла

«Калі сёньня мы згубім аднаго Адамовіча, то заўтра мы згубім тысячы»

лас. Сёньня я маю права гэтак казаць і шырокая грамадзкасьць павінна гэта ведаць. За паэта трэба змагацца! Мы сутыкнемся з фактам незаконнага асуджэньня таленавітага маладога чалавека. Як юрыст, я буду рабіць усё, каб гэты незаконны прысуд ня быў вынесены, а з іншага боку, грамадзкасьць, разумеючы, куды можа завесьці такая практыка, ня мусіць маўчаць. Калі сёньня мы разам не заступімся за Адамовіча, за іншых людзей, якія таксама падпадаюць пад палітычныя рэпрэсіі — то нас чакаюць нашмат горшыя часы. Па сутнасьці, тое, з чым мы сутыкнуліся — гэта ўжо 37-ы год.

«НН»: Ці ёсьць якія дакумэнтальныя падставы лічыць гэтую справу «замоўленай»? Ці можна назваць канкрэтныя прозьвішчы тых, хто пэрсанальна нясе адказнасьць за ўвесь гэты фарс?

Г.П.: Давайце разважаць гэтак: калі справа не замоўленая, то хто тады замінаў правесьці найперш літаратурную экспэртызу? Я не спэцыяліст, і я ня бачу ў зьбіральным вобразе «усатого Саша» нікога з «усенародна любімых». Хто мне давёў што-небудзь адваротнае?

Сакольчык... Я б наогул ня згадваў гэтае прозьвішча. Сьледзтва вялі сакольчыкі. Іх сёньня ў апараце КГБ, як і ва ўсе часы — процьма. Гэта ўсё дробязь... Ім указ — сачы, пільнуй за партыямі, за паэтамі, за мастакамі. Над імі — начальнік сьледчага аддзела — Новікаў, здаецца, Яўген. Пасьля асоба, якая зьдзяйсьняе нагляд і над ім, дакладней, за законнасьцю у КГБ (у Пракуратуры краіны ёсьць цэлы такі аддзел) — Сухаверх Іван Іванавіч. Менавіта ён і курыраваў нашую справу. Калі б нагляд за «законнасьцю» адбываўся хоць бы фармальна, то, да прыкладу, літаратурную экспэртызу маглі б і замовіць, даць распараджэньне. Але ў Пракуратуры гэтага ня хочуць. Калі нашае хадайніцтва аб спыненьні крымінальнае справы за бяздоказнасьцю было адхіленае з надуманых і нематываваных падставаў, я раблю выснову: справу фабрыкуюць мэтанакіравана. Рыхтуецца судовы спэктакль зь вядомым вынікам.

«НН»: Вы маеце на ўвазе ня толькі віцебскага пракурора?...

Г.П.: Бог з тым віцебскім пракурорам! Абвінавачае заключэньне падпісаў першы намесьнік Генэральнага пракурора Кандрацьеў. Гэта пасьля Генэральнага пракурора самая высокая адказная асоба ў краіне, якая перад падпісаньнем заключэньня мусіла б пазнаёміцца са справаю і даць ёй аб'ектыўную прававую ацэнку. Атрымліваецца, што Генэральная пракуратура лічыць, што віна Адамовіча ў зьдзяйсьненьні крымінальна караных дзеяньняў даведзеная сьледзтвам і справа падлягае разгляду ў судзе...

«НН»: Кола замкнулася?

Г.П.: Так... Але, бадай, сёньня адзінае, што мною рухае працаваць гэтую справу — гэта перакананьне ў тым, што расправа ўжо падрыхтаваная. Апошняй кропляй для мяне стаў разгляд у Вярхоўным судзе пратэсту пракурора Віцебскай вобласьці на вызначэньне судовай калегіі па крымінальных справах Віцебскае вобласьці ад 3 верасьня 1996 году. Гэтая калегія аб'ектыўна вызначыла, што недастаткова доказаў вінаватасьці і справа мусіць быць вернутая на дасьледаваньне. Прыватны пратэст пракурора Віцебскай вобласьці быў задаволены. Справа вернутая ў той жа суд, але склад судовае калегіі будзе зьменены...

«НН»: Яны разьлічваюць на меней сумленных судзьдзяў...

Г.П.: У мяне пакуль усё ж ёсьць спадзеў на тое, што ў нашай судовай сыстэме дастаткова сумленных юрыстаў. А вось у канкрэтных умовах... калі прызначэньне на пасаду, перамяшчэньне па службе, матэрыяльнае забесьпячэньне гэтых людзей залежыць сёньня адно ад Лукашэнкі, маіх спадзяваньняў паменшала. Сутнасьць у тым, што, не зважаючы на дадзеныя суду заключэньні лепшых літаратуразнаўцаў пра тое, што на верашы немагчыма ідэнтыфікаваць літаратурнага героя з асобаю першае асобы ў Беларусі, пры наяўнасьці неаспрэчных доказаў у невінаватасьці паэта Вярхоўны Суд распарадзіўся: судзіць!

«НН»: Выходзіць, у межах сёньняшняй прававой сыстэмы вырашыць справу Адамовіча...

Г.П.: ... немагчыма! Нават пасьля галадоўкі нашыя хадайніцтвы аб вызваленьні з-пад варты — з гуманных меркаваньняў — былі адхіленыя... Адамовіча можа выратаваць толькі салідарнасьць зь ім усіх літаратараў, журналістаў, палітыкаў і папросту сумленных грамадзянаў Беларусі. Калі сёньня мы згубім аднаго Адамовіча, то заўтра мы згубім тысячы. Канцлагер у Валоўнічыне ўжо гатовы. Я гаварыў зь людзьмі, якія былі там на месцы, высьветлілі... Гатовы! Ці ёсьць якая надзея? Ёсьць. Людзі ўжо не дадуць сябе зацугляць. Праз гэта мы ўжо прайшлі. Сёньня ўлады ўжо ня змогуць у адной Беларусі так рэзка ўзяць у цугла, калі... будзе сапраўды шырокая падтрымка тым, хто сёньня за кратамі паасобку, калі гэтыя і іншыя працэсы будуць асьвятляцца шырока і галосна.

«НН»: Які далейшы мэханізм працэса Адамовіча?

Г.П.: Я рыхтую выступ на першым судовым пасяджэньні. Але ж дата суда зусім невядомая. Я толькі што тэлефанаваў у Віцебск і высьветліў, што... дакумэнты да іх не дайшлі! З 11 верасьня! Я мяркую, што ў гэтым вінаватыя людзі з канцылярыі Вярхоўнага Суда. Зрэшты, рашэньне судовай калегіі слушнае — адправіць справу на дасьледаваньне. Аднак, вызваліць з-пад варты адмовіліся. Канкрэтна гэтае рашэньне прыняў старшыня Віцебскай калегіі Даўлюд і засядацелі Прохарава і Фаміна. Падобныя прэцэдэнты былі, паводле закону пад вартаю можна трымаць чалавека да паўтара годоў, праўда, пры цяжкіх злачынствах. За тое, што інкрымінуюць Адамовічу, максымальны тэрмін — тры гады пазбаўленьня волі. Аднак, спэцыфіка ягоных праваправарушэньняў палягае ў тым, што кожнае зь іх прадугледжвае альтэрнатыўнае пакараньне, напрыклад, штраф. Пытаюся, за што восем месяцаў Адамовіча трымаюць за кратамі без суда?

Калі Адамовіч будзе апраўданы то ён атрымае кампэнсацыю і за свой страчаны працоўны час і за маральныя страты. Гэта нам гарантавана сёньняшняй Канстытуцыяй, якую зьбіраюцца скасаваць на рэфэрэндуме.

«НН»: Вы не рызыкуеце, калі так актыўна займаецеся абаронай Адамовіча?

Г.П.: Я — загадчык юрыдычнай кансультацыі Савецкага раёну, сябра калегіі Менскай гарадзкой калегіі адвакатаў, гэта значыць пакуль, незалежны чалавек. «Націснуць» на мяне немагчыма. Хіба што цэглаю па галаве... Больш таго, у мяне адняць ад нараджэньня, у мяне ўжо не адымуць. Галоўнае — вызваліць сумленнага чалавека. Адамовіч — мужны, сумленны і таленавіты чалавек. Цяпер я гэта ведаю. Творчыя людзі бліжэйшыя да Бога, а значыць, яны маюць рацыю і права яе даводзіць так, як ім наканавана. Нашая «сінява», крымінальнікі, ніколі ня йдуць на галадоўкі, бо гэта шчыры пратэст мужнага чалавека. Я думаю адправіць ліст і самому Лукашэнку.

«НН»: ...?

Г.П.: Наўрад ці да яго даходзяць усе гэтыя дэталі справы. Яму толькі інтэрпрэтуюць. Ёсьць сілы, якім выгадна зацыкліваць на гэтым і іншых палітычных працэсах. Гэтую справу накіроўвае, хутчэй за ўсё, Шэйман. Я так гэта ўяўляю. Над першым намесьнікам Генэральнага пракурора толькі сам Генэральны пракурор Капітан. Нашто Капітану Адамовіч? А над Капітанам — толькі Шэйман, які камандуе ўсёй праваахоўнай сыстэмаю краіны і КГБ, ды... асабіста Лукашэнка.

Дзённік без канца

Школа

Ганна Матусэвіч

23.10. Віталіка ў школе называюць «пратэстантам» за нашыты на куртцы бел-чырвона-белы сьцяг.

24.10. ... Праходзячы паўз цяое тутэйшыя паўгалоўкі і добра яшчэ, калі сыкнуць табе: «здрасьце» ці «сьце». А тут коціцца ля маіх ног маленечкае яснае дзіва і звоніць срэбным званочкам: «Добры дзень, цёця!

— Добры дзень, зайчык!

— Я ня зайчык, я — Арол!

25.10. — Добрай раніцы! (жыдоўская нацыя) Падпішэцеся на лісьце, калі Вы хочаце, каб Вашае дзіцятка навучалася па-беларуску (Я зьвяртаюся да бацькі маленькага Арла).

— А... а... а... Вы знаеце, што зь іхняй школы начальнікі езьдзілі, каб па-руску дзеці вучыліся...

— Дзякуй!

26.10. Прыляцела сінічка, двойчы стукалася крыльцамі ў вакно... Умомант зьледзянела сэрца! Пра ўсіх падумалася, а найперш пра Славаміра... (Я выправіла яму пасылку з кнігамі.)

Схадзіла да трох настаўніц наконт подпісаў за навучаньне дзяцей па-беларуску. О, які імпэрыял (атрута) яны выдзяляюць! Невыносным чадам і смуродам атручаныя іхнія памяшканьні! Людзі, гэта ж найвялікшае злачынства, што мы давяраем чысьцюткія душы нашых дзетак гэтым!.. (Я не знаходжу слова...)

Я зноў іду да людзей. Бо больш няма куды. Будзь, што будзе.

Мая цёзка любіць пагаварыць. Яна адна гадуе сына, жыве на птушыных правах у гэтым пакойчыку, усяго баіцца. Мне няма часу, але я сяджу і слухаю, слухаю і з усім згаджаюся. Бо яна мае абсалютную рацыю. І вось узнагарода за маё цярпеньне. Яна падпісвае ліст.

— Дзякуй табе, вялікі дзякуй!

— Ну што ты мне дзякуеш, няма за што!

Але я ведаю, што ёсьць за што: бо яна у гэтае імгненьне выратавала нечую душу. І зусім няважна, што яна ня ведае пра гэта...

Дзякуй усім людзям, хто перамагае ў сабе страх!

Муж бядуе, што за ўсімі гэтымі паходамі не паслухалі «Свабоды».

— А што тут слухаць, калі ўсё самае значнае адбываецца ў нашай хаце! Я табе даўно пра гэта казала. То радасьцю, то горыччу, то смуткам, то жалем, то спакоем, то ласкай адгукаецца на ўсё маё сэрца.

27.10. Муж бачыў зусім нядужага Толіка — майго стрыечнага брата. Разумны хлопец. Ён мне тады, увесну, дапамог, сказаўшы, што «саўсім скромным быць няможна, бо задзяўбуць».

Манія перасьледу

...кол» і шкадуе, што няма каму пайсьці зь ім «на барыкады». Бо краіна аказваецца у кальцы ворагаў.

Нелюбімыя газэты адна за адной б'юць у вочы пытаньнем загалоўкаў: «Куды глядзіць КГБ?», «Спэцслужбы Захаду ня дрэмлюць. А што робяць нашы»?

Беднае КГБ! Яно, аказваецца, «недаацаніла» заяву расейскага дэпутата Ілюхіна, старшыні Камітэта бясьпекі Дзярждумы. Днямі давялося прысутнічаць на судовым працэсе, дзе судзілі двух маладых міліцыянтаў за перавышэньне службовых паўнамоцтваў. «Мы трапляем у машыну, якую стварылі самі», — сказаў мне адзін зь іх. Падыйшлі сьведкі зь ліку начальства, расказалі пра цяжкія ўмовы працы. А хутка зноў мітынг! Я нагадала пра Дзяды восем гадоў таму. «Вы там былі?! Дык гэта ня мы вас разганялі, а КГБ!» Ну а вы, шаноўныя, што рабілі?

Але вернемся да нашых «шпіёнаманаў». Аднойчы ў Маскве адзін сымпатычны пажылы вахцёр у адной установе падарыў мне газэту «Десница». Вялізны партрэт А.Лукашэнкі — як напамін, што недзе ёсьць Беларусь і хутка я туды вярнуся. Вахцёр заўважае маю ўсьмешку, і ў нас завязваецца размова. Ён не разумее, як гэта: незалежная Беларусь. Альбо Украіна яшчэ гэтая!.. Трэба, кажа, далучыць, а то Саюз развалілі агенты ўплыву.

Я ня ведаю пра агентаў. Я ведаю пра радзіму. «Лепш, — кажу, — прыяжджайце ў госьці да сваіх сваякоў у Беларусь». У адказ — падазроны погляд.

— Таццяна, Вы замбіраваны! — сам Міхаіл Трафімавіч на маёй радзіме ніколі ня быў, але ўсё жыцьцё працаваў у разьведцы.

Доўга з дакорам хітаў галавой мне ўсьлед. Не разумею я ні ў разьведцы, ні ва ўплывах, ні ў барыкадах.

Людзі з падобным мысьленьнем сталі трапляцца мне раптам на кожным кроку. Я слухала іх і спрабавала зразумець. Не разумела.

Вось хлопец, масквіч, якога заўчасна выцягнула з Бамуту сьмерць бацькі. Замест крыжыка на грудзях — куля дробнага калібру. Маці і малыя сёстры, патрэба ў грашах. «Трэба, — кажа, — паехаць за сербаў паваяваць» (лета было яшчэ на двары). Падумаў. «Не, — кажа, — лепш напэўна, у ФСБ: там хаты даюць». Высьветлілася, ягоная радзіма павінна быць аднаўленая ў межах Расеі Івана Грознага. Беларусь з Украінай дадаць, а Каўказ — аддзяліць, бо ўжо «дастаў» за два гады. Я нешта тлумачыла. «Эх ты, сэпаратыстка! — сказаў ён з ласкавым расчараваньнем. — Трэба некалі паехаць паглядзець, што там за Беларусь такая у вас».

Цяжэй за ўсіх сёньня, мабыць, ім, расейцам. Пакаленьнямі іх вучылі зусім іншаму! Мае тамтэйшыя сваякі, напрыклад, падзяліліся ў поглядах. Старэйшае пакаленьне пытаецца, чаму ў нас ня любяць Лукашэнку. Малодшае чакае, калі яго пакажа тэлебачаньне, каб пасьмяяцца.

Каля Камароўкі прадаецца расейская газэта «Завтра». Разам зь «Лимонкой». У Маскве я некалі купляла іх дзеля цікавасьці. «Старуха Боннер слегла с инфарктом», «Журналист из «Общей газеты» такой и такой, не попадайся на глаза, ублюдок», «Депутат Илюхин, продолжайте!» У «Лимонцы» ёсьць яшчэ нейкі «Курс маладога байца» — яшчэ цікавей, чым знойдзеныя ў Менску ўлёткі УНСО. Але УНСО «сядзіць» і ў нас, і ў іх, а Ілюхіна хваляць некаторыя нашы газэты... А ў падоранай мне «Деснице» ёсьць артыкул пра ворагаў Масквы ў дзьвюх краінах: нацыяналістаў ва Украіне і «непрымірымых» у Чачэніі.

Адзін з тых, каго я спрабавала зразумець, правёў са мной асьветніцкую, так бы мовіць, працу. Вось некалькі вытрымак з часопіса «Безопасность» за верасень мінулага году, калі ні «краіны ў кальцы ворагаў», ні нападаў на журналістаў, ні слова «барыкады» яшчэ не было ў мірнай Беларусі. З матэрыялаў расейска-амэрыканскай навуковай канфэрэнцыі на тэму бясьпекі пасьля сканчэньня халоднай вайны»:

«Мы жывем у стане новай, чацьвертай сусьветнай вайны. Мы не заўважылі яе пачатку... Яна застаецца... закамуфляванай пад розныя міратворчыя акцыі і ідэалягічныя завесы... Яна ўзьнікла на глебе геапалітычнага саперніцтва і імкненьня ЗША да сусьветнага панаваньня». Пералічваюцца новыя тэхналёгіі: імунадэфіцытныя, інфармацыйныя, генэтычныя, несьмяротныя віды зброі. «Гэта вайна ня толькі супраць Расеі, — піша таварыш генэрал-маёр, — яна супраць усяго чалавецтва, хоць Расея застаецца ў ёй першачарговым аб'ектам агрэсіўных памкненьняў. Як ужо раз у гісторыі Расея, абараняючы сябе, засланяе сабою сьвет ад... вынішчэньня цэлых народаў!» Карацей, «калі загіне Расея, сьвет чакае «канец чалавечай цывілізацыі». Таму што «Расея — гэта асобы слой сусьветнай цывілізацыі, калі хочаце, базавы».

«Інфармацыйная зброя можа прымяняцца задоўга да пачатку баявых дзеяньняў». Гэтая самая зброя патрэбная для «дасягненьня інфарматыўнай перавагі над праціўнікам», «цяжкасьцяў у атрыманьні праціўнікам своечасовай, поўнай і аб'ектыўнай інфармацыі, што прывядзе да выпрацоўкі неадэкватных рашэньняў і прымусіць дзейнічаць сабе на шкоду». Сярод розных там мэтадаў і мэтаў — кампутарныя вірусы, здольныя пранікаць у электронныя тэлефонныя станцыі і сыстэмы кіраваньня», «лягічныя бомбы», якія могуць скажаць інфармацыю, «сродкі падаўленьня інфармацыйнага абмену і яго фальсыфікацыі», а таксама сродкі кіраваньня гэтым усім «на адлегласьці».

Затое якія задачы можна вырашыць! «Стварэньне атмасфэры нестабільнасьці ў грамадзтве», «дыскрэдытацыя органаў улады», «стварэньне атмасфэры бездухоўнасьці», «маніпуляваньне палітычнай арыентацыяй груп насельніцтва», «дэстабілізацыя палітычных адносінаў паміж партыямі, падаўленьне апазыцыі»... Ёсьць і пра падтрымку агентаў уплыву.

Мінуў год. Узьнікае ўражаньне, што нейкая частка журналістаў дзяржаўных газэт у Беларусі праштудыявала гэтыя кніжкі, часопісы і артыкулы яшчэ задоўга да ўсіх нашых падзеяў. Манія праcьледу ўзьнікае ў «вярхах», і журналісты ўцягваюцца ў яе. Што да мяне, то не хачу я гэтых боек, ні халодных, ні гарачых! Але мяне зноў спытаюць, за каго я? І яшчэ: ці не працавала ў Грозным снайпэрам? Ужо ня смешна! Правяраю свае замкі. Ручка здаецца пісталетам, а кухня-крэпасьць — не такой ужо непрыступнай.

За каго я? За каго мы ўсе? За сябе, за дом, за радзіму. Але калі мы кажам пра тое, што мы тут любім, нехта абавязкова дадасьць за нас: каго б мы маглі (ці павінны?) згодна з тэорыямі, не любіць.

Таццяна Сьніткo

Нямецкі культурны цэнтар у Менску

30 кастрычніка адбылося ўрачыстае адкрыцьцё Нямецкага культурнага цэнтру імя Гётэ ў Менску. Гэтай падзеі папярэднічаў трохгадовы падрыхтоўчы пэрыяд.

Менскі цэнтар – адзін з 150 культурных цэнтраў Інстытуту імя Гётэ, якія дзейнічаюць у 70 краінах.

Дзейнасьць Нямецкага культурнага цэнтру у Беларусі пачалася ў ліпені 1993 г. Адзін з новых і галоўных праектаў Нямецкага культурнага цэнтру ў Менску -- бібліятэка. Пачынаючы з 1 кастрычніка ўсімі паслугамі бібліятэкі можна карыстацца ў поўным аб'ёме. А гэта 4.000 кніг па філязофіі, псыхалёгіі, рэлігіі, тэалёгіі, сацыялёгіі, статыстыцы, палітыцы, эканоміцы, праву, мове, экалёгіі, выяўленчаму мастацтву, архітэктуры, дызайну, фатаграфіі, музыцы, кіно, тэатру, літаратуры, геаграфіі, гісторыі. У відэатэцы ёсьць мастацкія фільмы, спэктаклі, фільмы пра нямецкія гарады й на гістарычныя тэмы. У бібліятэку рэгулярна паступаюць сьвежыя нумары нямецкіх штодзённых газэтаў, тыднёвікаў і часопісаў розных кірункаў. Усе матэрыялы бібліятэкі, за выключэньнем энцыкляпэдычных выданьняў, мастацкіх альбомаў, газэтаў, часопісаў і відэазапісаў, могуць выдавацца дадому. Бібліятэка Цэнтру Гётэ ў Менску пасярэднік ва ўсталяваньні кантактаў зь бібліятэчнай сыстэмай Нямеччыны.

A.Dz.

GOETHE-INSTITUT MINSK

Нямецкі культурны цэнтар
імя Гётэ ў Менску
220034 Менск,
Дом літаратара, вул. Фрунзэ, 5
тэл. 236-34-33, факс 236-73-14
Аддзел мовы — тэл. 236-12-57
Бібліятэка — тэл. 236-04-91
Бібліятэка працуе:
аўторак, чацьвер 15 00 19 00
серада пятніца 14 00-18 00
субота 9.30-15.00

Здымак Уладзімера Шлапака

Міжнародны камэнтар

Думайце, Эрню, думайце

Францускі тыднёвік «Экспрэс» надрукаваў артыкул па выніках сэнсацыйнага журналісцкага расьследаваньня: высьветлілася, што былы міністар абароны Францыі ва урадзе сацыялістаў Шарль Эрню шпіёніў на карысьць Баўгарыі, за тым Румыніі і доўгі час – Савецкага Саюзу. Пра гэта стала вядома яшчэ прэзыдэнту Мітэрану, пасьля – прэм'еру Баладзюру і Шыраку, але яны не абнародавалі ганебную для Францыі праўду.

Маладому і амбітнаму Эрню бракавала грошай і ён залез у пазыку. Менавіта на такіх ласых да ўлады і посьпеху маладых людзей палявалі спэцслужбы новых сатэлітаў Масквы, што перанялі досьвед ГПУ. Эрню аплацілі пазыку і выбарчую кампанію, што дала яму мандат дэпутата Нацыянальнага сходу. Уласна заробак за інфармаваньне Сафіі і Бухарэсту Эрню спачатку меў невялічкі. Сваю палітычную кар'еру ён зьвязаў з сацыялістамі. Быу блізкім сябрам Мітэрана і разам зь ім на руінах Францускай сэкцыі рабочага інтэрнацыяналу засноўвау Аб'яднаную Сацыялістычную Партыю, якая пазьнейператварылася ў сучасную ФСП, заўсёды выступаў за цесны саюз з камуністамі.

Ужо ў першы прыезд Эрню ў Маскву аднойчы вечарам ён таямніча зьнік і патлумачыў гэта на раніцы іншым удзельнікам дэлегацыі «прыставаньнямі маскоўскіх прастытутак».

Пасьля перамогі сацыялістаў у 1981 годзе у першым урадзе, у якім удзельнічалі таксама камуністы, Эрню атрымаў ключавы пост міністра абароны

Якія ж разявакі працуюць у францускаи контрразьведцы! Сувязь Эрню з Усходам выявілася толькі пры адкрыцьці архіваў пасьля падзеньня Бэрлінскага муру.

Францыя пацярпела не адну зьнешнепалітычную няўдачу за апошні час. Агульнае асуджэньне францускай праграмы выпрабаваньняў ядзернай зброі ўжо было паставіла Парыж на мяжу міжнароднай ізаляцыі

Кіраўніка аўтарытарнага каляніяльнага беларускага рэжыму не прынялі нідзе, апроч Анкары (якая сама пасьля перамогі ісламістаў і з прычыны жахлівых парушэнь і яў правоў чалавека трапіла ў міжнародную ізаляцыю) і Парыжа. Нездарма 18 кастрычніка перад «маючым адбыцца» дзяржаўным пераваротам у Менску менавіта францускі пасол Клёд Жаліф быу тым прадстаўніком Эўропы, які сустрэўся з Лукашэнкам. Пра што казаў з каменным тварам (як было бачна з тэлерэпартажу) Жаліф можна здагадацца. Апазыцыя і прэса згадалі б Шыраку візыт Лукашэнкі, калі б пераварот адбыўся.

Дарэчы, француская сацыялістычная апазыцыя, несумненна, моцна пацерпіць ад скандалу з Эрню. Мітэран сам у 94-м дапамог упершыню паталіць родную партыю на выбарах. Ці не спрычынілася да гэтага тое, што ён даведаўся пра Эрню?

Сьмерць Эрню ад сардэчнага прыступу ў 90-м, калі вызваліліся краіны Цэнтральнай Эўропы, цяпер здаецца таямнічай і, мабыць, нараджае ня самыя добрыя прадчуваньні ў сэрцах тых дзясяткаў эрню, у тым ліку і нашых, якія й дасёньня занятыя плённай працай, ня думаюць пра сэкунды звысока... Як кажуць цягаў воўк, пацягнуць і ваўка.

Тут узгадваюцца ня столькі скандалы з Алексы, кіраўнікамі нарвэскіх сацыял-дэмакратаў, Юркансам, колькі шчодрыя перадвыбарчыя кампаніі некаторых нашых «беспартыйных дзеячоў». Шкада іх, бо яны абралі сабе шлях, зь якога ўжо цяжка збочыць

Андрэй Рудкоўскі

ІРА вяртаецца

Працяг са старонк 1

Аднак, ня гледзячы на сваю нешматлікасьць, ІРА асьцярожна станіцца да пэрспэктывы інтэграцыі ў дзяржаўныя інстытуты, і аддае перавагу ўсемагчымым палітычным авантурам. Адна фракцыя яе сяброў супрацоўнічае з камуністамі і стварае дабраахвотную інтэрбрыгаду ў Гішпанію. На іншым баку фронту ў гішпанскім канфлікце, на баку Франка, змагаецца «Ірляндзкі легіён». Гэты атрад сфармаваны пры Ірляндзкай прафашыстоўскай групоўцы «Нацыянальная Гвардыя», што таксама ўключае шмат былых сяброў ІРА. Урэшце, пасьлядоўна змагаючыся з экстрэмізмам, Дэ Валера абвясьціў ІРА па-за законам. Гэта адбылося ў ліпені 1936 г. Але міпра ІРА аказаўся мацнейшым за ўрадавыя вэрдыкты. Арганізацыя сышла ў падпольле.

У канцы 30-х гадоў фракцыя М.Расэла спрабуе адрадзіць ІРА ў якасьці асноўнай антыангельскай сілы ў ірляндзкім грамадзтве. Ён прапануе новую тэрарыстычную вайну супраць Англіі. Літаральна перад 2-й сусьветнай вайной ІРА праводзіць у ангельскіх гарадах 6 бомбавых атак, якія мелі вялікі рэзананс. М.Расэл спрабуе ўсталяваць кантакты зь нямецкімі фашыстамі, але супрацоўніцтва было нетрывалым: нямецкая субмарына, на якой знаходзіўся лідар ІРА, натыкнулася на ангельскую міну. Немцы, зацікаўленыя ў новых саюзьніках, самі сталі шукаць кантакты з ІРА. Аднак нямецкі рэзыдэнт, закінуты самалётам у Ірляндыю з мэтай каардынацыі мерапрыемстваў ІРА і абвэра быў хутка арыштаваны.

Да слова, афіцыйны Дублін сам час ад часу выкарыстоўваў пранямецкія дэмаршы. Так, напрыклад, былі прыведзеныя ў стан баявой гатоўнасьці войскі на англа-ірляндзкай мяжы, а ў траўні 1945 г. Дэ Валера выразіў паслу Нямеччыны шкадаваньне ў сувязі са сьмерцю Гітлера.

Аднак вернемся да ІРА. Пасьля абвяшчэньня незалежнасьці Ірляндыі ў 1947 г. арганізацыя паглкам пераключаецца на праблему Ольстэра. У 1956-62 г. у памежнай Паўночнаірляндзкай зоне ІРА праводзіць больш за 500 апэрацыяў і 18 забойстваў, якія мелі мэтай падняць каталікоў Ольстэра на барацьбу. Але масавы рух у падтрымку сэпарацыі Ольстэра справакаваць не ўдалося і ІРА спыніла ўзброеныя дзеяньні.

Час ІРА прыйдзе пазьней. А пакуль у асяродку каталікоў Паўночнай Ірляндыі папулярныя мадэлі супраціву ў выглядзе масавых грамадзянскіх рухаў накшталт тых, што практыкуе антываенны ці мурынскі рух у ЗША.

Паўночная Ірляндыя, безумоўна, зьяўлялася самай недэмакратычнай і неправавой часткай Злучанага Каралеўства і перадумовы руху такога кшталту тут былі. Каталіцкая Ірляндзкая праблема была адной з самых вострых. Справа ішла пра нацыянальную другаснасьць ірляндзкай мовы і культуры, сацыяльнае нераўнапраўе і г.д. Так, напрыклад, у Лёндандэры, дзе дзьве трэці жыхароў былі каталікамі, пратэстанцкая супольнасьць дэлегавала ў органы самакіраваньня 12 чалавек, тады як каталікі толькі 8.

24 жніўня 1968 г. адбыўся першы марш у абарону грамадзянскіх правоў, арганізаваны Паўночна Ірляндзкай Асацыяцыяй Грамадзянскіх Правоў (NICRA). Наступную дэманстрацыю, якая адбылася 5 кастрычніка ў Дэры, атакавала паліцыя. У адказ каталікі мабілізавалі 15.000 чалавек і правялі новы марш. Паліцыя была бясьсільнай.

У той жа час пачынаюцца маніфэстацыі пратэстантаў, што арганізуюцца пры падтрымцы дзяржаўных структураў.

12 жніўня 1969 г. марш пратэстантаў праз Дэры справакаваў сутычкі з каталікамі. Падчас канфрантацыі паліцыя сьвядома заняла бок юніяністаў (прыхільнікаў уніі з Англіяй). Напружаньне, што стварылася ў Бэлфасьце, прымусіла Лёндан увесьці ў рэгіён войскі. Між тым, у ноч на 14 жніўня экстрэмісцкія пратэстанцкія арганізацыі ізноў атакавалі каталіцкія кварталы. Вынікам пагрому было 5 чалавек забітых і некалькі разбураных дамоў. Ірляндзкае насельніцтва пачало стыхійна ўзбройвацца і ствараць атрады самаабароны, кіраўнічыя пазыцыі ў якіх занялі актывісты ІРА.

У самой ІРА ў гэты час ішло сутыкненьне дзьвюх фракцыяў, што прывяло ў пачатку 1969 г. да расколу арганізацыі. Марксісцкае крыло, т.зв. ІРА (афіцыйная), аддавала перавагу сацыяльна-палітычнай барацьбе. З другога боку, ІРА (часовая), ці «provisorians», зрабіла стаўку на ўзброеныя мэтады супраціву.

Пачатку тэрарыстычных акцыяў ІРА папярэднічалі буйныя рэпрэсіўныя мерапрыемствы Лёндана, як, напрыклад, масавыя аблавы, праведзеныя ангельцамі ў Заходнім Бэлфасьце на пачатку 1970 г., у выніку чаго былі забітыя 4 ірляндцы і параненыя сотні людзей.

31 жніўня 1971 г. правізіяністы забілі ў Бэлфасьце першага брытанскага вайскоўца. Гэта быў адказ на загад ураду торы інтэрнаваць 342 каталікі. Гэтая апэрацыя Лёндана адкрыла новую старонку ўзаемнага гвалту. Да канца 1971 г. у выніку вулічных сутыкненьняў загінула 139 чалавек. Сем месяцаў пазьней, у суботу 30 студзеня вайскоўцы адкрылі агонь па каталіцкай дэманстрацыі ў Дэры, 14 грамадзянаў было забіта. Гэты дзень, які ўвайшоў у гісторыю як «крывавая нядзеля», стаў днём адліку новай гісторыі ІРА, бо цяпер амаль усё малалое пакаленьне паўночных ірляндцаў жадала зьвязаць свой лёс з антыбрытанскім супрацівам.

Рух ІРА не ўяўляе сабой паўстанцкага руху ў ягоным клясычным сэнсе. Гэта хутчэй тэрарыстычныя дзеяньні ізаляваных груп у вялікім мэгаполісе. Такія акцыі ажыцьцяўляюцца на фоне дэманстрацыяў, сутычак... Вялікую ролю грае ўсеагульная падтрымка, якая аказваецца ІРА з боку каталіцкай царквы і мясцовага насельніцтва. Апроч таго, існуюць замежныя ірляндзкія цэнтры, што выконваюць функцыі зьнешняга прадстаўніцтва. Найперш гэта Паўночна-Ірляндзкі Камітэт Дапамогі (NIAC), заснаваны ў 1970 г. у ЗША вэтэранамі ІРА. Гэтая арганізацыя аб'ядноўвае каля 20.000 чалавек, якія займаюцца пастаўкай для ІРА зброі і грошай. Паводле паддікаў ангельскіх спэцслужбаў, NIAC пераправіў у Паўночную Ірляндыю каля 12.000 адзінак зброі і даў для патрэбаў ІРА 10 млн. даляраў.

На працягу сваёй гісторыі ІРА некалькі разоў мяняла свае стратэгічныя ўстаноўкі. Першапачаткова рэспубліканцы вызнавалі тактыку «Jit for Jat» (як гукнецца, так і адклікнецца), якая была своеасаблівай рэакцыяй на правакацыі ультраправых пратэстанцкіх груповак UDA і UVF. Апошнія ставілі сваёй мэтай тэрарызаваць каталікоў шляхам выбухаў у грамадзкіх месцах і г.д. Алказ ІРА быў ідэнтычным. Гэта прывяло да таго, што ў 1972 г. былі забітыя 486 чалавек, зь іх 322 простых грамадзяніна. Самая маштабная акцыя такога кшталту была праведзеная ІРА ў Бірмінгеме, дзе з-за выбуху загінуў 21 чалавек.

Да 1975 г. тактыка ІРА, накіраваная на масавы нематываваны тэрор, зайшла ў тупік. Насельніцтва Паўночнай Ірляндыі, ня лічачыся з канфэсійнымі і рэлігійнымі адрозьненьнямі, сумесна выступіла супраць тэрору. Забойства на пачатку 76-га трох дзяцей падчас інцыдэнту ў Бэлфасьце выклікала масавыя ўсеагульныя страйкі і вялікія дэманстрацыі пратэсту.

У гэтым жа годзе да ўлады ў ІРА прыйшлі Г.Адамс і МакГуйнэс, якія прапанавалі новую стратэгію. Стаўка рабілася на вымотваньне ворага. Колькасьць забойстваў супраць цывільнага насельніцтва пайшла ўніз. Галоўнымі мішэнямі атак ІРА сталі цяпер асобы, якія былі выразьнікамі ангельскага імпэрыялізму.

Так, напрыклад, у ліпені 1976 г. быў забіты пасол Злучанага Каралеўства ў Ірляндыі Е.Біге. У жніўні 1979 г. – кузэн каралевы Элізабэты. У 1983 г. быў падарваны гатэль, дзе жылі дэлегаты зьезду кансэрватыўнай партыі.

Асобна неабходна спыніцца на кампаніі ІРА ў падтрымку палітвязьняў. У кастрычніку 1980 г. сем каталікоў-вязьняў адмовіліся прымаць ежу. Іх патрабаваньні тычыліся пераважна палітычных правоў. У прыватнасьці, яны патрабавалі асаблівага статусу. Галадоўка скончылася частковымі саступкамі з боку ўраду Тэчар. У красавіку 1981 г. пачалася галадоўка афіцэра ІРА Р.Сандса і ягонай групы. Іхняя мужнасьць натхніла ірляндзкі рух ва ўсім сьвеце на шырокую кампанію салідарнасьці з Н-блёкам (месца зьняволеньня Р.Сандса). На выбарах у Ірляндыі 2 вязьні з ІРА былі абраныя дэпутатамі.

Наступным тактычным прыёмам ІРА зьявілася дзейнасьць сейнайга палітычнага крыла Шын Фэйн. Пасьля герачнай галадоўкі ў Н-блёку папулярнасьць ІРА пайшла ўгару, і ў 1983 г. Шын Фэйн атрымаў на выбарах паводле сьпісаў каля 14%, а лідар шынфэйністаў Г.Адамс стаў дэпутатам. Безумоўна, росту прыязнасьці да ІРА садзейнічала палітычная фізіяномія пратэстанцкіх узброеных арганізацыяў (якія ў сярэдзіне 80-х аказаліся ўцягнутымі ў дачыненьні з нэфцьшыстамі і гандаль зброяй).

Дарэчы, у 1986 г. ірляндцы прынялі ад М.Кадафі 240 тон боеприпасаў і выбуховых рэчываў. Сэнс гэтага падарунку тлумачыцца проста: лідар лібійскай рэвалюцыі такім своеасаблівым чынам адпомсьціў Англіі, якая дазволіла ЗША выкарыстоўваць свае базы падчас налётаў на Лібію. Апроч таго, ІРА ўвесь час супрацоўнічала зь левымі экстрэмістамі, напрыклад з Фронтам Нацыянальнага Вызваленьня Ірляндыі -- арганізацыяй мааісцкага кшталту. Але ІРА і Шын Фэйн не дапусьцілі самамаргіналізацыі і заўсёды былі гатовымі на палітычны дыялёг зь Лёнданам.

Першыя такія перамовы адбыліся яшчэ ў 1973 г. Нарэшце, з 1988 г. пачалася новая сэрыя кансультацыяў паміж Лёнданам, Дублінам і ІРА. У сьнежні 1993 г. яна скончылася падпісаньнем сумеснай дэклярацыі. У аснове дэклярацыі была думка, што лёс Паўночнай Ірляндыі павінен вырашацца самім народам Паўночнай Ірляндыі, насуперак старым нацыянальным дактрынам Ірляндыі і Англіі.

Нягледзячы на тое, што дэклярацыю падпісалі прадстаўнікі ірляндзкага і ангельскага ўрадаў, негалосная прысутнасьць ІРА была відавочнай. Ратыфікацыя дамовы фактычна азначала выхад ІРА з падпольля. Хутка была надрукаваная адпаведная заява ІРА пра спыненьне з 31 жніўня 1994 г. вайсковых дзеяньняў супраць Англіі. Для ІРА гэта азначала перамогу. Ангельскі ўрад яўна расьпісаўся ў тым, што за 25 гадоў ня здолеў зламіць волю ірляндцаў. 2 пакаленьні ірляндзкай моладзі шляхам рашучага супраціву дамагліся спыненьня вайсковай прысутнасьці ангельцаў у Ольстэры, якую іхныя бацькі трывалі на працягу трох стагодзьдзяў.

Апошнія падзеі -- канфэсійныя сутычкі летам 1996 г. і кастрычніцкія выбухі ІРА -- пацьвердзілі рашучасьць рэспубліканцаў давесьці справу незалежнасьці да канца.

Ігар Уткін

З газэт

Беларусы інвэстуюць у Польшчу

Немцы, якія прыяжджаюць на аўто, купляюць у Польшчы цыгарэты і паліва, а расейцы і ўкраінцы вывозяць рыбу і садавіну. Славакі, чэхі і літоўцы трацяцца галоўным чынам на адзеньне.

«Ну і што з таго?» – спытае чытач. А тое, што за першыя паўгады 1996 г. чужаземцы патрацілі ў Польшчы 5 млрд. 227,8 млн. злотых (1 USD = 2,5 злотых), або на адну трэць больш, чым за той самы пэрыяд летась. Пра гэта ў мінулы панядзелак паведаміла Gazeta Wyborcza. Узрост чужаземскіх выдаткаў тычыўся аднолькава і харчовых закупаў, і закупаў іншых тавараў, і аплаты побыту ў Польшчы. Гэта значыць, што госьці краіны інвэстуюць свае грошы у польскую эканоміку, пазбаўляючы інвэстыцыяў на тую ж суму сваю родную краіну. Грошы, патрачаныя хоць бы нават на праезд у мэтро або на бутэльку піва, застаюцца ў Польшчы.

Значную долю ў разьвіцьцё заходняга суседа ўносяць і беларусы. Удзельная вага гасьцей зь Беларусі ў структуры выдаткаў, якія робяць чужаземцы ў Польшчы, складае 14,5%. Паводле гэтага паказчыка Беларусь займае другое (!) месца, саступаючы толькі Нямеччыне (56,5%). Сьледам за Беларусяй ідуць Украіна (14,4), Чэхія (9,2), Славакія (2,3), Літва (1,6) і Расея (1,5).

II K

№ 31/96
4 10 лістапада

ШТОТЫДНЕВЫ ІНФАРМАЦЫЙНЫ ДАДАТАК ДА ГАЗЭТЫ НАША НІВА

Новае слова на рынку беларускае прэсы – што тыдзень 8 палосаў патрэбнае інфармацыі

Інфарматар
НАША НІВА

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЕ
BELARUSIAN PUBLIC RELATIONS ASSOCIATION

САЛЁН ЦЫРУЛЬНЯ
АЛЕКСАНДРЫНА
вул. Сурганава, 8
Лідар на рынку цырульных паслугаў горада Менску
Мужчыны! Для Вас пасьля рамонту адчыненая новая заля!
Працуюць майстры толькі вышэйшай клясы
Запрашаем ВАС наведаць салён "Александрына"
Т. 231 60 48

Багарская этыкетка на малдаўскім віне

Спажь вецкі тэст пра нату ральныя віны

Стар. 10

Бясплатныя прыватныя абвесткі

Куплю вялікі польска-расейскі слоўнік (57 тысячаў словаў). Тэлефон: 266-73-72. Тацяна.

Алесь Бынькоў зь Віцебску! У Вас шчырае сэрца і вялікая душа!
Міхась Маліноўскі.

Бугальтар з досьведам працы і веданьнем кампутара прапануе свае паслугі. Тэлефон: 2 264-263

НАДРУКУЕМ, ПАМНОЖЫМ
Хутка – 1.000 асобнікаў за 10 хвілінаў
БЛЯНКІ, ВІЗЫТОЎКІ, РЭКЛЯМОВЫЯ ДЫ ІНФАРМАЦЫЙНЫЯ ЎЛЁТКІ.
Танна – ад 108 рублёў за копію
На паперы якое заўгодна шчыльнасьці і на картоне.
Тэл. **39-78-49**

Беларускі Нобясьпека звс ...а над нашай Бацькаўшчынай. Трэба бараніць не Яднайцеся у дружыны Нацыянальнай Самаабароны
Тэлефон: 261-38-37

Браніслава Лянкоўская з роду Алеся Гарун! З Днём Анёла Вас!
Міхась Маліноўскі

Дзякуем "Камэлоту" за музыку да спэктаклю "Заложніца каханьня". Гэта крута! Вітаўт і кампанія

Запрашаем у беларускамоўнае асяродзьдзе для зьняцьця нерашучасьці ва ўжываньні роднай мовы. Даведкі штосерады з 18.00 да 20.00. Тэлефон: 265-74 12.

Хлопцам (18–25 гадоў) дапамагу зьехаць у Эўропу. Мне 59 год. Tel/Fax (0) 621689825 лягро. (Ангельская, нямецкая мовы). Я буйны бізнэсмэн.
Генрых Шуберг

Праца на хаце 5$ на дзень, апрацоўка цыркуляраў, капэрта з адваротнай адрэсай + купон б/о. 220073 Менск а/с 26 РНД"

У адпаведнасьці з рашэньнем Савета ад 18.10.96 г.
Гаспадарчая асацыяцыя "Банкаўскі Саюз" ліквідуецца. Прэтэнзіі крэдытораў прымаюцца напрацягу двух месяцаў з моманту публікацыі.
Заявы пра прэтэнзіі прымаюцца ў пісьмовым выглядзе з дадаткам дакумэнтаў, якія пацьвярджаюць права патрабаваньня.
Зьвяртацца на адрэсу 220002, г. Менск, вул. В. Харужай 31А. Тэл. **228-60-25**
Факс **228-60-31**

Мне 55 год, мільянэр (2 фірмы). Пакіну ўсё хлопцу-беларусу (ад 18 да 25 гадоў). Тэл/факс (0)6216898256 (ням. анг). Сп. Сяргей Бурагін

СП "Арбор Паліграфічныя паслугі ад блянкаў да кніг. Кошты памяркоўныя. Тэлефануйце: 262-49-04

Сельскагаспадарчыя працы ў Эўропе, сакавік-лістапад 1997 год. 30$ на дзень. Капэрта з адваротнай адрэсай і купон з б/о. 220073 Менск, а/с 26 "3"

Набуду упаковачныя пакеты-майкі. Тэлефон 253-92-26

Прадам арэлі пакаевыя амэрыканскія для дзіцяці да 10 кг.
Тэлефон: 4 49 26

Папрацую на дабрабыт вашай арганізацыі. Інжынэр (ПЭВМ) + 2 гады бугальтэрыя. Ёсьць арганізацыйныя здольнасьці. Тэлефон: 270 08-71. Ганна. Пасьля 19.00

Ксэракопія, выгадна хутка. Тэлефон: 253-92-26

Сяргей Бурагін, бізнэсмэн зь Нямеччыны шукае сяброў (18 25 гадоў) Менск-50 а/с 250

Малады абаяльны лідар патрыёт шукае прывабную дзяўчыну-беларусачку, аднадумку і магчыма спадарожніцу жыцьця. 222310 г. Маладэчна, вул. Палявая 39
Сяргей Юркевіч.

Сярэдняй школе N191 Уручча-4) патрабуецца выкладчык ангельскай мовы.
Тэл. 65 91 75, 60-67-94

КУПОН
Бясплатнай прыватнай абвесткі

Імя і прозьвішча ____________________

Адрэса, тэлефон ____________________

Тэкст
____
____
____
____

Запоўніце гэты купон і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна.
220123, Менск, а/с. 71 НАША НІВА

The Publishers Weekly Bestsellers
Сьпіс бэстсэлераў на 28.10.96

На гэтым тыдні	На мінулым тыдні	Назва кнігі. Аўтар	Выдавецтва	Колькасьць Тыдняў у сьпісе
1	1	The Deep End of the Ocean Жаклін Мітчард	Viking	7
2	2	Desperation Стывэн Кінг	Viking	4
3		The Laws og Our Fathers Скот Тарау	Farrar, Strauss & Giroux	1
4	3	Executive Orders Том Клэнсі	Putnam	10
5		My Gal Sunday Мэры Хігінс Клярк	Simon & Schuster	1
6	6	To the Hit Дзік Фрэнсіс	Putnam	4
7	4	The Regulators Рычард Бахман	Dutton	4
8	5	Ja ck and Jill Джэймс Патэрсан	Knopf	7
9	8	The Notebook Ніколас Спаркс	Warner	2
10		The Tailor of Panama Джон ле Карэ	Knopf	1
11	7	A Secret Affair Барбара Тэйлар Брэдфард	Harper Collins	2
12	9	The Celestine Prophecy Джэймс Рэздфілд	Warner	13
13	10	The Law of Love Лёра Эсківэл	Crown	5
14	11	Icon Фрэдэрык Фарсайт	Bantam	3
15	12	The Runway Jury Джон Грышэм	Doubleday	23

@1995 Cahners Publ shing Company

20 самых папулярных альбомаў у ЗША на 1.11.1996

На этым тыдні	На мінулым тыдні	Назва кружэлкі Выканаўца. (Фірма гуказапісу)	Колькасьць тыдняў у сьпісе
1		Recovering the Satellites Counting Crows (Geffen/dgg)	1
2		Falling into You Celine Dion (Epic)	32
3		Life is Peachy Korn (Epic)	1
4	2	Moment Kenny G (Arista)	3
5	6	Jagged Little Pill Alanis Morisette (Warnar)	71
6	7	Tragic Kingdom No Doubt 9Interscope)	42
7		Billy Bteathes Phish (Elektra)	1
8	5	Blue Leann Rimes (Curb)	15
9	9	Keith Sweat Keith Sweat (Elektra)	17
10	4	From the Muddy Banks of the Wishkan Nirvana (Geffen/DDG)	3
11	3	Antichrist Superstar Marilyn Manson (Interscope)	2
12	12	Secrets Toni Braxton (Laface)	18
13	10	Soundtrack Set it off (Elektra)	4
14	11	Another Level Blackstreet (Interscope)	6
15	8	Home Again New Edition (MCA)	6
16	13	Sheryl Crow Sheryl Crow (A&M)	4
17	15	Greatest H ts Clint Black (RCA)	4
18	14	Your Secret Love Luther Vandross (Ep c)	3
19	16	Aenima Tool (Zoo)	3
20	17	All Eyez on me 2 Pac (Death Row)	36

Міністэрства сувязі і інфарматыкі Рэспублікі Беларусі
АБАНЭМЭНТ на газэту **63125**
НАША НІВА
Колькасьць камплектаў

На 1996 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды ____________________
(паштовы індэкс) (адрэса)

Каму ____________________
(прозьвішча, ініцыялы)

ДАСТАЎНАЯ КАРТКА
на газэту **63125**
ПВ | месца | Літар
НАША НІВА

Кошт	падпіскі	руб	Колькасьць камплектаў
	пераадрас.	руб	

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды ____________________
(паштовы індэкс) (адрэса)

Каму ____________________
(прозьвішча, ініцыялы)

СЬВЕТ ЗА ТЫДЗЕНЬ

НЯДЗЕЛЯ, 27 КАСТРЫЧНІКА

СВАБОДА. Вяшчаньне Беларускай рэдакцыі радыестанцыі "Свабода" з 27 кастрычніка павялічыла я з 1 гадзіны да 1,5. Значна павялічаны бюджэт Беларускай рэдакцыі, што адбываецца на фоне ўсеагульнага скарачэньня фінансаваньня радыестанцыі "Свабода" з боку Кангрэсу ЗША.

БАЎГАРЫЯ. На прэзыдэнцкіх выбарах у першым

туры перамог лідар дэмакратычнай апазыцыі Пэтар Стаянаў, які набраў каля 43 працэнтаў галасоў. Камуністычны кандыдат Іван Маразаў атрымаў толькі 27 працэнтаў.

ЗАІР. Каля 500 тысячаў уцекачоў народнасьці хуту вынік баёў паміж войскамі Руанды (якія складаюцца з народнасьці тутсі) і войскамі Заіра на тэрыторыі якога з 1994 году знаходзіцца больш за 1 мільён зьбеглых з Руанды хуту. Войскі тутсі перайшлі мяжу Заіру і падыйшлі да сталіцы ўсходняй правінцыі Букаву.

ВУГОРШЧЫНА. Дэманстрацыя скрайне правай апазыцыі сабрала каля парляманту ў Будапэшце некалькі тысячаў чалавек. Маніфэстанты патрабавалі здраўкі сацыялістычнага ўраду краіны.

ПАКІСТАН. Шматтысячная маніфэстацыя ісламістаў, якія патрабавалі сьмерці Бэназыр Бхуты была сустрэтая на падыходзе да Ісламабаду ўзброенай паліцыяй. Дэманстрацыя была разагнаная, у выніку параненыя ня менш як 30 асоб.

ЗША. Дакладна 288 501 даляр каштавала амэрыканцам гісторыя расейскай

ядзернай праграмы. Сам расейскія навукоўцы пад кіраўніцтвам фізыка Аляксандра Чарнышова выклалі ўсе этапы ядзерных выпрабаваньняў (715 ядзерных выбухаў на працягу 4 году) у СССР і РФ.

РАСЕЯ. Пры пажары на новым расейскім атамным крэйсэры "Пётар Вялікі" загінуў адзін марак і некалькі было паранена.

ВЯЛІКАБРЫТАНІЯ. Вайсковая база ВПС Лейкнгіт у графстве Сафокал, на тэрыторыі якой месьціцца амэрыканская ядзерная зброя, спыніла сваё існаваньне.

ПАНЯДЗЕЛАК, 28 КАСТРЫЧНІКА

ПАКІСТАН. Лідар ісламскай партыі Джамаат-і-Ісламі Хусэйн Ахмэд арыштаваны і у Ісламабадзе. Улады краіны правадзяць арышты сярод лідараў і удзельнікаў дэманстрацыі 27 кастрычніка.

ІНДЫЯ. Ісламскія сепаратысты забілі 11 чалавек штаце Кашмір. Сярод ахвяраў кіраўнік індыйскай службы бясьпекі ў штаце, некалькі афіцэраў і вайсковых мінакоў.

БІРМА. Улады Бірмы вызвалілі Чжы Мунга — бліжэйшага паплечніка лідара апазыцыйнай Народнай Дэмакратычнай Лігі, лаўрэаткі Нобэлеўскай прэміі міру Аун Сан Су Чжы.

ЛЮКСЭМБУРГ. Эўрапейскі Саюз прызначыў свайго прадстаўніка на Блізкім Усходзе. Ім стаў 45-гі гадовы пасол Гішпаніі ў Ізраілі Мігель Анхель Маратінос. Гэта яшчэ адна спроба Эўрапейскага Саюзу пашырыць свой уплыў у рэгіёне, дзе пануюць ЗША.

КІТАЙ. Пэкін назваў "актам умяшаньня ва ўнутраныя справы краіны" прысуджэньне Эўрапарлямэнтам прэміі Андрэя Сахарава за заслугі у вольнамысьлені кітайскаму палітвязьню Вэй Цзіньшэну. Кітайскі праваабаронца адбывае ўжо другі 14-гадовы тэрмін зьняволеньня.

ЛЮКСЭМБУРГ. Эўрапейскі Саюз увёў супраць Бірмы эканамічныя санкцыі услед за ЗША. Санкцыі ўведзены з-за нежаданьня вайсковага рэжыму пайсьці на зьмягчэньне свайго кіраваньня.

АЎТОРАК, 29 КАСТРЫЧНІКА

БРУНЭЙ. Самы багаты чалавек на плянэце султан Брунэю хоча набыць сабе некалькі соцень гектараў зямлі на італьянскай высьпе Сардзінія. Яго прывабліваe экалягічная чысьціня гэтай тэрыторыі.

ІРАН. Лідар узброенай таджыцкай апазыцыі Саід Абдуло Нуры заявіў у Тэгеране, што у саюз зь імі увайшлі лідары унутранай таджыцкай апазыцыі — былыя прэм'ер міністры краіны Абдумалік Абдуладжанаў, Джамшэд Карымаў, Абдуладжыл Самадау.

NATO. Генэральны сакратар NATO Хаўер Салана, які прыбыў зь візытам у Швэцыю, сказаў, што у наступным годзе будзе падпісанае пагадненьне паміж NATO і Расеяй прынятае рашэньне аб прыеме новых сяброў і пашырыцца супрацоўніцтва з нэўтральнымі краінамі Эўропы (Швайцар, Фінляндыя, Швэцыя).

ЗША. Самы багаты чалавек Амэрыкі Біл Гэйтс перадаў сваёй альма матэр Гарвардзкаму ўнівэрсытэту 20 мільёнаў даляраў.

БЕЛАРУСЬ. Аляксандар Лукашэнка заявіў, што распусьціць парлямэнт калі Канстытуцыйны Суд прызнае незаконным рэфэрэндум 24 лістапада.

МАЛЬТА. Мальта выходзіць з праграмы NATO "Партнэрства дзеля міру" сьцьвярджаючы, што праграма парушае нэўтралітэт краіны.

СЕРАДА, 30 КАСТРЫЧНІКА

КІТАЙ. Студэнцкі лідар Ван Дань засуджаны на 11 год зьняволеньня за "арганізацыю змовы з мэтаю зьвяржэньня ўраду". Адвакатам на працэсе выступала маці Ван Даня, якому споўнілася 27 год і які ўжо правёў чатыры гады ў вязьніцы пасьля падаўленьня студэнцкага паўстаньня на плошчы Цянь аньмэнь у 1989 годзе.

РАСЕЯ. Скончыў жыцьцё самагубствам кіраўнік расейскага ядзернага цэнтру у горадзе Сьнежынску Уладзімір Нячай. На прадпрыемстве не выплочвалі заробкі зь ліпеня.

РАСЕЯ. Акцыі пратэсту праходзяць на ваенных прадпрыемствах і ў вайсковых частках Ціхаакіянскага флёту Расеі, дзе заробкі не выплочваліся ўжо некалькі месяцаў. Аналягічныя акцыі праходзяць на Паўночным флёце.

ФРАНЦЫЯ. Сусьветна вядомы тэрарыст Карлас, чыё сапраўднае імя Ільіч Рамірэс Санчэс, выступіў супраць кнігі Бэрнарда Віёлета "Карлас. Тайная сетка міжнароднага тэрарызму", заявіўшы, што яна парушае яго права на прэзумпцыю невінаватасьці і павінна быць забароненай.

ШВАЙЦАРЫЯ. Швайцары далучыліся да праграмы NATO "Партнэрства дзеля міру". Разам з тым размова ня йдзе пра уваход краіны ў альянс.

ФРАНЦЫЯ. Міністар абароны Францыі часоў Франсуа Мітэрана Шарль Арню быў агентам савецкай, баўгарскай і румынскай разьведак. З такім сэнсацыйным паведамленьнем выйшла газэта "Экспрэс".

ПАЎДНЁВАЯ АФРЫКА. Парлямэнт паўднёваафрыканскай рэспублікі дазволіў правядзеньне забароненых з часоў апартэіду абортаў на жаданьне жанчыны.

САМАЛІ. Каля 26 чалавек загінула і 48 паранена ў выніку баёў паміж самалійскімі кланамі Алі Хасана Асмана Ато і Хусэйна Айдыда.

ЧАЦЬВЕР, 31 КАСТРЫЧНІКА

НЯМЕЧЧЫНА. Канцлер Нямеччыны Гельмут Коль пабіў рэкорд легендарнага Конрада Адэнаўэра на знаходжаньне на гэтай пасадзе. Ён кіруе краінай ужо 14 год і гатовы падняць рэкордную планку яшчэ вышэй.



АЎГАНІСТАН. Войск Ахмад Шах Масуда і генэрала Дустума працягваюць наступ на Кабул.

ІЗРАІЛЬ. Міністар замежных справаў Расеі Яўген Прымакоў сустрэўся з былым савецкім дысыдэнтам а цяпер міністрам працы Ізраіля Натанам Шчаранскім.

ФІНЛЯНДЫЯ. Міністар замежных справаў Халанэн пасьля сустрэчы з генэральным сакратаром NATO Хаўерам Саланам заявіў, што яе краіна зацікаўленая у пашырэньні сваёй ролі ў міратворчых апэрацыях альянса ў Босьніі.

НЯМЕЧЧЫНА. Каля 5 тысячаў кніг, вывезеных савецкімі войскамі зь Нямеччыны пасьля другой сусьветнай вайны, вярнула Грузія. Міністар замежных справаў Нямеччыны Клаус Кінкель назваў гэтае рашэньне Грузіі ўзорным і выказаў спадзяваньне, што гэтаму прыкладу пасьлеўюць і іншыя краіны.

ВЯЛІКАБРЫТАНІЯ. Жыцьцё на Марсе ў нейкай форме йснавала. Новае пацьверджаньне гэтаму факту знайшлі брытанскія навукоўцы пасьля аналізу марсыянскага мэтэарыту які сфармаваўся меней за мільён год таму.

ПЯТНІЦА, 1 ЛІСТАПАДА

ЗАІР. Працягваюцца баі каля заірскага гораду Гома, дзе знаходзіцца каля мільёну ўцекачоў народнасьці хуту з суседніх краінаў Руанды і Бурундзі. Паўстанцы з народнасьці тутсі па папярэднім цесьняць заірскія войскі, ведучы баі за аэрапорт Гомы.

БРАЗЫЛІЯ. У горадзе Сан Паўла разьбіўся самалёт, які йшоў рэйсам з Рыо дэ Жанэйра. Усе 95 чалавек, якія знаходзіліся на борту самалета загінулі. Гэта ўжо чацьвертая катастрофа за апошні месяц.

ФРАНЦЫЯ. Памер знакаміты рэжысэр Марсэль Карнэ, які быў лідарам францускага кіно некалькі дзесяцігодзьдзяў. Сярод яго ных твораў знакаміты фільм "Начныя госьці" зьняты сумесна з Жакам Прэвэрам.

ВЯЛІКАБРЫТАНІЯ. Англійскі пісьменьнік Салман Рушдзі абвінавачвае ўрад Даніі ў маладушнасьці пасьля таго, як яму было адмоўлена ва уезнай візе ў гэтую краіну.

АЎГАНІСТАН. Жорсткія баі між войскамі талібаў і генэралам Дустумам ідуць на поўначы краіны. Дустум спрабуе заняць стратэгічна важны горад Герат, які знаходзіцца на мяжы з Іранам.

NATO. Гельмут Коль заявіў, што ніводная краіна ня мае права вэта на пашырэньне NATO на усход. Паводле яго ных словаў, пашырэньне альянсу не пагражае бясьпецы Расеі.

ІЗРАІЛЬ. Прайшло пахаваньне дзесяцігадовага



палестынскага хлопчыка, які быў забіты ізраільскім паліцэйскім два дні таму.

БЕЛАРУСЬ. Прэзыдэнт Аляксандар Лукашэнка звольніў з пасады міністра абароны Леаніда Мальцава, які ў нецьвярозым стане выступаў перад студэнтамі Мінскага інстытуту.

ГІШПАНІЯ. У выніку тэрарыстычнага акту ў горадзе Бунькэль (правінцыя Наварра) загінулі чатыры чалавекі. Адказнасьць узяла на сябе арганізацыя баскаў сэпаратыстаў "ЭТА".

ІНГУШЭЦІЯ. Першы з часоў вайны пасажырскі цягнік накіраваўся з Грознага ў Маскву.

БІРМА. Улады Бірмы заявілі, што таксама ўвядуць супраць Эўрапейскага Саюзу эканамічныя санкцыі.

СУБОТА, 2 ЛІСТАПАДА

БЕЛАРУСЬ. Міністрам абароны замест Леаніда Мальцава прызначаны Аляксандар Чумакоў.

ІРАК. Рада Бясьпекі ААН пастанавіла захаваць эканамічныя санкцыі супраць Іраку. Зробленае гэта з-за таго, што Ірак не выконвае рэзалюцыі ААН і не дапускае інспэктараў на свае вайсковыя аб'екты.

ЛАТВІЯ. Няўдачай завершыўся чарговы раўнд расейска-латыскіх перамоваў. Латыскі бок патрабуе кампенсацыі тым грамадзянам Латвіі, якія згубілі маёмасьць у выніку перадачы часткі тэрыторыі Латвіі Пскоўскай вобласьці Расейскай Фэдэрацыі ў 1940 годзе.

ЖЭНЭВА. Дэлегацыі Расеі і ЗША прыпынілі перамовы па пытаньні выпрабаваньня сыстэмаў супрацьпаветранай абароны.

БОСЬНІЯ. Пяць расейскіх вайскоўцаў — удзельнікаў міратворчай місіі NATO у Босьніі цяжка параненыя у выніку падарваньня на супрацьтанкавай міне.

ГІШПАНІЯ. На поўначы краіны ў горадзе Гехон адбыўся тэрарыстычны акт. Бомба выбухнула каля Палацу правасудзьдзя які атрымаў моцныя пашкодж аньні.

АЎГАНІСТАН. Войскам Ахмад Шах Масуда ўдалося наблізіцца на некалькі кілямэтраў да Кабулу. Жорсткія баі за аўганскую сталіцу працягваюцца.

КІПР. Некалькі соцень грэкаў-кіпрыётаў правялі акцыю пратэсту перад прапускным пунктам "блакітных касак" ААН, які падзяляе турэцкі поўнач і грэцкі поўдзень краіны. Мэтаю акцыі была спроба зьменшыць колькасьць турыстаў на турэцкую частку Кіпру.

ДУХ ФРАНЦУСКАГА ПРАВАСУДЗЬДЗЯ

"Усе б рухнула, калі б адзін і той жа чалавек ці адзін і той жа ж корпус прынцыпіялаў, ці дваранаў, ці простых людзей здзейсняў бы ўсе гэтыя тры віды права: права выдаваць законы, права выконваць дзяржаўныя рашэньні і права судзіць за злачынствы і вырашаць цяжбы грамадзянаў... Свабоды няма, калі ўлада судзьдзі не аддзеленая ад ўлады заканадаўчаи ці выканаўчай...

Менавіта ў Францыі, з-пад майстарскага пяра Мантэск'е, выйшла ў XVIII стагодзьдзі тэорыя пра падзел уладаў як аснова сыстэмы, што гарантуе свабоду. Ёй было наканавана аказаць значны ўплыў на палітычную філязофію той эпохі і на заканатворцаў пэрыяду рэвалюцыі

Варта адзначыць, што пра судзьдзяў сталі казаць часьцей, чым калі б там не было раней, было гэта ў Італіі, Францыі ці Гішпаніі. А апошнім часам і ў Беларусі. Добра гэта ці кепска? Гэтае пытаньне паўстае паўсюль. Як бы там не было, у гэтым прарыве судзьдзяу на палітыка-інфармацыйную сцэну трэба бачыць прыкмету пераменаў у нашым грамадзтве і ня трэба будзе зьдзіўляцца, што з-за разгулу фінансавых махляроў і росту злачынстваў у галінах, недастаткова ахопленых нацыянальнымі заканадаўствамі, нехта з дасьведчаных людзей прадказвае судзьдзям першасную ролю ў сьвеце ў XXI стагодзьдзі

Францускі судзьдзя і эўрапейскае права

За апошнія дваццаць гадоў францускае права значна зьмянілася пад уплывам сыстэмы Эўрапейскай Супольнасьці і прававых палажэньняў, якія выцякаюць з эўрапейскай Канвэнцыі па правах Чалавека.

На аснове артыкула 55 Францускаи Канстытуцыі, які прызнае перавагу між народнага права над унутраным. францускі судзьдзя павінен кіравацца гэтым новым эўрапейскім зводам законаў

Эўрапейская Супольнасьць пабудаваная на аснове арыгінальнай юрыдычнай канструкцыі, якая прызваная забясьпечыць рэалізацыю эканамічных, палітычных і сацыяльных мэтаў, што зафіксаваныя ў Рымскай дамове 1957 года Справа ідзе пра стварэньне адзінага эўрапейскага рынка і гарманізацыі палітыкі краінаў-удзельніцаў Супольнасьці ў шматлікіх галінах (транспарт, абарона навакольнага асяродзьдзя і інш.).

Прававая сыстэма Эўрапейскай Супольнасьці разьвівалася на аснове Рымскай дамовы, а потым у меру разьвіцьця працэса інтэграцыі, на прававых нормах, што выцякаюць і вызначаныя пэўнымі палажэньнямі, дырэктывамі і рашэньнямі інстытутаў Супольнасьці. Гэтыя нормы аказваюць усё большы ўплыў на францускае права, бо яны ляжаць у аснове кожнага другога новага дакумэнта (што значыць болей за 20 тысячаў дакумэнтаў).

Эўрапейскі Суд, разьмешчаны ў Люксэмбургу, гарантуе законнасьць у Эўрапейскай Супольнасьці, забясьпечваючы выкананьне дамовы і новых актаў, што выцякаюць зь яе як у іх выкананьні, так і ў іх тлумачэньні. Гэты Суд выпрацаваў звод законаў на аснове двух прынцыпаў простае дзеяньне прававой сыстэмы Супольнасьці і ейны прыярытэт. Прынцып простага дзеяньня дазваляе кожнаму грамадзяніну перад тварам нацыянальнага судзьдзі спасылацца на большую частку эўрапейскага права. Што датычыцца прынцыпа прыярытэту, то ён пастулюе верхавенства эўрапейскага заканадаўства над нацыянальным: калі францускі судзьдзя вырашае што дадзены закон супярэчыць прававым нормам Супольнасьці, ён не павінен яго ўжываць.

Такім чынам, Касацыйны Суд з 1975 г. і Дзяржаўны Савет з 1989 г., абапіраючыся на прынцып прыярытэту, сочаць за тым, каб прынятыя законы не супярэчылі прававым нормам Супольнасьці.

Нацыянальны судзьдзя і Эўрапейскі суд супрацоўнічаюць на аснове артыкула 177 Рымскай дамовы які прадугледжвае працэдуру прэюцыдыяльнай спасылкі.

Нацыянальны судзьдзя мае магчымасьць, калі палічыць гэта магчымым, зьвяртацца ў Эўрапейскі Суд па ўсіх пытаньнях, якія тычацца выкананьня і тлумачэньня эўрапейскага права, калі ён лічыць, што адказ на гэтае пытаньне неабходны для прыняцьця рашэньня. Гэты мэханізм грае вельмі істотную ролю у гарманізацыі ўжываньня эўрапейскіх прававых нормаў усімі краінамі-удзельніцамі Супольнасьці.

НОВЫЯ ПРАВЫ ГРАМАДЗЯНАЎ

Нацыянальным судзьдзям адводзіцца вырашальная роля ў забесьпячэньні функцыянаваньня сыстэмы Эўрапейскай Супольнасьці паколькі менавіта на іх ускладаецца задача забясьпечыць выкананьне законаў Супольнасьці ў сваіх краінах. Да іх можа зьвярнуцца любая юрыдычная асоба з патрабаваньнем ажыцьцяўленьня правоў, якія ёй дае Супольнасьць (напрыклад права вольнага перасоўваньня грамадзянаў, права атрыманьня працы ў Супольнасьці і г.д.).

Ратыфікаваная Францыяй у 1974 г эўрапейская Канвэнцыя па правах Чалавека гарантуе кожнаму грамадзяніну краіны, якая зьяўляецца членам Савета Эўропы, поўную і добра прапрацаваную сыстэму правоў. Канвэнцыя, што ўжываецца судзьдзямі ў адпаведнасьці з прынцыпам прыярытэту мае нязьменны посьпех з 1981 г — даты ратыфікацыі Францыяй артыкула 25 эўрапейскай Канвэнцыі па правах Чалавека, якая дае права кожнаму грамадзяніну права асабістага звароту ў Эўрапейскі Суд пры ўмове што вычарпаныя ўсе юрыдычныя магчымасьці ў сваёй краіне Мэханізм кантролю за выкананьнем Канвэнцыі дзейнічае пасьпяхова, і ў цяперашні час сыстэма наводненая індывідуальнымі зваротамі. На цяперашні час Эўрапейскі Суд вынес 39 рашэньняў, што тычыць грамадзянаў Францыі, і канстатаваў парушэньне Канвэнцыі ў дваццацьдзьвюх справах Улічваючы рэзананс у грамадзкай думцы, выкліканы прысудамі Эўрапейскага Суда, нацыянальныя судзьдзі спрабуюць дамагчыся адпаведнасьці сваёй юрыспрудэнцыі эўрапейскаи. Гэта, тым ня менш, не зьмяншае ролі нацыянальных судзьдзяў, пашыраючы права 11 траўня 1994 г. Францыя падпісала адзінаццацаты пратакол эўрапейскай Канвэнцыі па правах Чалавека, які грунтоўна мадыфікуе гэты кантрольны мэханізм увядзеньнем адзінага і трывалага Суда

ЭЎРАПЕЙСКІ СУД

Разьмешчаны ў Люксэмбургу Суд складаецца з 13 судзьдзяў — па адным на кожную краіну-удзельніцу плюс адзін судзьдзя з кожнай вялікай краіны па чарзе. Колькасьць судзьдзяў павялічылася да 17 з уступленьнем Нарвэгіі Швэцыі Фінляндыі і Аўстрыі (1 студзеня 1995 г)

Пры Судзе таксама працуюць 6 генэральных адвакатаў (ад 8 да 9 пасьля пашырэньня). Адпаведна артыкулу 164 Рымскай дамовы, Суд кантралюе выкананьне закона пры тлумачэньні і выкананьні дамовы

Існуе некалькі відаў абскарджаньняў у Эўрапейскі Суд:

скарга на парушэньне, якая паступае ад Камісіі на краіну-удзельніцу;

скарга адной краіны-удзельніцы на другую краіну-удзельніцу пры парушэньні прынятых пастановаў;

хадайніцтва пра адмену актаў Супольнасьці, якое сфармуляванае адной краінай-удзельніцай, Саветам ці Супольнасьцю;

хадайніцтва пра адмену, якое сфармуляванае Эўрапарлямэнтам з мэтай захаваньня сваіх прэрагатываў;

хадайніцтва пра адмену, сфармуляванае фізычнай ці юрыдычнай асобай супраць рашэньня, што яе датычыцца, ці атрымальнікам якога яна зьяўляецца;

скарга на некампэтэнтнасьць супраць Эўрапарлямэнта, Савета ці Камісіі, калі яны ўхіляюцца ад вынясеньня рашэньня дамовы, сфармуляванага іншай краінай-удзельніцай ці іншым Інстытутам Супольнасьці;

скарга, сфармуляваная прыватнай асобай, у тым выпадку, калі Інстытут Супольнасьці не накіраваў ёй іншага акта, апроч паведамленьня ці ўказаньня.

З 1988 г Суд першай інстанцыі, які складаецца з 12 судзьдзяў, што засядаюць у палатах быў прымацаваны да



Эўрапейскага Суда. Сьпярша гэты суд разглядаў прынятыя рашэньні, што тычацца канкурэнцыі паміж фірмамі. Ягоная сфэра дзейнасьці пашырылася і ён стаў разглядаць у прыватнасьці, спрэчкі, што ўзьніклі паміж Супольнасьцю і ягонымі супрацоўнікамі, а таксама скаргі, што паступаюць ад прыватных асобаў.

Кампэтэнцыя Суда абмяркоўваецца пытаньнямі Супольнасьці. Ён не кампэтэнтны пры ўжываньні асульных пастановаў дамовы Эўрапейскага Саюзу а таксама для пастановаў дадзенай дамовы, што тычацца міжпарлямэнцкага супрацоўніцтва.

Францускі ўрад прадстаўлены пры Судзе Упраўай па юрыдычных справах Міністэрства Замежных Справаў Францыі.

Правасудзьдзе і прэса: вечнае супрацьстаяньне

Ці можна сьцьвярджаць, што узаемаадносіны паміж органамі правасудзьдзя і сродкамі масавай інфармацыі прынялі ў Францыі паталягічныя формы? Цалкам верагодна што галоснасьць павінна быць неад'емнай часткай праваахоўчай дзейнасьці, пачынаючы са сьледзтва і сканчаючы вынясеньнем выраку. Разам з тым, інфармуючы грамадзкасьць пра дзейнасьць органаў правасудзьдзя, журналісты павінны сумленна выконваць свой прафэсійны доўг і ня ўносіць сумяціцу ў працу судовых установаў. Неадрэгуляванасьць узаемаадносінаў правасудзьдзя і прэсы стала прычынай пастаянных канфліктаў паміж імі.

Вельмі часта абмяркоўваецца пытаньне пра маральны доўг журналістаў перад органамі правасудзьдзя, якія, са свайго боку, павінны навучыцца лепш асьвятляць сваю дзейнасьць. Судзьдзі, пракуроры і адвакаты занепакоеныя тым, што прэса раскрывае сьледчыя матэрыялы, а журналісты — тым, што для атрыманьня пэрсанальных зьвестак трэба карыстацца ўсемагчымымі хітрыкамі. У выніку абодва бакі звальваюць адзін на аднаго адказнасьць за рэзбэшчанасьць сродкаў масавай інфармацыі. У гэтай сувязі можа ўзьнікнуць сытуацыя, пры якой прэса стане ўплываць на рашэньні суда а журналісты у сваю чаргу стануць паслухмяным інструмэнтам у руках прадстаўнікоў правасудзьдзя Як пазьбегнуць гэтага "зьмяшэньня жанраў"? Рабэр Бадынтэр, старшыня Канстытуцыйнага суда лічыць, што "доўг правасудзьдзя — зацугляць уседазволенасьць прэсы, а журналістаў — ускрываць недахопы ў працы праваахоўчых органаў". Такім чынам, хаця журналісты і павінны абараняць правы грамадзянаў, ім ня трэба праводзіць уласныя росьследы, у каторых, дарэчы, дэмакратычнае грамадзтва і ня мае патрэбы калі ягонае правасудзьдзе добра выконвае свае функцыі

ЦІСК С.М.І.

Той факт, што прававая дзяржава саступае ціску сродкаў масавай інфармацыі зьяўляецца для юрыстаў адной з самых сумных тэндэнцыяў... "Кожны грамадзянін мае права свабодна гаварыць, пісаць і займацца выдавецкай дзейнасьцю, і павінен несьці за гэта адказнасьць за злоўжываньне гэтай свабодаи у прадугледжаных законам выпадках", пішацца ў артыкуле 11 Дэклярацыі Правоў Чалавека Францускім заканадаўствам прадугледжаныя палажэньні, якія абараняюць чалавека ад нападак з боку сродкаў масавай інфармацыі. Да іх, у прыватнасьці, адносіцца таямніца сьледзтва. Аднак яе, на думку міністра юстыцыі П'ера Мэньеры, "сёньня, верагодна, увогуле нельга забясьпечыць", улічваючы "паблажлівыя адносіны да цэлага шэрагу дзеяньняў, якія прэса падае як меры па забесьпячэньні галоснасьці". Журналісты, са свайго боку, патрабуюць зьнясьці таямніцу сьледзтва толькі да асобных "момантаў, прадугледжаных законам", колькасьць каторых, на іх думку невялікая.

Гі. Данэ, старшыня Нацыянальнага савета францускаи адвакатуры, лічыць, што трэба ствараць асновы для больш незалежнага ажыцьцяўленьня правасудзьдзя. Прэзумпцыя невінаватасьці і аб'ектыўнасьць сьледзтва — вось тыя два прынцыпы, якія, на яго думку, павінны вызначаць характар асьвятленьня судовых справаў. Такім чынам задача журналіста — даваць справаздачу, распавядаць пра ўсе этапы справы пераходзячы ад фактаў да законных ацэнак, а ня весьці самастойныя росьследы, робячы зь іх уласныя высновы. Але як сумясьціць тэмпы працы правасудзьдзя з рытмам, у якім жывуць сёньня сродкі масавай інфармацыі?

Трэба заўважыць, што прырода сродкаў масавай інфармацыі такая, што іх цяжка выкарыстаць для асьвятленьня ці супастаўленьня розных меркаваньняў па складаных пытаньнях. Пры іх дапамозе і судзьдзя, і журналіст, абараняючы сваю пазыцыю, імкнуцца аказаць ціск адзін на аднаго. У выніку яны несамхоць мяняюцца ролямі, да таго ж, недастатковае веданьне журналістамі працэдурных пытаньняў, несумяшчальнасьць тэмпаў працы сродкаў масавай інфармацыі і органаў правасудзьдзя часта прыводзяць да маніпуляваньня фактамі. Толькі ўдасканаленьне падрыхтоўкі журналістаў, удасканальваньне шэрагу правілаў і стварэньне "інфармацыйнай службы" пры судовай установе, маглі б выправіць падобнае становішча і садзейнічаць больш адказнаму ўжываньню свабоды друку.

Ўпрасы свае, спэцыфічныя абавязкі адносна органаў правасудзьдзя апошнія ж стануць працаваць больш спакойна, толькі валодаючы ўласнымі сродкамі для інфармаваньня грамадзкасьці.

Судовая улада абараняе прававую дзяржаву і дэмакратыю, але і друк ня можа іх ігнараваць не зьмяніўшы свае прынцыпы.

Міжнароднае супрацоўніцтва

Пачынаючы з 1991 г Управа па эўрапейскіх і міжнародных справах (SAEI) Міністэрства Юстыцыі ў щчыльным кантакце зь міністэрствамі Замежных справаў і Каапэрацыі граюць актыўную ролю у супрацоўніцтве ў галіне юстыцыі, мэта якога — пашыраць акцыі дапамогі і абмену з замежнымі юрыдычнымі сыстэмамі.

Гэтая палітыка, якая асабліва актыўна праводзіцца ў Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропе (1), у Паўднёва-Ўсходняй Азіі і франкамоўнай Афрыцы, на думку Аліўе дэ Байнаста, кіраўніка Бюро Каапэрацыі SAEI, накіраваная, у прыватнасьці на правядзеньне ў жыцьцё юстыцыі. заснаванай на павазе правоў Чалавека, і фармаваньне юрыдычнага асяродзьдзя спрыяльнага для разьвіцьця гандлёвага абмену і інвэстыцыяў.

Такім чынам, вызначаны тры прыярытэтныя накірункі супрацоўніцтва. У першую чаргу, прафэсійнае навучаньне: супрацоўнікі юстыцыі і пэрсанал выпраўленчых установаў іншых краінаў маюць магчымасьць атрымаць ці папоўніць сваю адукацыю ў Францыі. Замежныя стажоры навучаюцца ў трох францускіх навучальных установах.

Нацыянальная школа магістратуры (ENM), заснаваная ў 1958 годзе,— адзіная навучальная ўстанова для судзьдзяў якая падтрымлівае зносіны зь вельмі вялікаи колькасьцю замежных дзяржаваў Гэтая Школа прапануе штогод цыкаль пачатковага навучаньня працягласьцю 20 месяцаў для будучых (ці нядаўна прызначаных) замежных судзьдзяў і агульны цыкаль павышэньня кваліфікацыі працягласьцю 6 месяцаў Абмен досьведам з францускімі калегамі прыводзіць да ўзаемнага ўзбагачэньня і ляжыць у аснове трывалых. дзейсных прафэсійных і асабістых сувязяў. Пачынаючы з 1960 г. больш за 2 тысячы замежных судзьдзяў, якія прадстаўлялі каля 90 краінаў, прайшлі навучаньне ў Нацыянальнай Школе магістратуры. Такім самым чынам сакратары судоў і пэрсанал выпраўленчых установаў іншых краінаў могуць прайсьці курс навучаньня адаптаваны да іхніх запытаў, у Нацыянальнай Школе судовай канцылярыі (ENG) разьмешчанай у Дыжоне, а таксама ў Нацыянальнаи Школе адміністрацыі выпраўленчых установаў (ENAP) у Фляры-Меражы.

Другі напрамак супрацоўніцтва адрасаваны краінам, якія жадаюць вывучаць францускую заканадаўчую сыстэму з за распрацоўкі ўласнага заканадаўства. Управа па эўрапейскіх і замежных справах Міністэрства Юстыцыі можа даць цэлы шэраг юрыдычных дакумэнтаў (кодэксы, тэксты законаў і г.д.), а таксама прапануе зацікаўленым краінам накіроўваць сваіх экспэртаў. У цяперашні час Камбоджа, напрыклад, робіць новы крымінальны кодэкс ва ўзаемадзеяньні з францускімі юрыстамі.

І, нарэшце, апошні накірунак гэтага супрацоўніцтва — палітыка збліжэньня юрысдыкцыяў, якая працуе на паляпшэньне ўзаемнага вывучэньня юрыдычных сыстэмаў і юрыдычных практык. Гэтая палітыка робіцца шляхам абмену судзьдзямі і юрыдычнымі супрацоўнікамі і можа набываць форму пабрацімскіх сувязяў, якія ўсталяваліся, напрыклад паміж Парыскім апэляцыйным судом і Маскоўскім гарадзкім судом, а таксама паміж судом Бардо і судом Будапэшта Толькі за 1993 год 100 францускіх судзьдзяў і супрацоўнікаў сакратарыятаў судоў былі накіраваныя для адна-двухтыднёвай працы за мяжой, у той час як у Францыі пабывалі 55 іхніх замежных калегаў.

1) Заснаваная ў студзені 1993 г. Асацыяцыя за абнаўленьне і пераўтварэньне ў жыцьцё абменаў з Цэнтральнай і Усходняй Эўропай (ARPEJE), у якую ўваходзяць дзяржаўныя інстытуты і прафэсіяналы-юрысты каардынуе ў гэтаи геаграфічнаи зоне акцыі супрацоўніцтва Францыі ў галіне права і юстыцыі.

Для кантактаў: *ARPEJE, 57 rue Saint Roque 75001 Paris, грамадзянскі адміністратар Мары-Крысьцін Сулье. Факс 33 1 44 86 14 57. Для атрыманьня любой іншай інфармацыі зьвяжыцеся з пасольствам Францыі ў Беларусі.*

ПАНЯДЗЕЛАК, 4

БТ
16.45 Крок.
17.15 «Пазнай сябе».
17.45 «Гэтага мы не праходзілі..
18.00 Фінансавы час.
18.20 Музычны антрак
18.35 Эканамікст.
18.50 Навіны.
19.00 Рэфэрэндум шчырая размова.
19.45 Вэртыкаль
20.15 Люстра.
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.50 ММФ «Залаты шлягер».
23.20 Мотаспорт. Супэрбайк Чэмпіянат сьвету-96
23.50 Навіны.

ОРТ
17.00, 22.20 Навіны.
17.20 «Новая ахвяра».
18.10 Гадзіна пік.
18.35 Адгадай мелёдыю
19.00 «Мы»
19.45 Дабранач, дзеці!
20.00 Час.
20.40 «Бага-2». «Мэта — Зямля
21.45 «Жыцьцё цудоўных людзей».
22.30 Тэніс. Міжнародны турнір «Кубак Крамля».
23.10 «Пятніца, 13».

КАНАЛ «РАСЕЯ»
6.00 Раніцні экспрэс.
6.25 Па дарозе на працу
6.35 «Мак і Матлі».
7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 23.00 Весткі.
7.20, 9.50, 23.25 Тавары — поштай
7.30 Раніцні экспрэс-2.
8.00 Рэтра-шлягер.
8.25 «Дарагая рэдакцыя...»
8.55 «Санта-Барбара». М/ф.
10.20 «Жнівень 1914». Д/ф.
15.05 Тэніс. «Кубак Крамля».
16.50 Блёкнот.
17.05 Тэхнадром імя І.П.Кулібіна.
17.15 L-клюб.
18.00 Момант праўды.
18.40 Асабліва важныя пэрсоны.
19.30 «Санта-Барбара». М/ф.
20.30 Джэнтальмэншоў.
21.00 Надвор'е на заўтра.
21.05 «На вастрыі нажа». М/ф.
22.05 Тэніс. «Кубак Крамля».
22.30 Тэлескоп.
23.35 Музыка ўсіх пакаленьняў
23.50 Ня сьпі і глядзі.

САНКТ-ПЕЦЯРБУРГ
11.55, 13.55, 15.55, 18.55, 22.50 Інфарм ТБ.
12.10 «Партрэт жанчыны».
13.00 Тэрмін адказу — сёньня
13.30 Парады садоўнікам.
13.40, 20.40 Тэлеслужба бясьпекі
14.10 «Дэмпсі і Мэйкпіс».
15.00 Парадоксы гісторыі.
15.25 «Гонар мае».
16.10 Міжнародны агляд
16.40 «Інспэктар Гэджэт».
17.05 Тэатральная правінцыя
17.35 Паказвае ЛОТ.
18.40 Вялікі фэстываль.
19.15 Спорт.
19.25 «Партрэт жанчыны».
20.10 Асабістая справа.
20.55 Спартовы агляд.
21.05 «Дэмпсі і Мэйкпіс».
21.55 Падзеі.
22.15 Гістарычныя выпадкі.

IV КАНАЛ, НТБ
7.00 Анонс тыдню.
7.10 «Рэквіем для голаса і фартэпіяна».
7.55 «Чалавек у масцы».
8.30 М/ф «Бывай».
9.55 Сузор'е НТБ.
11.45 М/ф «Зьмена лёсу».
13.25 Вынікі.
14.45 Урокі Фэміды.
15.15 Аляксей Фацьянаў
15.45 «Матэрыя».
16.40 Навіны.
17.00 М/ф «Дзеці супраць монстраў».
17.30 Футбольны клюб.
18.00, 21.00, 23.00 Сёньня
18.35 Герой дня.
19.00 Сьвет кіно. «Прамы рэпартаж з камэры сьмяротнікаў».
20.40 Расейскі альбом. Гурт «МФ-3».
21.35 Фэстываль міні-сэрыялаў. «Пагутарым пра гэта ў панядзелак».
22.30 Часінка.
3.20 Тэніс [illegible]

АЎТОРАК, 5

БТ
7.30 Раніцні кактэйль
7.50 Эканамікст.
8.00 Навіны.
8.15 «Гэтага мы не праходзілі...»
8.30 Абібок.
9.00 Госьці ў хату.
9.30 «Лёгкія крокі». М/ф.
10.55 Мультфільмы.
11.15 «Трапічная сьпёка».
12.15 Прэс-імпрэза.
12.55 Цёмны пакой.
13.25 Тураб'ектыў.
13.55 Бон тон.
14.15 Акалада.
14.45 «Птушыная восень». Д/ф
15.00 Навіны.
15.10 «Бусьлянія [illegible] Ход планам». М/ф.
16.00 Параграф.
16.20 «Усё пра ўсё».
16.45 Кантрасты.
17.15 На добры лад.
17.40 Заняткі Н.Наважылавай
18.10 «Будзьце здаровыя».
18.20 Музычны антракт.
18.35 Эканамікст.
18.50 Навіны.
19.00 Рэфэрэндум шчырая размова.
19.35 «Трапічная сьпёка»
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.55 Музычны антракт.
22.10 М/ф «Гульня ўяўленьня».
23.30 Супэргол.
24.00 Навіны.

ОРТ
11.00, 14.00, 17.00, 23.00 Навіны
11.10 «Мы і рынак».
11.55 М/ф «Беражлівыя жанчыны». С. 1.
13.00 «Мара маленькага восьміка». Мультфільм.
13.10 Брэйн рынг.
14.20 «Касьмічныя выратавальнікі лейтэнанта Марша».
14.45 Квартэта «Вясёлая кампанія»
14.55 Мульцтропія.
15.10 Чароўны сьвет, ці Сынэма
15.40 «Элен і хлопцы».
16.05 ...Да шаснаццаці і болей.
16.30 «Вакол сьвету».
17.20 «Новая ахвяра».
18.10 Гадзіна пік.
18.35 «Адгадай мэлёдыю»
19.00 Тэма.
19.45 Дабранач, дзеці!
20.00 Час.
20.40 Фільм «Якія ненаддаюцца».
22.15 Хіт-парад.
23.10 Тэніс. Міжнародны турнір «Кубак Крамля».

КАНАЛ «РАСЕЯ»
6.00 Раніцні экспрэс.
6.25 Па дарозе на працу.
6.35 «Мак і Матлі».
7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 23.00 Весткі.
7.20, 9.50, 23.25 Тавары — поштай.
7.30 Раніцні экспрэс-2.
8.00 Рэтра-шлягер.
8.25 «Дарагая рэдакцыя...»
8.55 «Санта-Барбара». М/ф.
10.20 «Эўропа ў вагні». Д/ф.
15.00 Тэніс. «Кубак Крамля».
15.50 Месяцаслоў.
16.20 Тэніс. «Кубак Крамля».
16.55 Блёкнот.
17.10 Тэлечасопіс «Здароўе».
17.20 «Па той бок экрана». Брытанскае ТБ, погляд знутры.
17.50 Надзвычайны канал.
18.15 Лідар-прагноз.
18.40 Асабліва важныя пэрсоны
19.30 «Санта-Барбара». М/ф.
20.30 Раз на тыдзень.
21.00 Надвор'е на заўтра.
21.05 Подыюм д'АРТ.
У асобным разьдзеле сваёй кнігі М.Хахай піша пра тое, як замежная адукацыя ўплывала на культурнае жыцьцё юнакоў: мадэрнізацыя, паланізацыя ... і іншыя. Аўтар дае даволі кароткі ацэнкі, наступству, бо зазначыў, што тэма запатрабуе спэцыяльных дасьледаў. Пачатак паланізацыі Радзівілаў М.Хахай шукае ў замежным побыце князёў у першай палове XVI ст. у Балёньні ў атачэньні палякаў, а таксама ў выхаваньні Мікалая Чорнага і юнакага брата Яна на кракаўскім двары караля Жыгімонта Старога. Ужо Радзівіл Чорны ўважаў польскую мову за родную мову, пра што сам пісаў сыну Мікалаю Крыштафу Сіротку у 1564 г. На думку М.Хахая, пад канец XVI ст. Радзівілы ў грамадзкім жыцьці карысталіся польскай і лацінскай, а мову народную, прайшла. Ёсьць і такое сьведчаньне з першых вучняў: калі ў 1595 г. Станіслаў Радзівіл звярнуўся з просьбамі імкнучы ... Сіроткі: "Кал вучыць рускай мовы, то забыў літоўскую, а цяпер мову ужо да школы, бо мне так, ужо бачу, будзе далёка патрэбная". Даволі ведама, што кальвініст Крыштаф II ня ўмеў чытаць "па-руску", гэта значыць з выключэньнем старабеларускай мовай Радзівілы таксама страцілі. Затое ў абароне суверэнітэту ВКЛ яны былі ў першых шэрагах і актыўна супрацьдзейнічалі пранікненьню палякаў у Вялікае Княства. Поўны дыскамфорт ад згубы каранёў яны ўсё ж адчувалі. Януш пісаў Крыштафу II: "Паколькі ліцьвінам нарадзіўся, то ліцьвінам памраць мне прыйдзецца, адно польскую мову ўжываць у нашай айчыне мусім".

Замежныя вандроўкі і знаёмствы з тагачаснай арыстакратыяй умацоўвалі ў маладых Радзівілаў пачуцьцё значнасьці свайго роду ў палітычным жыцьці. Як заўважае М.Хахай, гэта магло спрыяць таму, што ў 1655 г. Януш Радзівіл лёгка пайшоў на разрыў уніі з Польшчай і заключэньне уніі са Швэцыяй. На такое нямецкія князі мелі права, а Радзівілы былі менавіта "нямецкімі" князямі, бо атрымалі тытул князёў Сьвятой Рымскай Імпэрыі.

Што да іншых моваў, то нясьвіская (каталіцкая галіна) Радзівілы звычайна вывучалі за мяжой італьянскую, а нямецкая і францускай былі больш папулярныя сярод Радзівілаў-кальвіністаў. Лаціну вучылі ўсе, не зважаючы на веравызнаньне. Самым вялікім паліглётам быў Станіслаў — ён забыў літоўскую, затое вывучыў лацінскую, грэцкую, "славянскую", італьянскую, францускую, гішпанскую, нямецкую, вугорскую, турэцкую і арабскую. Ня дзіва, што многія Радзівілы лёгка валодалі пяром і пакідалі нашчадкам мэмуары, дзёньнікі, тэалягічныя творы, прамовы. Шмат хто зь іх зьбіраў бібліятэкі, творы мастацтва, замаўляў свае партрэты ў выбітных эўрапейскіх мастакоў, будаваў архітэктурныя ансамблі.

Кніга М.Хахая напісаная старанна, чаго і патрабуе жанр навуковага жыцьцяпісу. Тут навуковыя адкрыцьці робяцца на ўзроўні: "2 ці 3 кастрычніка Радзівіл пакінуў Рым і 3 ці 4 лістапада ён прыехаў у Мілян". Усё гэта патрабуе грувасткага даведачнага апарату, і каб цалкам даведацца пра нейкую спасылку, трэба зазірнуць у чатыры месцы кнігі. Мяркуем, што ў Беларусі знойдуцца ахвотныя гэта зрабіць. Чытач атрымае асалоду хутчэй не ад палёту думак і лёгкасьці пяра, а ад бездакорнай дакладнасьці аўтара.

Валеры Пазьнякоў

Кніга — поштай

На складзе БГФ "Наша Ніва" ёсьць кнігі:

1. **Адам Глёбус. Толькі не гавары маёй маме... Зборнік інтымнае прозы.** — Менск: Сучасная літаратура, 1995. — 310 с. 40.000 БРБ
2. **Адам Глёбус. Скрыжаваньне.** — Менск: БАДЛПР — "Ковчег", 1993. — 46 с. — 7.000 БР
3. **Юлiяна Вітан-Дубейкаўская. Мае ўспаміны.** — Вільня, 1994. — 192 с. — 24.000 БРБ
4. **Баляслаў Лесьмян. Пан Блішчынскі** / Пераклад з польскай. — Вільня-Менск: "Наша ... — ... Літаратура", 1994. — 93 с. 10 000 БРБ
5. **Вітаўт Кіпель. Беларусы ў ЗША.** — Менск, 1993. — 352 с. — 25 000 БРБ
6. **Брэтон Ф., Пру С. Выбух камунікацыі.** — Менск: БФС — "Тэхналогія", 199... — ...36 с. 24 000 БРБ
7. **Говард Майкал. Сучасная культурная антрапалёгія.** — Менск: БФС — "Тэхналогія", 1996. — 486 с. — 35 000 БРБ
8. **Лоўзі Дж. Гістарычныя уводзіны у філязофію навукі.** — Менск: БФС — "Тэхналогія", 1995. — 328 с. — 24 000 БРБ
9. **Энтані Сьміт. Нацыяналізм у дваццатым стагодзьдзі.** — Менск: БФС — "Эўрафорум", 1995. — 272 с. — 20 000 БРБ
10. **Джын Эйчысан. Гаваркія істоты. Уводзіны ў псыхалінгвістыку.** — Менск: БФС, 1995. — 312 с. — 20 000 БРБ
11. **Браян М. Фэйган. Уводзіны у археалёгію.** — Менск: БФС, 1996. — ... с. — 24 000 БРБ
12. **Беларускі рок-н-рол: Тэксты ("Бонда", "Крама", "Мроя", "Новае Неба", "Уліс")** — "Ковчег", 1994. — 64 с. — 7 600 БРБ
13. **Беларускі вайсковы строй і зброя XII-XVIII ст.** Камплект каляровых паштовак ... — Менск: ... БФС "Watkalaka", 1996. — 25 000 БРБ
14. **Беларускі гістарычны агляд.** 1996, т.3, сшытак 1. — 35 000 БРБ
15. **Ш.Дэбаш, Ж.-М.Пант'е. Уводзіны ў палітыку.** — Менск: БФС — "Эўрафорум", 1996. — 62... с. — 40 000 БРБ
16. **М.Грыгор'еў. Войска ВКЛ ад Сасвў да Касьцюшкі (1765-1794).** — Менск, 1991. — 16... с. ... — 20 000 БРБ
17. **Z.Fedecki. Цёплыя вечары... ды халодныя ранкі, czyli co śpiewano w Feliksowie.** — Warszawa, 1992. — 160 с. — 20 000 БРБ
18. **Юрг Штайнэр. Эўрапейскія дэмакратыі.** — Менск: БФС — "Тэхналогія", 1996. — 343 с. — 45 000 БРБ
19. **Джон Бэрдшоў. Эканоміка. Ч. 1: Мікраэканоміка / Дапаможнік для студэнтаў.** — Менск: БФС — "Тэхналогія", 1996. — 560 с. — 50 000 БРБ
20. **Ўэстан Ла Бар. Асабістасьць з псыхааналітычнага пункту гледжаньня.** — Менск: "Тэхналогія", 1995. — 47... с. — 15 000 БРБ
21. **Фрагмэнты (філязофіі, культуралёгіі, літаратуры). №1, 1996.** — 35 000 БРБ
22. **Жана Эрш. Філязофскае здумленьне: Гісторыя заходняе філязофіі.** — Менск: Эўрафорум БФС, 1996. — 400 с. 35 000 БРБ

Зьвяртайцеся на адрас: Андрыеўскі Андрэй Паўлавіч, Менск 220094, а/с 89. У Менску да А.Андрыеўскага можна звяртацца праз тэл. 239-78-49.

Першы Літоўскі Статут

PIRMASIS LIETUVOS STATUTAS

ПЕРВЫЙ ЛИТОВСКИЙ СТАТУТ

"Мы, Жигимонт з ласки Божьи король польский и великий князь литовский руский, пруский... и иных, маючи собе достаточное розмышленье, умыслом добрым и з ласки нашое господарское, хотячи обдаровати правы хрестьянскими, всим прелатом..., вельможам, рыцерем повышоным шляхте и всему поспольству и их подданым а тубыльцом земль Великого князьства нашого Литовского, которого бы кольвек стадла а стану были, все их правы и привилья костельные, так латынского закону, яко и греческого, тэж и светцкие..., справедливе слушные, справные... хочем так мети моцне, якобы в тые листы наши слово от слово были вписаны... потвержаем и вмоцняем, сказуючи их мети моц вечными часы".

(З прадмовы да Статута 1529 г.)

Беларускі Гуманітарны Фонд "Наша Ніва" распачынае новы праект, мэта якога — забясьпечыць беларускіх навукоўцаў і аматараў тэкстам Першага Літоўскага Статуту 1529 г., які стаў прававою базаю для наступных выданьняў кадыфікацыйных помнікаў Айчыны нашых продкаў — Статутаў 1566 і 1588 г.

У XX ст. Першы Статут выдаваўся толькі у 1960 г. у Менску (зусім мізэрным накладам) і ў 1991 г. у Вільні. Віленскае выданьне самае поўнае і акадэмічнае — паралельна са старабеларускім тэкстам ідуць старапольскі (пераклад зроблены ў 1532 г.) і лацінскі (1530 г.). У канцы выданьня знаходзіцца чатырохмоўны слоўнік тэрмінаў са Статуту. Тэксты скануэраваныя ў томе N3 віленскага акадэмічнага выданьня, якое наш Фонд мае намер завезьці ў Беларусь.

Даведкі можна атрымаць праз тэл. ***239-78-49*** *з вечара да* ***Андрэя Андрыеўскага.***

НОВЫ БЕЛАРУСКІ КНІЖНЫ ПРАЕКТ

Беларускі Гуманітарны Фонд "Наша Ніва" займаецца распаўсюджаньнем найноўшых беларускіх выданьняў у галіне гуманістыкі, а таксама мастацкае літаратуры. Наша мэта — зрабіць новую беларускую кнігу жывым фактарам сучаснае культуры.

Сыстэма "Новага беларускага кніжнага праекту" дзейнічае у гарадах:

БЕРАСЬЦЕ

Кнігі Браяна М. Фэйгана "Уводзіны у археалёгію", Энтані Сьміта "Нацыяналізм у XX ст.", Ш.Дэбаша й Ж.-М.Пант'е "Уводзіны ў палітыку" можна набыць у кнігарнях "СЬВІТАНАК" (бульвар Касманаўтаў, 120) і "АСЬВЕТА" (вул. Маскоўская, 57). У "Сьвітанку" таксама прадаецца камплект каляровых паштовак "Беларускі вайсковы строй і зброя XII-XVIII ст."

ГОМЕЛЬ

У памяшканьні Гомельскай абласной унівэрсальнай бібліятэкі (пл. Перамогі, 2) пры Аддзеле інфармацыйных тэхналёгіяў (тэл. 55-71-97) адкрыты кніжны аддзел. Гэта адзіная крамка у 500-тысячным горадзе, дзе можна набыць так... шырокі... сучасных беларускіх кніг — мастацкую літаратуру, дасьледаваньні ў галіне гуманістыкі, навуковыя пераклады. Апроч кніжак тут таксама можна прыдбаць самыя апошнія запісы беларускае музыкі.

ГОРАДНЯ

Продаж кніжнай прадукцыі адбываецца у шапіку "ВАСІЛЁК" (насупраць Унівэрсітэту).

МАЛАДЗЕЧНА

Кнігі можна набыць у шапіку ТБМ (на чыгуначным вакзале). Падрабязнасьці можна даведацца праз тэл. 6-71-70, ад Алеся...

МЕНСК

Кніга Браяна М. Фэйгана "Уводзіны у археалёгію" прадаецца у кнігарнях "Сьвітанак", "Акадэмкніга", "Кнігарня пісьменьніка", "Цэнтральная". Кнігі Адама Глёбуса "Толькі не гавары маёй маме... Зборнік інтымнае прозы" і "Дамавікамэрон" прадаюцца ў крамах "Сьвітанак" і "Кнігарня пісьменьніка", у шапіку ў фае Нацыянальнай бібліятэкі.

СЬВЕТЛАГОРСК

Кнігі можна набыць у філіі БГАКЦ, Зялёная вул., дом 10, паверх 2. Тэл. (8-02342) 2-71-77.

КАСЭТЫ — поштай

На складзе БГФ "Наша Ніва" ёсьць касэты (кошт — 25 000 БРБ)

1. **НОВАЕ НЕБА.** Сон у трамваі.
2. **НОВАЕ НЕБА.** Go home (1995).
3. **НОВАЕ НЕБА.** Дзеці чорнага гораду (1991).
4. **КРАМА.** Камэдыянт (1995).
5. **КРАМА.** Хворы на Rock-n-Roll.
6. **КРАМА.** Гэй, там, налівай! (1994).
7. **N.R.M.** Тататата (1995).
8. **ULIS.** Life (1996).
9. **УЛІС.** Чужаніца (1991).
10. **УЛІС.** Краіна доўгай белай хмары (1993).
11. **БОНДА.** Найлепшыя песьні.
12. **МЯСЦОВЫ ЧАС.** Наша ускраіна (1991).
13. **ПАЛАЦ.** Палац (1996).
14. **Песьні беларускіх бардаў** (1992).
15. **РЭНЭСАНС** (беларускі джаз).
16. **БЕЛАРУСКІЯ НАРОДНЫЯ КАЗКІ**
17. **БЕЛАРУСКАЯ МУЗЫЧНАЯ ЛІТАРАТУРА** 1-3.
18. **БЕЛАРУСКАЯ ГІТАРНАЯ МУЗЫКА**
19. **ЗАЛАТЫ ФОНД БЕЛАРУСКАГА РОК-Н-РОЛУ** 1-3.

Т.1: Бонда, Уліс, Мроя, Рэй, Мясцовы Час, Блакiнтны...
Т.2: Бонда, Уліс, Мроя, Крама, Новае Неба, Мясцовы Час, Тутэйшыя хлопцы
Т.3: Золотая середина, Отражение, Алексей Шедько & "Доктор Моро", Грани, Метро, Сузорье, Зартипо
Т.4: Палац, Уліс, Крама, Новае Неба, Мроя.
Т.5: Зиндан, Why Not, Отражение, Инспектор, Red Dynamite, D...

20. **МРОЯ.** Найлепшыя песьні з праграмаў 1987-90 г.
21. **УЛІС.** Блуканьне (1996).
22. **ВІКТАР ШАЛКЕВІЧ.** Смутны беларускі ... (1996).
23. **КАМЭЛОТ.** У краіне талераў (1995).
24. **ZINDAN** (1994).
25. **КРАМА.** The Best (1996).

Зьвяртайцеся на адрас: 220094 Менск, а/с 89, Андрыеўскаму Андрэю Паўлавічу. У Менску да А.Андрыеўскага можна зьвярнуцца праз тэл. 239-78-49



РАРЫТЭТ

Паведамленьне для аматараў «Нашай Нівы»

У рэдакцыі "Нашай Нівы" вы можаце замовіць рарытэтныя нумары з моманту адноўленьня газэты ў Вільні:

№1-4 за 1991 г., №6-8 за 1992 г., №10, 12-18 за 1993 г., №1, 2, 6, 8-9, 12 за 1994 г., №5-8 за 1995 г.

Ахвотныя могуць замовіць сабе ксэракопію любога нумару.

Зьвяртайцеся на адрас:

Андрыеўскі Андрэй Паўлавіч, Менск 220094, а/с 89

Паведамленьне для замоўцаў Літоўскае Мэтрыкі.

У Менск завезены шосты й восьмы тамы Мэтрыкі. Просьба да тых, хто не пакінуў пры замове нумароў сваіх тэлефонаў, зьвярнуцца да Андрэя Андрыеўскага праз тэлефон 239-78-49.

Бабуля і дзядуля

Ці добра Вы ведаеце сваіх бацькоу у ролі выхавальнікаў Вашых дзяцей? Гэты тэст дапаможа Вам у гэтым разабрацца Выберыце свои варыянт адказу

1. Калі Вашыя дзеці пажадалі марозіва ці цукеркі, як Вы думаеце, бабуля ці дзядуля задаволіць іхняе жаданьне? а) калі гэта перад ежай, то не б) так але толькі зрэдку в) амаль заўсёды.

2 Дзеці раскідваюць рэчы, цацкі. Што зробяць Вашыя бацькі? а) зробяць заўвагу; б) патрабуюць адразу ж навесьці парадак в) самі ўсё прыбяруць.

3. Як паступяць бабуля і дзядуля, калі іхныя ўнукі ўжывуць нейкія крыўдныя, грубыя словы? а) забароняць так казаць надалей; б) калі гэта здарыцца яшчэ раз, то пакараюць, в) ня зьвернуць увагі ці паспрабуюць усё ператварыць у жарт.

4. Як дзядуля ці бабуля выхоўвае ва унукаў прагу да працы? а) асабістым прыкладам; б) патрабавальнасьцю; в) яны імкнуцца вызваліць іх ад працы

5. Што яны робяць, калі дзеці просяць купіць ім якую-небудзь цацку? а) абяцаюць, але не сьпяшаюцца з пакупкай, б) усе запежыць ад кошту, в) яны адразу ж выконваюць жаданьне

6. Ці вучаць бабуля і дзядуля сваіх унукаў адрозьніваць кепскае ад добрага? а) заўсёды тлумачаць, што добра а што кепска, б) ругае; в) лічыць, што калі ўнукі падрастуць то самі ва ўсім разьбяруцца.

7 Унучка сьцірае пыл і выпадкова разьбівае любімую вазачку бабулі. Як яна рэагуе? а) дапаможа сабраць аскепкі, б) строга адчытае; в) забароніць надалей выціраць пыл.

8. Якое стаўленьне ў старых да самастойнасьці ўнукаў? а) выхоўваюць з малых гадоў; б) ім падабаецца гэтая якасьць, в) яны лічаць што ўнукі яшчэ малыя

9. Унукі павінны ў двары школы дапамагчы ачысьціць двор Што у такім выпадку кажа ім бабуля ці дзядуля? а) раіць старацца; б) ухогупе не абмяркоўвае гэтае пытаньне; в) кажа, што прыборка двара — гэта ня іхняя справа

10. Унукі ў нечым правініліся. Як рэагуе на гэта бабуля ці дзядуля? а) ругае іх за гэта; б) карае тым, што пазбаўляе якога-небудзь ласунка ці забараняе рабіць тое, што ім падабаецца, в) устае на бок дзяцей

За кожны адказ "а" запішыце 10 балаў, за "б" — 5 за "в" па 1 бале Падсумуйце вынікі

76 100 балаў. *Вашыя бацькі актыўна дапамагаюць Вам выхоўваць ласкавых і добрых дзяцей. Яны строгія і не адступаюць ад сваіх прынцыпаў. Падтрымлівайце самастойнасьць Вашых дзяцей. Калі Вашыя дзеці стануць выказваць пэўную халоднасьць у адносінах з бабуляй ці дзядулем, то паспрабуйце садзейнічаць стварэньню атмасфэры душэўнасьці ў сям'і. Спрабуйце і Вы быць такімі, як Вашыя бацькі.*

33-75 балаў. *Бабуля і дзядуля дапускаюць пабпажкі пры выхаваньні ўнукаў. Канешне, робяць яны гэта нявольна, бяз злога намеру. Але калі Вы заўважаеце, што яны ў гэтым перастараліся, то паспрабуйце далікатна паправіць іх. Павага, разуменьне і любоў, якая існуе паміж бабуляй, дзядулем і ўнукамі, — гэта канешне ж, цудоўна, але пагадзіцеся, гэтыя пачуцьці не павінны адбівацца на якасьці выхаваньня*

32 балы і меней. *Сваёю празьмернаю любоўю бабуля дзядуля аказвае кепскую паслугу сваім унукам. І калі раптам здарыцца так, што Вашыя бацькі ужо ня змогуць дапамагаць Вам, то Вы апынецеся "адзін на адзін" з расьпешчаным, капрызьлівым дзіцём, а ад гэтага Вы і самі адчуеце сябе квольным бездапаможным*

У ПАПЯРЭДНІХ НУМАРАХ (№1 23):

Кошты на менскіх рынках: Камароўка (ІНФ №1, 7, 10, 21), Рэчавы рынак "Дынама" (ІНФ №2, 8), Аўтарынак (ІНФ. №3, 12); Кошты на кампакт-дыскі (ІНФ. №4), Кошты на кватэры у Менску. Кошты на офісы (ІНФ. №5, 17); Кошты на будаўнічыя матэрыялы (ІНФ. №6); Кошты на камлутары. Менск (ІНФ. №9); Кошты на філязофска-гуманітарную літаратуру (ІНФ. №18) Кошты на кватэры у Менску (ІНФ.№24); Кошты на турыстычныя падарожжы ў Менску (ІНФ.№26). Кошты на запасныя часткі для аўто (ІНФ.№27); Кошты на авія і чыгуначныя квіткі (ІНФ.№28).

Транспарт: Расклад руху пасажырскіх цягнікоў ад станцыі Менск-Пасажырскі (ІНФ №1,15); Расклад руху прыгарадных цягнікоў ад станцыі Менск-Пасажырскі (ІНФ №2 12); Расклад руху аўтобусаў ад а/с Менск-Цэнтральны і Менск-Усходні (ІНФ №3, 16, 17); Расклад рэйсаў пасажырскіх самалетаў і ўсё пра аўтазапраўныя станцыі (ІНФ. №5).

Адукацыя: Замежнае навучаньне ў 1996 годзе (ІНФ №1); Платнае навучаньне ў Менску. Камэрцыйныя ВНУ (ІНФ №2); Дзяржаўныя ВНУ Платнае навучаньне (ІНФ. №3-4); ВНУ Акадэміі (ІНФ. №8-10); Стыпендыі DAAD для Беларусі (ІНФ.№30).

Біржа працы: Аналіз стану рынку працы паводле зьвестак Менскага гарадзкога цэнтру занятасьці насельніцтва (ІНФ. №1-9), Новыя вакансіі і працоўныя месцы на Беларусі (ІНФ. №1 28)

Адпачынак: Вучымся гуляць у прэфэранс (ІНФ № 1 15), Вучымся гуляць у більярд (ІНФ. № 16-24), Тэсты, шахматныя і інтэлектуальныя задачы (ІНФ №1 29)

Спажывец: Тэлефонныя коды гарадоў Беларусі, краінаў блізкага і далекага замежжа (ІНФ №2). Твае правы, пасажыр (ІНФ. №2), Як купляць і прадаваць кватэру. Што азначае спадчыньнае жаркаваньне (ІНФ №3), Месяцовы пасяўны каляндар (ІНФ. №4), Як вызначаць якасьць мясных і рыбных прадуктаў (ІНФ №5), Пра новыя далары. Прыўдэ пра цыгарэты. Штрыховы код — як яго расшыфроўваць (ІНФ. №6), Як выбіраць абутак (ІНФ. №7), Міжнародная сыстэма памераў (ІНФ. №10), Каб вырасла расада ... (ІНФ. №11), Як набыць аўтамабіль у Нямеччыне (ІНФ №18 Заканчэньне), Вывучаем якасна ... аўтамабіляў (ІНФ. № 12, 15, 17), ... (ІНФ. № 16), ... (ІНФ № 15, 17 18 Заканчэньне) Спажывецкі тэст — пра ... (ІНФ. № 20), Спажывецкі тэст — тэлевізары (ІНФ. № 21), Кошты на аўто у Польшчы (ІНФ № 21, 22), ... (ІНФ. № 23); "Time Share" Я пазьбегнуць ... (ІНФ. № 23), Інвэстыцыйныя фонды: некалькі парадаў ... (ІНФ. № 23), ... шампанскага (ІНФ. № 23); Рыбныя прадукты (ІНФ. №24), Гарэлка. Чого баяцца? (ІНФ. №24); Каб кватэра была цёплай (ІНФ №26); Фарбуем вопратку ... (ІНФ №26); Калі я памяняю бітоэйк (ІНФ №27). Спажывецкі тэст — кухонныя камбайны (ІНФ №28). Калі вы вырашылі набыць кампутар (ІНФ №30)

Інструктар: Друкорня ў кожнай кватэры; За родную школу; Зьбіраемся ў падарожжа (ІНФ. № 19); Аперацыя "ВАГІ" (ІНФ. №24); Як зрабіць гектограф (ІНФ.№30).

Здароўе: Перш чым зьвяртацца да лекара. Як кінуць паліць (ІНФ. №4), Прыродныя отруты (ІНФ. №10); Атлетычныя клюбы, шэйпінг, аэробіка, тэнісныя корты (ІНФ. №18); Комплексная ацэнка забруджаньня асяродзьдзя Менску і вобласьці (ІНФ. № 19), Тэст. асьпірын (ІНФ. № 22); Небясьпечныя лекі (ІНФ. № 22); Пра шкоду пасіўнага паленьня (ІНФ № 22); Без дыэты не абысьціся (ІНФ. № 23); Перш чым купіць цацку, панюхайце! (ІНФ № 23)

Гаспадарка: Газ у нашым доме. Як чысьціць плямы на вопратцы (ІНФ. №5); ЖЭС. Рамонт жытла. Пункты прыёму замоваў на будаўніча-рамонтныя працы (ІНФ. №6), Як мыць і чысьціць посуд Калі заліло кватэру... (ІНФ. №8); Як пабудаваць садовы домік. Дом і дзялянка (ІНФ №9)

Беларускі кампутар Камлютарная энцыкляпэдыя Гісторыя сьвету на CD-ROM (ІНФ №29)

Прэс-рэліз. Сьвет за тыдзень (ІНФ №28, 29, 30)

Грамафон: Старонка вершаванага радка (ІНФ. №6, 8, 11, 17, 19, 20, 24, 25, 26)

Харчаваньне: Якую гарбату мы п'ем Пра часнык (ІНФ №7), Бары, рэстарацыі, кавярні Менску (ІНФ. №15)

Спорт: Вынікі спаборніцтваў і інш (ІНФ. №7, 9, 19).

Бібліятэка: Новыя паступленьні ў кнігарні Рэзан (ІНФ. №9, 10, 11, 15, 16, 18-30).

За межою: Хто такія ныбёрцы, Ліставаньне з навучальнымі ўстановамі ЗША (ІНФ. №17). Ці будзе Кітай другой Японіяй (ІНФ №29)

Беларусь і сьвет Індзейцы у Беларусі (ІНФ. № 21)

Адвакат: Ахова правоў чалавека. Міжнародная Амністыя (ІНФ. №17)

Псыхалёгія: Сіндром чалавечага жыцця ... у дзяцінстве (ІНФ. №24), Калі ... усе павінны залезьці ў ваду і плёскацца (ІНФ. №24).

Чалавек: Пра цяжкае жыцьцё і лёгкую сьмерць. Дзёньнік без канца. Г. Матусевіч. Тэст: самая простая гульня (ІНФ. №27)

ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫХ НУМАРАХ

Рынак: Новыя кошты на розныя тавары

Грамафон: Новыя вершы новых чытачоў



"Паветраны шар" "ЭКСТАЗІ" прызямліўся ў Літве...

У ЛІТВЕ ПАДПОЛЬНА РАСПРАЦАВАНАЯ ТЭХНАЛЕГІЯ ВЫТВОРЧАСЬЦІ НАРКОТЫКУ "ЭКСТАЗІ"

З надзейных крыніцаў стала вядомым, што самы папулярны зараз у Заходняй Эўропе сынтэтычны наркотык амфэтамін "Экстазі" робяць і ў Літве. Тэхналёгію ягонай вытворчасьці шляхам вывучэньня навуковых артыкулаў аўтара "Экстазі" А.Шульгіна скапіяваў адзін літоўскі хімік На гэта ён страціў паўтары гады.

ЦІКАВАСЬЦЬ АЗІЯЦКАЙ МАФІІ

Звычайна на захад трапляюць стандартныя таблеткі ці капсулы "Экстазі" у якіх зьмяшчаецца ня менш за 100 міліграмаў актыўнага рэчыва. З кілі сынтэзаванага у Літве актыўнага рэчыва было зроблена 10 тысячаў таблетак. Як толькі праца была скончаная, замоўцы таблеткі вывезьлі Гэта было ў сярэдзіне лета 1995 года.

У адным расейскім горадзе адбыўся кансыліюм. Знаўцы наркотыкаў з Англіі, Нямеччыны, ЗША і Літвы вынесьлі свой прысуд: амфэтамін "Экстазі" адпавядае патрабаваньням, якія ставяцца да якасьці гэтага прэпарату на заходнім чорным рынку гандлярамі наркотыкаў.

Хутка літоўскай распрацоўкай зацікавіліся "хімікі" адной сярэднеазіяцкай дзяржавы. Але літоўскія "хімікі" адмовіліся прадаць ім схему вытворчасьці.

Сынтэтычныя наркотыкі амфэтаміны якія ўздзейнічаюць на цэнтральную нэрвовую сыстэму, папулярныя ў наведвальнікаў дыскатэкаў у краінах Заходняй Эўропы Яны пранікаюць у Літву, аддасьняючы "джэф" і какаін і становяцца самым жаданым "кайфам"

ДОМ У ЦЭНТРЫ КОЎНА

Ідэя па стварэньню чорнага рынку і вытворчасьці "Экстазі" зарадзілася ў Коўне тры гады таму. У Вільні гэты наркотык зьявіўся ня селета, як мяркуюць многія, а два з палові гады таму.

Як даведалася рэдакцыя "Лietuvas рытас" з надзейных крыніцаў кватэра гандляроў "Экстазі" знаходзіцца ў самым цэнтры Коўна. Гэтым займаецца буйная фірма, якая мае шмат філіялаў і рэалізуе цыгарэты, алькаголь ды іншыя тавары.

Таблеткі "Экстазі" трапляюць ў краіну ў кантэйнэрах з цыгарэтамі і алькаголем Першая буйная партыя — сто тысячаў дазінак — усплыла ў Літве два гады таму.

Гандляры "Экстазі" у Вільні — дробная рыбка. Гэта — адзінкі, якія ў якасьці турыстаў па Галяндыі, Нямеччыне ці Швэцыі купляюць там на дыскатэках і ў рэстарацыях па 200-300 таблетак і вязуць іх у Літву. Прадаўшы такую колькасьць таблетак, можна зарабіць 1-2 тысячы даляраў

Кошты на літоўскім чорным рынку дыктуе буйнейшая фірма, якая гандлюе "Экстазі". У Коўне адна таблетка каштуе 40 50 літаў, у Вільні — 60.

"СУМЛЕННЫЯ БІЗНЭСМЭНЫ"

Паводле зьвестак з добра інфармаваных крыніцаў, некалькі акцыянэраў буйной ковенскай фірмы зацікаўленыя не толькі ва ўвозе "Экстазі" у Літву, але і у вытворчасьці наркотыка на месцы.

Умовы для гэтага склаліся спрыяльныя У Літве няма законаў па кантролі за наркотыкамі а органы праваапарадку такімі рэчамі не займаюцца. Сыравіну, зь якой робяць сынтэтычныя наркотыкі, можна без асаблівых праблемаў увесьці ў краіну зь Нямеччыны а дадатковыя матэрыялы ёсьць і на месцы. Выраблены таблеткі вы гадна прадаюцца за межамі Літвы.

Калі ёсьць схема тэхналягічнага працэсу, укамплектаваная лінія вытворчасьці таблетак і капсулаў, пры слабым кантролі за правозам хімічных рэчываў праз дзяржаўную мяжу і наяўнасьці засакрэчаных складаў, запусьціць вытворчасьць можна за месяц.

Паводле сьведчаньняў з тоі ж крыніцы, вядомая ковенская крымінальная групоўка "дактарасаў" да "Экстазі" дачыненьня ня мае. Гэтую справу ўзялі ў свае рукі некалькі "сумленных прадпрымальнікаў", якія падтрымліваюць сувязь зь "вярхамі". Што гэта за "вярхі", крыніца не ўдакладняе. Паводле тых жа зьвестак, "віленская брыгада" таксама не кантралюе гэтую сфэру. Брыгада спрабуе весьці гандаль так званымі старым і наркотыкамі — апіятамі якія выраблююць з макавых галовак

З ЖЫДОЎСКІХ ЭМІГРАНТАЎ

Прэпарат "Экстазі" у 1982 годзе сынтэзаваў у ЗША А.Шульгін сын жыдоўскіх эмігрантаў з Расеі. Але лёс згуляў з навукоўцам злы жарт: "Экстазі", які ён стварыў у якасьці лекаў, стаў сродкам які калечыць чалавека — наркотыкам.

Тэхналягічная схема А.Шульгіна захоўвалася ў глыбокай таямніцы. Але былі артыкулы, якія ён друкаваў у амэрыканскіх навуковых часопісах.

Зараз "татулька" "Экстазі" сядзіць у вязьніцы за ўхіленьне ад уплаты падаткаў. Таму зьявіліся "піраты" якія спрабуюць скапіяваць тэхналёгію вытворчасьці "пігулак шчасьця" Але не ва ўсіх гэта атрымліваецца.

Са словаў некаторых спэцыялістаў, сьцьвярджаньне, што "Экстазі" можна зрабіць на кухне ці ў гаражы — абсурд На самой справе гэта жорсткія ўмовы тэхналёгіі. Самаробныя наркотыкі — сурагат, толькі паскарае у наркаманаў над звычай цяжкія наступствы якія часта вядуць да сьмерці.

Пра ідэю сынтэзаваць "Экстазі" у Літве ведалі адзінкі. І як усе зьдзівіліся, калі гэта зрабілі за паўтары гады, а якасьць прэпарату была пацьверджаная самым дакладным мэтадам сучаснага аналізу — фотаэлектракалярымэтрычным

ЗАБІВАЕ САМЫХ МАЛАДЫХ

Са словаў знаўцаў, "Экстазі" вельмі хутка падточвае арганізм чалавека, парушае ягоную псыхіку.

Тыя, хто прымаюць "Экстазі і джэф" могуць працягнуць ад 2 да 5 гадоў у той час як наркаманы што ўжываюць прэпараты опію — 10-15. Апіяты прысыпляюць арганізм чалавека, а амфэтаміны — выклікаюць агрэсію.

Апіяты ("кайф" "старых" — хіпі) — дробязь у параўнаньні з "Экстазі"

Наркаманы ранейшага пакаленьня дажывалі, прынамсі, да 40 гадоў а "Экстазі" падрубае маладых.

З дома ў цэнтры Коўна пігулкі шчасьця" трапляюць на дыскатэкі двух самых буйных гарадоў краіны, дзе зьбіраюцца падлеткі і моладзь

Для 14-15 гадовых наведвальнікаў віленскага "Эльдарада, клюбу "Наса цэнтра забаваў "Макс" "Экстазі" становіцца допінгам. Наркаманія маладзее, і ня толькі ў Літве. І што насьцяражвае — моладзь аддае перавагу сынтэтычным амфэтамінам

У "ЭКСТАЗІ" СВАЕ САКРЭТЫ

"Экстазі" дзейнічае па-рознаму на тых хто ўжывае яго. У тых, каму за 20, хто сфармаваўся як асоба са словаў знаўцаў, гэты прэпарат можа выклікаць ташнату калі ласьць. Заўважана што людзі пасьля 25 гадоў гэты наркотык ужываюць рэдка.

У падлеткаў, якія яшчэ не сфармаваліся як асоба, "Экстазі" узбуджае фізычную псыхічную і сэксуальную актыўнасьць, эмацыйныя перажываньні. "Пігулкі шчасьця" здымаюць комплексы — не застаецца ніякіх бар'ераў, межаў.

Менавіта гэтым "Экстазі" прывабліваепадлеткаў.

Асабліва Экстазі" узьдзейнічае на эрагенныя зоны ў дзяўчат. Пасьля "Экстазі" — усё проста, зьнікаюць бар'еры ў інтымнай сфэры і самкантроль

Праз 5-6 гадзінаў, калі праходзіць эйфарыя, выкліканая "пігулкай шчасьця", чалавека прашыбае халодны пот, у яго пачынаюць дрыжаць рукі. Патрабуецца новая доза, ужо большая за папярэднюю Але гэта можа выклікаць галюцынацыі, накат падштурхнуць да самазабойства

Як піша нямецкі часопіс "Фокус", усе часьцей даводзіцца сутыкацца зь нейкім таямнічым хваробамі і нават сьмяротнымі выпадкамі, якія зьвязаныя з ужываньнем "Экстазі

Пігулкі шчасьця" могуць, напрыклад прывесьці да паралюшу. У крыві зьмяншаецца колькасьць гемаглябіну — чалавек можа памерці белай, у прамым сэнсе гэтага слова, сьмерцю

Паводле неафіцыйных зьвестак, у Літве зараз каля 20 тысячаў наркаманаў. А ў выпадку шырокага распаўсюджаньня "Экстазі" іхні лік можа павялічыцца да 40 тысячаў

"ПАВЕТРАНЫ ШАР"

Будучае наркаманіі — не за гера нам і какаінам, а за сынтэтычнымі наркотыкамі, — сказаў знаўца міжнароднай праграмы ААН па кантролі за наркотыкамі Бэрнард Лярой на сэмінары, які адбыўся ў Вільні гэтай вясной. —Крымінальныя групоўкі маюць яўную цікавасьць да сынтэтычных наркотыкаў, бачаць у іх рынкавую пэрспэктыву. Увесь час будуць выпрацоўвацца новыя, і гадоў праз дзесяць іхняя колькасьць дасягне тысячы. Балтыцкім краінам пагражае сур'ёзная небясьпека".

Са словаў знаўцы, сынтэтычныя наркотыкі танныя і вельмі зручныя: праглынуў таблетку — і ніякіх праблемаў, ня трэба шпрыцоў. Яны не выклікаюць фізычнай залежнасьці. Адмоўны вынік іхняга ўжываньня — праява агрэсіўнасьці і інвалíднасьць альбо сьмерць праз 5-8 гадоў.

Б.Лярой лічыць, што Літва не выпадкова прыцягнула да сябе ўвагу гандляроў наркотыкаў. Тут добра разьвітая хімічная прамысловасьць.

Многія спэцыялісты гэтай галіны засталіся бяз працы, таму з'яўляюцца прапановы новай "біржы працы"

Экспэрты міжнароднай праграмы ААН па кантролі за наркотыкамі сьцьвярджаюць што ў 1991-1994 гадах у сьвеце ў тры разы узрасла сьмяротнасьць ад сынтэтычных наркотыкаў. Яны сталі глябальнай праблемай, дзейнічаючы у прынцыпе паветранага шара які прызямляецца ў той геаграфічнай кропцы зямлі, дзе ёсьць брак у законах. Зараз гэты "паветраны шар" — у Літве.

Пакуль няма законаў пра кантроль за наркотыкамі, пакуль Сойм Літвы не ратыфікаваў канвэнцыю ААН, падпісаную ў 1988 годзе пра незаконны кантроль за наркатычнымі і псыхатропнымі рэчывамі, пакуль ёсьць "шчыліны" ў крымінальным кодэксе тут могуць знайсьці прытулак ня толькі дробная рыбка", але і акулы, якія займаюцца кантрабандай наркотыкаў

Лайма Жэмулене

КАСТРЫЧНІЦКІ ПЕРАВАРОТ: ПОГЛЯД ПРАЗ ГАДЫ

На галоўнае пытаньне — пра тое, чаму бальшавікі перамаглі ў барацьбе за ўладу ў Петраградзе ў 1917 годзе, дагэтуль не існуе адназначнага адказу

Сеньня ўсё большая колькасьць гісторыкаў прыходзіць да высновы, што ў кастрычніку 1917 году ў Расеі перамог не сацыялістычны, і сацыяльны пераварот усходняга тыпу. Ён быў накіраваны супраць азіяцкага фэадалізму, які зжыў сябе, і, разам з тым, супраць разьвіцьця прыватнаўласьніцкага капіталізму. Гэты пераварот быў закліканы расчысьціць шлях для грамадзкай вытворчасьці на аснове дзяржаўнай маёмасьці.

Бальшавікі, памыляючыся ў вызначэньні характару перавароту, не змаглі вылучыць тактычныя і стратэгічныя ўстаноўкі, якія супадалі б з патрабаваньнямі перавароту азіяцкага тыпу.

Краіне пагражаў усеагульны крывавы анархісцкі разгул, які вёў яе да немінучага распаду. Бальшавікі здолелі накіраваць рэвалюцыйную энэргію ў патрэбнае рэчышча, надалі барацьбе арганізаваны характар. Інакш пераварот мог бы пачацца стыхійна, незалежна ад бальшавікоў альбо якой-небудзь іншай партыі.

Што тычыцца сацыялістычных мэтаў (ажыцьцяўленьне дэмакратычных пераўтварэньняў грамадзтва, пашырэньне правоў і свабодаў грамадзянаў, вырашэньне сацыяльных праблемаў), то яны не былі дасягнутыя. Адразу ж пасьля рэвалюцыі краіна сутыкнулася з найцяжэйшымі праблемамі: як ва ўмовах адсталай эканомікі і адсутнасьці рэвалюцыйнай сытуацыі на Захадзе будаваць сацыялістычнае грамадзтва?

Разьлік на мірнае разьвіцьцё рэвалюцыі, на фармаваньне рыкавых адносінаў быў сарваны пачаткам грамадзянскай вайны. У краіне была ўведзеная палітыка ваеннага камунізму. Пачаўся белы і чырвоны тэрор. Усё іншо наводле законаў ваеннага часу і клясавай барацьбы.

Зрэшты, у асэнсаваньні адносінаў паміж клясамі была дапушчана велізарная памылка, а дакладней, злачынства. Зь бясспрэчнага факту, што кляса, якая налічвала 10 працэнтаў насельніцтва, была менш арганізаванай і ўзброенай, бальшавікі зрабілі выснову, што яна можа ня столькі эканамічнымі, колькі пазаэканамічнымі мэтадамі далучыць да сацыялізму клясу, якая ахоплівала 80 працэнтаў насельніцтва. Дасягалася гэта перш за ўсё прымусам. На харчразьвёрстку у 1918-19 гадах пасылалі ўзброеныя атрады, колькасьць якіх дасягала 60 тысячаў чалавек. Калі ў пачатку 1921 году прыняў пагрозьлівыя памеры антонаўскі мяцеж у Тамбоўскай губэрні, то ў адзін гэты рэгіён былі кінутыя войскі ў колькасьці 50 тысячаў салдатаў і кавалерыстаў. М.Тухачэўскі, які камандаваў ліквідацыяй мецяжу, з вайсковай дакладнасьцю назваў апэрацыю «цэлай вайной» і «ня з бандамі, а з усім мясцовым насельніцтвам», пры канчатковай мэце «поўнай акупацыі паўсталага раёну».

Тут адбылася новая памылка, зьвязаная зь першай: замест таго, каб пачаць з разьдзяржаўленьня і перадачы маёмасьці калектывам, пераварот, адкінуўшы гэтыя першапачатковыя намеры, пайшоў па лініі татальнага адзяржаўленьня. Прасьвятленьне прыйшло позна — справа дайшла да Кранштату і паўстаньня Антонава і Булак-Булаховіча...

У кожнага народу свой шлях. Расея некалі намацвала яго, нарошчвала духоўную моц і скарачала адставаньне ад заходніх краінаў у эканамічным разьвіцьці. І хоць яна адставала ў агульнай граматнасьці насельніцтва ад перадавых краінаў, затое ў яе быў багаты «банк ідэяў».

За гады перавароту, грамадзянскай вайны, за гады барацьбы з «ворагамі народа» і іншадумствам яна пазбавілася свайго генафонду, інтэлектуальных сілаў нацыі. Няма каму стала генэраваць ідэі і накіроўваць іх на зададзеную мэту. У гэтым — адна з прычынаў усеагульнага крызысу, які паразіў краіну.

Мне здаецца ў прынцыпе няслушным уяўленьне пра гістарычны шлях як тунэль, у якім, аднойчы ўступіўшы ў яго, можна рухацца толькі ў зададзеным кірунку. Да таго ж заўсёды адвольныя і пункты ўваходу ў тунэль, якія указваюцца тымі альбо іншымі аўтарамі. Калі паверыць, што менавіта пераварот зь непазьбежнасьцю прывёў да наступных злачынстваў супраць народу, то застаецца пытаньне, а дзе пачатак таго тунэлю, які прывёў краіну да кастрычніка 1917-га?

Можа быць, у расстрэлах і шыбеніцах 1905-га? А што прывяло да першай расейскай рэвалюцыі — вызваленьне сялянаў безь зямлі у 1861-м? Але чаму тады не прыгадаць запрыгоньваньне сялянаў у XVI ст.? Пры тунэльнай філязофіі гісторыі вінаватым у сталінскіх злачынствах можна зрабіць і Барыса Гадунова...

На самой справе гістарычны шлях пралягае не у тунэлі, а (працягнем вобразны падыход) у лесе зь вялікай колькасьцю пераплеценых сьцяжынаў. У жывой гісторыі сытуацыя выбару паўтараецца шматразова. Ня раз зьяўляецца магчымасьць сысьці зь любой сцежкі, бывае і магчымасьць вярнуцца да яе.

Пасьля кастрычніцкага перавароту, у першыя ж дні, быў выбар паміж курсам Леніна на аднапартыйнасьць і пазыцыяй Нагіна, Мілюціна і іншых бальшавікоў, якія выйшлі зь першага ўраду ў знак пратэсту супраць манапольнага становішча партыі. Проста на парозе сацыялізму быццам бы мільганула яго чалавечае абліччa. Мільганула і зьнікла. Пасьля быў выбар паміж Берасьцейскім мірам і вайной зь Нямеччынай, які пры іншым выйсьці цалкам мог ператварыць пераварот у кароткатэрміновы эпізод. Потым быў выбар паміж працягам харчразьвёрсткі і харчпадаткам. Затым — паміж сталінскім раскулачваньнем і бухарынскім «урастаньнем» селяніна ў сацыялізм.

Не на кожным скрыжаваньні рабілася памылка — інакш як бы праіснаваў гэты лад больш за семдзесят гадоў? Трагічны ў цэлым шлях ня быў фатальна перадвызначаны ў кастрычніку 1917-га. Трагедыю разыгралі пакаленьні.

Як і ўсяляекі пераварот, кастрычнік 1917 года кагосьці ўзьвялічыў, а большасьцю ахвяраваў. Перавароты, напэўна, іншымі не бываюць. Мы ніколі ня здолеем дакладна сказаць, якім быў бы лёс Расеі, калі б не перамаглі бальшавікі, а яшчэ раней ня рухнуў царызм. Тут прастора для гіпотэзаў і, нават лапіку няма для ісьціны.

Але зь любога гледзішча (гістарычнага, тэарэтычнага, маральнага) нанесеныя вялізныя страты, перадумовы якіх былі закладзеныя ў самім перавароце — над рыў стваральнага патэнцыялу сялянства і інтэлігенцыі. Не выклікае сумневу і згубнасьць ператварэньня дзяржавы ў гіганцкага манапаліста, уладальніка грамадзтва; гэты працэс пачаўся неўзабаве пасьля перавароту.

Вялізныя страты абавязваюць вынесьці такі самы значны ўрок. Ён паказвае, што самыя цяжкія выпрабаваньні выпадаюць на долю краінаў і народаў, калі яны аказваюцца выпрабавальным палігонам для разумовых схемаў, сканструяваных асобнымі людзьмі альбо групамі асобаў. Як зрабіць так, каб схема, якая выразна праглядаецца да перавароту, скарэктавала сама сябе ня толькі для праектантаў, але і для самых шырокіх народных масаў?

Ігар Кузьняцоў

Слова дакумэнтам і сьведкам:

Са зводкі штаба Глаузапа аб настроі частак Заходняга фронту. 22 кастрычніка 1917 г

Нэрвовы настрой нарастае з кожным днём. Парушэньні дысцыпліны захопліваюць новыя часткі. Прапаганда бальшавікоў пераважае і карыстаецца посьпехам. Масы спрашчаюць лёзунгі, робячы зь іх раз бурапьныя высновы без усялякай думкі пра ўплыў таго, што яны робяць на лёс Радзімы і рэвалюцыі. Есьць пагрозы паисьці з фронту, калі мір ня будзе заключаны ў бліжэйшы час.

4-я, 5-я і 16-я роты грэнадэрскага палка адмовіліся заняць указаную пазыцыю. 712-ы полк заявіў, што ён ня можа быць расфармаваны да Ўстаноўчага сходу. 11-ы, 25-ы Туркестанскія палкі адмовіліся зьмяняцца.

Пры ад'езьдзе салдатамі 97-га і 98-га палкоў на ст. Лунінец разгромлены корпусны суд. 20-га палка палкавы камітэт дазволіў самавольную рэквізыцыю. Заслаўскага палка 1-я рота не дапусьціла зрабіць допыт членам палкавога камітэту... П'яны наўтоп салдат абозу армейскага кіраўніцтва зьбіў прачак і члена армейскага камітэту Ўсерасейскага Саюзу гарадоў. Сяляне і салдаты у в. Ярэмічы разьбілі тытунёвыя лаўкі.

Нянавісьць да афіцэраў расьце у зьвязку з пашырэньнем перакананьня, што афіцэры зацягваюць вайну.

Камцарзаг Жданаў

З данясеньня часовы выканаўца абавязкаў галоўнага камандзіра Заходняга фронту генэрал М.Малявін — у Стаўку генэралу Н.Духоніну. 28 кастрычніка 1917 г.

...У арміях поўны развал. Уся ўлада паступова пераходзіць у рукі бальшавікоў, камандны склад ня ведае, чые ж распараджэньні належыць выконваць. Фронт у цяперашні час зусім не баяздольны, распараджэньні аб перамяшчэньні войскаў, якія паходзяць ад майго імя, альбо затрымліваюцца, альбо не выконваюцца, штаб фронту працуе пад кантролем рэвалюцыйнага камітэту, усё непажаданае гэтаму камітэту не прапускаецца.

Вар'яцкая авантура

Зь перадавога артыкулу газэты «Известия» за 25 кастрычніка 1917 г

Бальшавіцкае паўстаньне, супраць якога мы ўвесь час засьцерагалі, як супраць жахлівага для краіны выпрабаваньня, арганізуецца і пачынаецца... Бальшавікі, якія абапіраюцца на шырока разьлітае незадавальненьне і на ня менш шырокую несьвядомасьць салдацкіх і рабочых масаў, ня могуць даць таго, што абяцаюць: хлеба, міру, зямлі...

Але самае жахлівае — гэта тое, што бальшавіцкае паўстаньне пры любым посьпеху павяло б да цэлага шэрагу грамадзянскіх воінаў.

Kalandar

4 listapada

U hety dzień... u 1794 h. zahinuu kiraunik paŭstańnia suprać maskoŭskaje akupacyi Biełarusi Jakub Jasinski; u 1922 h. anhielski archeolah Howard Carter adkryŭ schody da hrabnicy ehipieckaha faraona Tutanchamona

5 listapada

U hety dzień... u 1937 h. u Varšavie pamior paet Balasłaŭ Leśmian, kniha vieršaŭ jakoha pa-biełarusku vyjšla ŭ vydaviectve «Našaj Nivy» u 1994 h

Naradziłasia francuskaja mastačka Nadzieja Chadasievič-Leže (1904-83) jakaja pachodziła ž Biełarusi

6 listapada

Naradzilisia: Adolphe Sax (1814-94), belhijski vynachodnik saksafonu; biełaruski palityk i pedahoh Radasłaŭ Astroŭski (1887-1976).

U 1893 h. skončyu žyccio samahubstvam rasiejski kampazytar Piotr Čajkoŭski

7 listapada

U hety dzień... u 1917 h. u Rasieji adbyŭsia kastryčnicki pieravarot

Naradzilisia: francuskaja vučonaja Maryja Składoŭskaja-Curie (1867-1934); Leŭ Trocki (1879-1940), narodny kamisar zamiežnych spravaŭ u pieršym balšavickim uradzie; biełaruski paet Michaś Čarot (1896-1938); francuski piśmieńnik Albert Camus (1913-60); laŭreat litaraturnaj Nobeleŭskaj premii 1957 h., były šef KGB RB Uładzimier Jahoraŭ (1939)

8 listapada

U hety dzień... u 1923 h. Hitler upieršyniu sprabavaŭ zachapić uładu. Puč pačaŭsia na mitynhu ŭ miunchenskim bary («piŭny puč»), ale nia ŭdaŭsia, a Hitler apynuŭsia ŭ turmie, dzie pradyktavaŭ Rudolfu Hessu svajo palityčnaje kreda — Mein Kampf.

Naradziłasia amerykanskaja piśmieńnica Margaret Mitchell (1900-49)

9 listapada

U hety dzień... u 1989 h. novastvorany ŭrad GDR adkryŭ miažu na Zachad, pačałosia razbureńnie berlinskaha muru.

Naradziŭsia rasiejski piśmieńnik Ivan Turhienieŭ (1818-83).

Pamior heneral Charles de Gaulle, pieršy prezydent piataj francuskaj respubliki ŭ 1970 h.

10 listapada

U hety dzień... naradzilisia: Marcin Luter (1483-1546), niamiecki dramaturh i paet Johann Cristoph Friedrich von Schiller (1759-1805); anhielski aŭtar piesień i libreta rock-opery «Jesus Christ Superstar» Tim Rice (1944)

ВЫХАД У ГОРАД

ВІНО АД НАВАДВОРСКАЙ

Андранік Антанян

На дарозе на Галоўпаштамт, на праспэкце Гедыміна (які вельмі паважаная газэта «Имя» чамусьці рэгулярна абзывае «проспектом Гедеминю») насупраць помніка слыннай літоўскай пісьменьніцы Жэмайтэ-Жэмайцене, я сутыкнуўся носам у нос са знаёмым журналістам. Ён бег з адпае прэзэнтацыі на другую і быў, відаць, у добрым гуморы, бо падараваў мне запальнічку і цэлы пачак беларускіх газэт, а сам падаўся кудысьці далей, не раўнуючы як той трус з «Алісы ў краіне цудаў».

У маёй Галоўпаштамтаўскай паштовай скрыні валяліся паштоўкі з усіх магчымых віленскіх бібліятэк, у якіх мілыя бібліятэкаркі ў грозных танах паведамлялі, што калі я злам узяты тры гады таму ў гарадзкой бібліятэцы імя Адама Міцкевіча падручнік нямецкай граматыкі, то мне давядзецца плаціць штраф. А ў апошняй паштоўцы нават пагражалі судом. І яшчэ быў адзін ліст з Масквы, ад знаёмай драматургесы (а мо драматургіні?) Вольгі Мухінай, які, паводле штэмпеля, прабадзяўся ў маёй скрынцы больш за месяц.

Паштоўкі бязьлітасна рвуцца на чатыры часткі й выкідаюцца ў бліжэйшую сьметніцу. Ліст кладзецца ў кішэню курткі. Паляжаў нячытаным месяц — перачакае яшчэ пару гадзінаў.

Выходжу на вуліцу й з палёгкаю усьведамляю, што справы, запланаваныя на сёньня, усе пасьпяхова перароблены.

Зайшоў у кавярню, што у кінатэатры «Вільнюс». Узяў кавы. Дастаў з заплечніка газэты. У «Белорусской газете» гутарка з Валерыяй Навадворскай. Вялікай аматаркай мітынговай дэмакратыі й сэпаратызму любога разьліву. Высьвятляецца, што нарадзілася яна ў Баранавічах, па-беларуску размаўляе, «Пагоню» сьпявае.

У жыцьці я бачыў Навадворскую толькі аднойчы. 1 сьнежня 1991 году. Сустрэча наша была надта ужо абсурднай, канфузьлівай і недарэчнай. Ускосна яна зьвіязаная і з маскоўскай драматургесай Вольгай, чый ліст я дастаў з паштовай скрынкі дзесяць хвілінаў таму.

Чатыры гады назад я меў шчасьце вучыцца у Маскве ў літаратурным інстытуце. Інстытут знаходзіўся ў шыкоўна апісаным Міхаілам Булгакавым «доме Грыбаедава» на Цьвярскім бульвары. На самой справе гэты шыкоўны маскоўскі асабняк ня меў ніякага дачыненьня да расейскага драматурга, бязьлітасна парэзанага крывымі пэрсідзкімі шаблямі.

У інстытут мы маглі трапіць толькі двума шляхамі: альбо праз самы Цьвярскі бульвар, альбо праз Вялікую Бронную, якая дарэчы, шматкроць меншая за Малую Бронную. На гэтай самай Вялікай Броннай вуліцы знаходзілася некалі самая багемная кавярня ў горадзе Маскве. Наведнікі называлі яе «Стекляшкой». Публіка зьбіралася там самая што ні ёсьць разнастайная. Фігуравалі нават сякія-такія асобы, чые прозьвішчы не сыходзілі з газэтных палосаў. Але асноўную вагу складалі студэнты Літінстытуту, якія мелі за добрую манеру сыходзіць зь сярэдзіны якой-небудзь занудлівай лекцыі пра тэорыю мастацкага перакладу на каву.

Бармэнка цётка Люба студэнтаў любіла, заўсёды варыла моцную каву па-турэцку й запякала ў духоўцы фантастычна смачныя канапкі з сырам і паляндвіцаю. І гэта пры тым, што ў Маскве тады было проста галадна. А шостай раніцы каля булачных выбудоўваліся чэргі па хлеб. Цукар, алькаголь і тытунь былі па картках.

Карціны той зімы непрыемныя й ліпкія, як крупа «артэк», звараная бяз цукру, солі й масла. Жорсткія да крыві бойкі мілых маскоўскіх бабулек у чарзе па малако, кралзёж рандоляў на кухнях нашага інтэрнату, гульня у покера, дзе на кон ставіліся талёны на гарэлку, прагнае пажыраньне маскоўскай кінаэлітай салатаў і вінаграду на прэзэнтацыі фільма Жана-Люка Гадара «Нямеччына. Зімовая казка», паскудны смак другі раз заваранай кавы, якую давялося піць у гасьцях у аднаго актора. І ў гэтым брудна-шэрым, страшным горадзе была прыстойная кавярня дзе заўсёды можна было атрымаць філіжанку гарачай кавы, смачную канапку, залітую расплаўленым сырам, купіць пачак цыгарэт і выпіць колькі хочаш гарэлкі, а часам нават каньяку. У гэтай кавярні мы, студэнты, і пакідалі свае стыпэндыі.

Дык вось, 1 сьнежня 1991 году я выпадкова аказаўся ўдзельнікам сьвяткаваньня дня нараджэньня маскоўскай драматургесы Вольгі Мухінай. Сьвята было сьціплым. Удзельнічала пяць чалавек: сама прычына сьвята, маскоўскі бурат зь вясёлым прозьвішчам Чамаладанаў, які пісаў дрэнныя вершы й ніколі гэтага не адмаўляў, ружовашчокі літаратурны крытык Шура Окунеў, Алег Бяспалаў, якога ў вочы й за вочы ўсе мае знаёмыя называлі Сапраўдным Майстрам Псыхадэліі, ды я. Пачалося ўсё з таго, што ўсе раптам адмовіліся піць гарэлку. А віно можна было тады купіць ля помніка Пушкіну у бабулек з торбачкамі, што праводзілі мінакоў прыгаворкай: «Винчик, винчик, водочка, покупаем, молодые люди».

Кінулі жэрабя. Ламаную запалку выцягнуў Шура Окунеў. Але ён матнуў сваімі кудзерамі й адмовіўся йсьці, маўляў, напярэдадні падзягнуў нагу. Другі раз ламаную выцягнуў Чаманаданаў, але ён ужо быў на добрым падпітку, а ў накураным памяшканьні яго й зусім разьвезла. Мяне гэта развесяліла, я ўзяў грошы й пайшоў па віно сам.

Да помніка Пушкіну ад кавярні было зусім недалёка. Мэтраў трыста, а мо й меней. Трэба было прайсьці міма чаргі ля Макдональдса, нырнуць у падземны пераход і вынырнуць. Хвілінаў пяць хады ня болей.

Бабулькі з торбачкамі, якія заўсёды існавалі тут у множным ліку, гэтым вечарам былі прадстаўлены толькі адной асобай. Нізкая, мажная кабета ў цемнавасьценькім палітоне з футровым каўняром, тоўстыя акуляры на посе. На грудзях у яе вісеў зроблены з кавалка ватману плакацік. Што на ім напісана — не разабраць, бо ўжо цёмна. У той год кабеты, што фарцавалі ў маскоўскіх падземных пераходах, на станцыях мэтро й каля нязвыкла пустых гастраномаў, звычайна вешалі сабе на жывот сьпіс свaіх тавараў разам з коштамі.

Згодна з маскоўскім этыкетам я зьвярнуўся да кабеты: «Мать, а у Вас винца не найдется?» У адказ маўчаньне. «Так Вы продаете вино, или как?» Пасьля доўгай паўзы: «Я Валерия Новодворская! А вино Вы можете купить возле Елисеевского». І адвярнулася ад мяне. Віно я сапраўды купіў ля Елісееўскага, і мы яго ўсёй кампаніяй дружна выпілі. А назаўтра з газэт я даведаўся, што Валерыя Навадворская праводзіла пікет у падтрымку незалежнасьці ці то Татарыі, ці то Башкірыі. Зрэшты якая розьніца за чыю незалежнасьць ты змагаесься?

Толькі мяне займае іншае. Што б я рабіў у гэтую хвіліну, калі б пайшоў на Галоўпаштамт на іншым баку праспэкта?

Севярын Квяткоўскі

АДНА ЦЫГАРЭТА

Цыгарэтны дым павольна танчыць у тахт мэлянхалічнай мэлёдыі, што запаўняе прастору ўтульнага пакою. Адчуваньне матэрыяльнасьці музыкі. Здаецца, нібы ты сам нараджаеш яе ў сваім нутры, і нясьпешна выпускаеш на волю. Струменьчыкі ўдзячна агортваюць цябе, пасьля рассыпаюцца плаўка віруюць у разьвітальным танцы, і зьнікаюць у чорным прастакутніку расчыненага вакна. Ноч. Сьвежае дажджавое паветра ймкнецца расьцярушыць, скрасьці адзінае што маеш — тытунёвую музыку. Яно як чыясьці цьвярозы халодны кашмар, які пракраўся ў карункавыя сьветлыя мроі. Яно нібы прывід, які, заблукаўшы ў дажджы, памыліўся вакном. Цяпер ён тут, у пакоі, апанаваным мэлянхалічнай мэлёдыяй. Прывід завяз у тытунёвых струмянях, ён перaляканы й разгублены. «Ня бойся, братка, не сьпяшайся ўцякаць: тытунь зробіць табе новыя абрысы і магчымасьць з прывіда ты ператворысься ва ўласную дзіўную мрою. Паслухай гэтую мэлёдыю, дакраніся да яе». Прапягваеш руку, але трапляеш у мокрую Ноч, у чыйсьці цьвярозы халодны сон. У прастору, якая кліча цябе, як дно безданi кліча канатаходца. У сон, у якім ты ніколі не дапяшн да дна. Сон, зь якога ўцякаюць народжаныя ім пачвары — здані Абыякавасьці. Яны як матылі тятуць

ЛІСТАПАДАЎСКІЯ РЭФЛЕКСІІ

З лістапада беларусы ў Нью Ёрку адзначылі 75-я ўгодкі паэта Янкі Юхнаўца

Шырачэзная дошка бара пах не ўсімі магчымымі напоямі. Уладкаваўшыся на высокім зэдліку, сачу за жуком, што вандруе па салодка-горка-духмяных плямах... У пошуках чаго? «Жук, жук, дзе твой дом?»

Віктар Гюго назваў выгнаньне жыцьцём. Авідый — сьмерцю. Напэўна, Янка Юхнавец можа назваць эміграцыю жыцьцём пасьля сьмерці. Бо выгнаньне ня стала для яго ня ўдачай, паразай, а — магчымасьцю, дала шанец. І ён апынуўся паміж двума сьветамі, атрымаўшы магчымасьць «перакладаць», тлумачыць адзін сьвет другому, параўноўваць адну рэальнасьць з другой. Эміграцыя сталася нараджэньнем паэта. Гэтак і галоўная тэма літаратуры пачалася з Адамавага выгнаньня з Раю. З таго часу пісьменьнікі пішуць або пра Стварэньне, або пра Вяртаньне. Усё іншае — варыянты.

У чаканьні дзядзькі Янкі замаўляю бутэльку ягонага любімага чорнага «Портэру» і паводле сыстэмы Картасара (так сама ж эмігрант: Брусэль-Аргентына-Парыж) гартаю старонкі драматычнага начырку «Адам і Ева», твора, які ён даўно напісаў, але толькі цяпер выраныў надрукаваць:

Хачу нячору нашую пакінуць,
у новую перасяліцца...

Літаратура эміграцыі можа быць аўтабіяграфіяй, мэтафарай, тэмай, але яна заўсёды патэнцыяльны эпас. Гамэр, Вяргілій, Дантэ... Ці ня эпас вершык выгнанца Багрыма?

За вітражным акенцам невялікага польскага бара ідзе дождж. Мажная жанчынка перапранае і

НОВЫ ДОСЬВЕД

Цяпер амаль кожны з нас жыве ў трох прасторах, паводле трох культурных вымярэньняў. Прастора беларускага клясычнага каляніяльнага аўтарытарызму, прастора расейскай алігархічнай дэмакратыі зь яе тэлекультурай і прастора эўрапейскага постіндустрыйнага грамадзтва зь ягоным дрэйфам да ўнівэрсалізму і касмапалітызму. Мы танцуем пад музыку гэтага трыо. Мы думаем паводле трох модаў; мы мысьлім у трох сыстэмах каардынат.

Аўтарытарызм спараджае клясычныя выклікі і правакуе клясычныя адказы культуры на іх: Адамовіч, Новае Неба, Гумянюк, Аркуш, «Візыт дамы», вусатыя пудзілы змагарныя тэмы ў літаратуры, любоў да гістарычнага эзопава мова паэтаў пакаленьня Гілевіча, — гэта ня новыя для сусьветнай культуры практыкі.

Маскоўская прастора прышчапляе нам свае практыкі і далягляд. Дакрананьне да Масквы ў некаторых выклікае лёгкую роспач і зайздасьць. Больш пранізьліва адчуваецца наша закутасьць у кайданы велізарнай, беручы ў глябальным маштабе, цывілізацыйнай адсталасьці, памножанай на наступствы акупацыі і навязанага абязмоўліваньня. Мы заціснутыя ў рамкі малюпасенькага — лічаныя дзясяткі тысячаў — кола спажыўцоў культуры, у якім ці не палова — не беларусы.

А там, у трэцяй прасторы, стомленасьць постмадэрнізму. І мы сузіраем гэты... шукаю вобраз... росквіт кулінарыі як унівэрсальнага, агульназразумелага мастацтва і вартасьці. Мы сузіраем Грынуэя і Бэсона, як сузіраем нацюрморты галяндцаў... Плён сузіраньня нечага іншага у эўрапейскім культурным полі можна знайсьці на старонках «Ксэраксу беларускага» і на тазіку «Бум-Бам-Літу». Хоць авангард, далібог мусіць быць спробай уцікнуць формаў, а ня зьместу

Хіба што Пінігін на шляху ад Купалавых «Тутэйшых» да «Ідыліі» і «Візыту дамы» дае прыклад сынтэзу трох вымярэньняў. Ды яшчэ лепшыя паэты на-ранейшаму жывуць у лепшым сьвеце.

Агульная раздратаванасьць паміж трыма сыстэмамі каарынат запавольвае акрэсьленьне плыняў у сучаснай беларускай культуры. Адцьвілі «Тутэйшыя», і наступіла пустка дасягнутай мэты, дасягнутай незалежнасьці. Усе думалі: за паэзіяй эпохі зьменаў прыйдзе проза. Але замест прозы прыйшло нейкае празаічнае зьдзіўленьне перад новым невядомым. Якое азначэньне можна даць пэрыяду дзевяностых, сярэдзіны дзевяностых?

Перакладаючы Мантэня, я доўга вагаўся зь перадачай назвы ягонага твору: les Essais. Эсэ? Спробы? Нарысы? Вопыты? Досьведы? Нарэшце мне здалося, што пэсымізм Мантэня найперш будзе перададзены жартаўлівым, але пэсымістычным сынтаксысам мудрага вясковага заходнебеларускага настаўніка. Мудрасьць досьведу

на сьвятло самотнага цыгарэтнага агеньчыка...

Ноч прагне цябе. Танец струмянёў губляе павольнасьць. Яны шалёна кружляюць, набіраючы хуткасьць, брызгаюць дажджом, што зьнянацку ўварваўся ў пакой. Але што можа зрабіць Ноч, калі ў тваіх руках цыгарэта? Хіба забраць сабе попел. Ноч крычыць, але, замест чаканага крыку роспачы, крыку болю, яна глынае недапалак. А разам — астатнія пасмы дыму й сваіго гароту-прывіда, якія кінуліся сьледам за дугой агеньчыка.

Вось і ўсё ... зачыніў в...кно

Ў ЧАКАНЬНІ ЮХНАЎЦА

прапануе нейкі новы гатунак «Сакратас». Калі прыйдзе дзядзька Янка, ён будзе незадаволены і мы пойдзем шукаць іншае месца, дзе менш гамонкі, дзе ў свой дзень нараджэньня, калі сустракаесься зь лічбай 75, можаш не адмаўляцца ад традыцыяў (Вось цікавае пытаньне — традыцыі. Пісьменьнік-эмігрант піша ў традыцыі той краіны, якую пакінуў, ці той, што дала прытулак? Можна сфармуляваць і па-іншаму: пішуць для тых, хто застаўся ТАМ, ці для іншых? І наколькі розьніцца сытуацыя пісьменьніка, што пачаў пісаць за мяжой, ад сытуацыі таго, які насьпеў сказаць слова да выгнаньня? Юхнавец ці не адзіны, хто распачаў тварыць па-за Беларусяй). Але я не пасьпяваю дадумаць розьніцу паміж адарванасьцю і крокам наперад, бо заўважаю, што бармэнка, незадаволеная маім маўчаньнем, тужліва шукае ангельскі варыянт ветлівасьці «Сакратас» ці «Сакрапас».

Сакрат у Амэрыцы. Яму ж прапаноўвалі эміграцыю як альтэрнатыву сьмерці. Не згадзіўся. Мне бачыцца ў гэтым не прывва філязофіі, а ўсьведамленьне, што ўсё зроблена, ты ўжо стары, пакідаеш адно жонку-пілаўніцу ды сына-распусту. Такой бяды! Мабыць, для ІХ сьмерць гэтаксама небясьпечная як тваё жыцьцё, калі — у Атэнах, у тваім каханым горадзе. На-за ім, лічаць ЯНЫ, ампутаваўшы сябе, ты больш не Сакрат. А ты папросту скончыў свае справы.

Аднак, прабачце, і гэта піва не Сакрат. Такое ж вадзяністае, як дождж за вакном, што, мабыць, трымае недзе дзядзьку Янку на поплаве, а наўкола паўсюль вада, і табе застаецца ўяўляць сябе Ноем, што падаўся ў выгнаньне.

Я замаўляю кактэйль «Манхэтэн» і доўга тлумачу, што 2/3 мусіць быць віскі і толькі 1/3 вэрмуту, да таго ж салодкага, што трэба абавязкова патрэсьці ў адмысловым начыньні, якога тут, натуральна, няма, і толькі пасьля ўкідваць цытрыну зь лёдам. Паклаўшы чатыры даляры (за нязвыклыя ды непрыемныя клопаты) адыходжу з келіхам у руках і няўклюдна зацісутай паміж ног тэчкай у залю, дзе можна сесьці з выгодамі, раскладаючы паперы на зялёным полі більярднага стала. Дзядзька Янка сваімі перакладамі Эзры Паўнда ды Эліота заахвоціў і мяне да практыкаваньняў у ангельскай мове. На сёньня мой урок — ...йкі Гары Кросбі (Harry Crosby). Называецца «Чаму амэрыканцы жывуць у Эўропе?»

«Мне падабаецца жыць па-за межамі Амэрыкі

1. бо ў Амэрыцы ўсе зоркі задыхаюцца

2. бо я не жадаю ўсё жыцьцё прысьвячаць крывадушнасьці

3. бо за межамі Амэрыкі нішто не нагадвае мне маё дзяцінства

4. бо я вораг грамадзтва і магу тут паляваць зь іншымі ворагамі грамадзтва

5. бо хачу ўзяць удзел у сьмерці Эўропы

6. бо люблю мітусьню ды вітаю ковасьць больш за ўтульнасьць

7. бо я не капрафагос

8. бо нават у Эўропе Нью-Ёрк застаецца для мяне горадам 1001 ночы

9. бо рэкі самагубства для мяне больш прывабныя за прэрыі посьпеху

10. бо аддаю перавагу выбухам, а не скавытаньню»

Што прывабіла ў тэксьце? Хіба нечый пабег адсюль? А можа справа ўва мне; нездарма ж кажуць найвялікшая траўма эміграцыі — абуджэньне мастацкіх стымулаў, і тады нават той, хто ня браў раней асадку ў руку, аддаецца разбуральнаму полымю стварэньня.

Чорны шар нетаропка коціцца па маіх паперах, кумпяковая постаць ...кім нагадвае пра сапраўднае прызначэньне зялёнай прасторы. Я зьбіраю рэчы і пасоўваюся ў кут, адкуль добра бачныя дзьверы. Спадзяюся, тут ужо нікому замінаць ня буду і дачакаюся дзядзьку Янку. Я падару яму кнігу Семухі, а потым мы будзем гаварыць пра Кросбі, які ў 1922 годзе, у няпоўныя свае 24 гады, зьехаў у Парыж, выдаў некалькі кніжак вершаў, пачаў пісаць тое, што набыло пазьней аблічча трохтомавага дзёньніка «Цені сонца», а ў 1929 вярнуўся ў Нью-Ёрк і на Каляды забіў сябе. Трэба вось толькі дачакацца яго. Неўзабаве ён прыйдзе.

А за акенцам усё ідзе дождж. Нью-Ёрцкі дождж, які Альбэр Камю назваў даждажом выгнаньня.

Іван Юрэвіч

БЕЛАРУСКАЙ ПРОЗЫ

чалавека, які, седзячы ў сваёй вежы, ведае пра сьвет больш, чым дасьведчаныя сталічныя заўсёднікі. Гэта быў своеасаблівы адказ на модную, таленавітую, але агрэсіўную манеру перакладаць Васіля Сёмухі. Гэта закранала і сёньняшні наш літаратурны кантэкст.

Як акрэсьліць жанр, які пануе ў беларускай літаратуры апошняга дзесяцігодзьдзя? Спроба? Нарыс? Дзёньнік? Досьвед? Эсэ? Так, напэўна, гэта менавіта новая эсэістыка, новы досьвед. «Пэрыяд новага досьведу» і стаў тым празаічным расчараваньнем, што зьмяніла пэрыяд паэзіі «Тутэйшых».

Арлоў са сваёй шалёнай папулярнасьцю як пачынальнік жанру, празаік Глёбус, празаік Адамовіч, Квяткоўскі, дзёньнікі, зацемкі з левай кішэні... Фантазіі пра тое, якім мог бы быць сёньняшні дзень, згадкі пра дзень учорашні, паўкроніка, напалову падарожны дзёньнік, паўпроза. Няспынная эвалюцыя мовы — кампэнсацыя браку новых тэхнікаў пісаньня і гарантыя гермэтычнасьці інтэлектуальнага кола.

Грамадзкі цуд жніўня сьнежня 91-га і літаратурны цуд «Тутэйшых» ня выклікалі лягічных перамен у літаратуразнаўстве і культуралёгіі. Літаратурныя хрэстаматыі працягваюць друкаваць першых, а ня лепшых, а сапраўдная клясыка, паэзія Глёбуса Сыса, Мінкіна, Спач, Сокалава-Воюша, Бабкова, і..., і... застаецца па-за прызнаньнем нашых Бугро. Рэчаіснасьць не перамагла схалястыкі.

Літаратурныя тэндэнцыі дзевяностых абумоўленыя якраз й гэтым непрызнаньнем, якое мяжуе зь няўдзячнасьцю

Новая эсэістыка лёгка і з прыемнасьцю чытаецца, але прыемнасьць гэтага жанру падобная да духмянага дыму. Нарыс мае тую ўласьцівасьць, што па прачытаньні ён неўзабаве зьнікае зь явы. Большасьць твораў беларускай новай эсэістыкі — гэта тыя літары, якія non manent. Чытаў іх з захапленьнем, але калі сёньня раз гортваю «Тунэль зь Серабранкі...» не магу ўзгадаць, што мне гэтак падабалася некалькі гадоў назад.

Новыя досьведы — гэта часовая літаратура, часовая проза. За імі мае прыйсьці нешта трывалае, важкае... (?вечнае?). Дарэчы, успаміны Купрэева, што па форме ішлі ў рэчышчы новай эсэістыкі усё ж помняцца, застаюцца.

Здаецца, у літаратурнай атмасферы ўжо завісла нейкая напятасьць што ў пэўны чарговы момант выбухне разрадам пэўнага новага пэрыяду. Што гэта будзе? Можа, сапраўды, аўтабіяграфіі-ўспаміны сэнсацыйныя і жорсткія, як само жыцьцё; можа «раман» умоўна мэтафарычна кажучы.

Няважна што. Галоўнае, што стогадовая эпоха беларускай дудачнай маслітаратуры скончылася беспаваротна

Мы маем тры мысьленьні і можам выбраць чацьвертае

Андрэй Дынько

Занатоўкі эгаіста

GEWALT*

Адам Глёбус

♥ Спачатку ты палохаесься, потым баісься і, урэшце, ня можаш адмовіцца ад гвалтоўнага ўчынку

♥ Жах перад зьяўленьнем Бога — пачатак мудрасьці, страх перад д'яблам — пачатак разбурэньня, вар'яцтва й гвалту.

♥ Нацыя, якая забівае тырана, становіцца на шлях гвалту і падтрымлівае ўладнасьць сваёй дзяржавы з дапамогай бясконцых злачынстваў. Зрэшты, нацыя, якая забівае забойцу, ня лепшая за нацыю, што забівае караля, бо кароль і зьяўляецца перш-наперш забойцам, гвалтаўніком і тыранам

♥ Нельга ўладарыць бязьвінна. Але ў больш спакойных дзяржавах уладараць прайдзісьветы, махляры й злодзеі, а ў дзяржавах ваяўнічых кіруюць адно забойцы. Таму, абіраючы кіраўніка дзяржавы, трэба аддаць перавагу хітраму махляру каб не зрабіцца закладнікам бескарысьлівага гвалтаўніка

♥ Найгоршае з забойстваў зьнішчэньне бацькоў. Гэта вяршыня гвалтоўнага паўстаньня супраць прыроды, лёсу Бога. Менавіта да бацьказабойства заклікаюць рэвалюцыянэры: «Разбураць да падмуркаў!», «Выперці радзімыя плямы!», «Рэвалюцыя вышэй за ўсё!» Рэвалюцыйнае разуменьне сацыяльнай роўнасьці натыкаецца на сьцяну ўзаемаадносінаў дзяцей з бацькамі й дзядамі. Пачынаецца бесконцае зьмаганьне маладых са старымі.

♥ Тыран, а ніхто іншы, выдае нацыі індульгенцыю з правам на паўстаньне, на гвалт і на пакараньне сьмерцю ўласнай асобы

♥ Мара любога тырана — ня столькі гвалт над жанчынамі, колькі ўсынаўленьне іхніх дзяцей, пабудова такога грамадзтва, дзе ўсе дзеці належаць дзяржаве і, адпаведна, падпарадкоўваюцца тырану. Адсюль і «бацька нацыі»

♥ Калі гвалтаўнік заклікае зьнішчыць людзей выдатных, народ з задавальненьнем пачынае забіваць тых, хто вылучаецца з ноўтопу; наступова даходзіць чарга да гвалтаўніка, крык: «Я ж такі, як і вы!» — не ўратоўвае

♥ Гвалтаўнік абапіраецца на спрошчанае вызначэньне свабоды. Для яго свабода — гэта магчымасьць падпарадкаваць кожнага сваім жаданьням. Гвалтаўнік не спыняецца, падпарадкаваўшы людзей, ён захоплівае іншыя дзяржавы і, што самае дзікае, — пачынае змагацца з прыродаю: выпростваць рэкі, злучаць моры і акіяны. Лавіць вецер, адным словам.

♥ Паводзіны гвалтаўніка вельмі імпульсыўныя, ён на кожным кроку рызыкуе, парушае законы, ігнаруе выпадковасьці і жыве паводле правіла: я зраблю табе любое зло, якое толькі захачу, а ты гэтаксама рабі мне зло, якое зможаш

♥ Гвалтаўнік — гэта ахвяра і кат у адной асобе; кульмінацыяй гвалту, відавочна, будзе самазьнішчэньне

♥ Рэвалюцыйныя хваляваньні выносяць на вяршыню ўлады гвалтаўнікоў, бо менавіта яны абяцаюць спыніць і нарэшце спыняюць гэтыя ж рэвалюцыйныя хваляваньні

♥ Зьнявага прыроды — вось мара шчырага гвалтаўніка, але ў гэтым шчыраваньні ён расплываецца ў бясконцасьці, а прырода застаецца абыякавай. Таму ўвесь час у мяне ўзьнікае жаданьне сказаць гвалтаўніку адно слова: «Супакойся».

♥ Гвалт будуецца на празьмернасьцях і таму ворагі яго ныя: бязьмежнасьць, цішыня спакой.

♥ Гвалтаўнік знаходзіцца ў стане пэрманэнтнай барацьбы з уласнымі страхамі. Ён ведае, што спалох вядзе да страты ўлады, а таму ў халодным поце прымае самыя неверагодныя пастановы, якія мусяць дэманстраваць сьмеласьць і рашучасьць. Гвалтаўнік верыць у свой тэатар, бо ведае, як толькі апусьціцца заслона Сьмерць здыме ягоную гарачую галаву

*Gewalt — гвалт, ад нямецкага, «сіла, моц, улада», паводле Макса Фасмэра (Max Vasmer)

«Бардаўская восень» у Бельску

Зьміцер Бартосік

Бывае дзіўна, апынуўшыся ў мясьцінах, дзе ты быў зусім нядаўна, і якія пакінуў моцна ўражаны, знаходзіць у сабе тыя зьмены, што адбыліся з таго блізкага часу. Да Беластоку я ўжо бяру квіток, нібы да станцыі Койданава. А сядаючы ў аўтобус, ужо не зьдзіўляюся ані белгаворцы дзьвюх нянашых пані, ані рус'язу шчыра нашага Вячаслава Кораня. На мяжы нібы ад надакучлівых кузурак, адмахнуся сваім пашпартам ад заўжды бадзёрых памежнікаў. І рэклямнае сьвятло на тым баку ўжо ніяк не перашкодзіць майму дарожнаму сну. Аж да самага Бельска Падляскага, дзе ўжо трэці раз адбудзецца беларускі фэст аўтарскай песьні й дзе ўсе так, як і было падчас першага.

Куранты на далікатнай ратушы працягваюць адбіваць нерухомы бельскі час. У кідкіх крамках галоўнай вуліцы працягваецца заўсёдны й нетаропкі гандаль. І хоць рэстаранны сэрвіс і якасьць гатэльнай абслугі, можа, ні ў чым не саступяць варшаўскаму, у такіх гарадках, на маю думку, галоўным невырашальным пытаньнем месьцічаў заўжды будзе пытаньне — куды адсюль падацца? Можа з гэтага і нараджаецца ў некаторых дапытлівых бельцаў небанальны адказ — «падацца ў Беларусь». А інакш чым мне растлумачыць сабе нашую прысутнасьць тут? Жаданьнем беларганізацыяў апраўдаць выдаткаваньня польскаю дзяржаваю на культурнае разьвіцьцё нацменшасьцяў грошы? Ці тугою тутэйшага люду, што цэлы год быў пазбаўлены Сяргея Мінскевіча? А як, напэўна, файна апрануць паўвайсковую ўніформу Задзіночаньня Беларускай Моладзі зь бельсцягам на шэўроне і, нікуды асабліва не ад'яжджаючы, узьняць тост за Айчыну-Маці! Тым больш, калі адсечаныя кардонам браты самі прыедуць, заўсёды радыя лішні раз сербануць тваёй цывілізацыі

Сцэна была дэкараваная апалымі лістамі, шчодрым кілімам рассыпанымі паміж кулісамі. Першым разьмесьці тыя лісты выпаў гонар Сержуку Сокалаву-Воюшу. Я ніколі ня бачыў гэтага чалавека. Адно слухаючы ягоныя запісы, шчыра спачуваў сабе, што не застаў часы Майстроўні ды Талакі. Ды, чуючы ягоныя перадачы ў «Свабодзе», як мог, спачуваў гэтаму грамадзяніну Сьвету, якому я ня маю падставаў ня верыць, што «чужына сэрца джаліць, цісьне як зьмяя». Хоць ён выглядаў у поўным парадку. Можа толькі ў новых песьнях пра Слуцкае паўстаньне выразна зьявілася тэма Адступленьня Публіка прыняла госьця як і належала.

Пасьля на сцэну выйшла Вольга Акуліч, больш вядомая як вядучая тэлепраграмы «КРОК». Нічога не магу з сабою зрабіць але ніяк не магу пераварыць аўтарскую песьню ў жаночым выкананьні І ні ў Вользе тут справа. (Хоць яе расейскія песьні больш цікавыя) І ня ў Элі Бэзюк якая таксама сьпявала на фэсьце Проста мне гэта бачыцца нейкім абсалютна іншым жанрам Можа таму іншая бардэса, Вольга Цярэшчанка зьвярнулася да струннага квартэту? А Камоцкая сыйшла ў рок дзе і ўзьляцела на «Новае неба». І, беручы гітару, ужо не рызыкуе зь яго зьляцець. Нават гайнаўскія хуліганы на апошніх радах пры яе зьяўленьні прыпынілі сваю балбатню. Абудзіўшыся ізноў толькі пры зьяўленьні супрацоўніка газэты «Культура», перакладчыка Адама Міцкевіча Сяргея Мінскевіча. У якім жанры працуе гэты перакладчык на сцэне, для мяне вялікая загадка. Пунш з двух акордаў, трох фразаў ды сотні грымас, якімі пясьняр расквечвае свае сьпевы, быў прыняты гэмнімі высокімі дэцыбэламі залі.

Ніколі ня мог уявіць у ролі барда Лявона Вольскага. А ён ім, зрэшты, і ня быў ніколі. Нават тут, з гітараю ды ў бархатным пінжаку, рок-музыкант застаўся верны старым традыцыям. А менавіта — кабарэту. Напісаны сумесна з паэтам Анемпадыставым «Народны альбом», некаторыя шансаньеткі зь якога былі прасьпяваныя, падаўся мне, можа больш цікавым, чым тое, што «тут зусім ня рай». Прынамсі, такі Вольскі мне бліжэй. Разам са сваімі лірычнымі героямі, лубочнымі насельнікамі незваротнай Заходняй Беларусі часоў польскага прыгнёту. Ці можа — раю?..

Андрэй Мельнікаў ніколі ня быў за гэтаю мяжой. Таму ад пачатку чакаў чагосьці нянашага па форме ды наскага па зьмесьце. Усяго таго, што напрыдумляў сабе, ня вырваўшыся ў свой час на першае «Басовішча». Сугэльную белмову на стракатым рэклямным тле. Ды, дзякуй Богу, усё ж дачакаўся. Прынялі залю як герои і адораны журы галоўным прызам магчымасьцю запісаць альбом у студыі беластоцкага радыё. Хоць я, шчыра кажучы, баяўся, што гранпры дадуць каму-небудзь зь мясцовых. Раіў бы Андрусю перазапісаць свае самыя першыя песьні, зь якіх пачалося й мае беларускае пяяньне. І якія могуць перажыць яшчэ не адно пакаленьне абуджаных Беларусяй.

Сярод апалых лістоў «Бардаўскай восені» Алесь Камоцкі глядзеўся найбольш арганічна. Першы беларускі бард, паклаўшы пачатак жанру ў далёкім 82-м, сёньня сьпявае пра восень. Сьпявае нягучна і, быццам бы, цалкам занурыўшыся ў сябе. З той доляю прафэсіяналізму ў тэкстах і мэлёдыцы песень, якая дазваляе іх аўтару амаль не заўважаць залю. І незаўважна для сябе набываць лоск клясыка. А банкет быў як банкет. Хоць і не люблю я іх з-за немагчымасьці нармальна пасьпяваць. А цяпер мяне й на сцэне ня вельмі заўважылі. А тут, спаміж Мельнікавым, Воюшам і Вольскім пра гітару й зусім ня думай. Таму нясьпетае я кампэнсаваў сьпітым Пасьпеўшы, аднак, адзначыць, як файна, з каўкаскімі пераліваμі шматгалосься сьпяваюць дужыя хлопцы з ЗБМ; што Сакрат Яновіч падобны да Робэрта дэ Ніра ў старасьці; якія ідэальна-беларускія малыны ў Воюша і як мяне цягне адсюль у Менск

Большасьць старажытных назваў віленскіх вуліц і плошчаў у пасьлясавецкі час вярнулася на свае спракаветныя месцы, праўда, у літоўскім гучаньні А наагул па зьменах гэтых назваў можна стварыць цэлую манаграфію, у якой адаб'ецца гісторыя.

Батураўскі пляц стаў звацца Унівэрсытэцкім. Пасьля пабудовы тут губэрнатарскага палаца пляц назвалі Губэрнатарскім. У 1812 французы ахрысьцілі яго імем Напалеона. Пазьней расейцы назвалі пляц Мураўёўскім і паставілі графу-вешальніку помнік. Помнік пастаяў нядоўга, у першую сусьветную вайну яго зьвярнулі, а пляц, на якім ён стаяў, зноў назвалі Напалеонаўскім, а пасьля Біскупскім, бо да яго прымыкае рэзыдэнцыя віленскіх біскупаў. У 30-я яго назвалі ў гонар Пілсудзкага. У апошнюю вайну перайменоўвалі тройчы: літоўцы, саветы і немцы. На вайне саветы назвалі пляц імем Кутузава на той падставе, што ў 1812 расейскі генэрал адпалуднаваў у палацы губэрнатара. Сёньня пляц завецца Музэйным, але безь ніякіх падставаў...

На здымку — бажніца, якая дала першапачатковы назоў славутаму віленскаму праспэкту. Пекныя ракайльныя шчыцы франтонаў касьцёлу, які Вы бачыце, натхнялі розных мастакоў, напрыклад, Дабужынскага, які пакінуў клясычны відарыс гэтага кутку Вільні.

Што гэта за помнік, як ён завецца? Як першапачаткова зваўся галоўны праспэкт Вільні? Чакаем...

Сяргей Харэўскі

К о н к у р с

Крывіцкая Мэкка

П о м н і к і н а ш ы

Стары замак

Праца са старонкі 1.

За лета ўмацаваная ўся верхняя тэраса, якая раней была аточаная абарончым мурам, што захаваўся толькі фрагмэнтарна.

Цяпер уся гара, нібы каронай, сьціснута жалезабэтоннымі палямі і сьцяжкамі. Але іх ніхто ня бачыць!

На Верхнім замку застаўся толькі адзін аб'ект, які знаходзіцца ў аварыйным стане, — знойдзеныя пяць гадоў таму падчас раскопак рэшткі падмурку паўночнае вежы, што схаваныя ад неспрыяльнага ўзьдзеяньня толькі штакетным насьцілам і толем.

Што рабіць з падмуркам вежы? Гэтае пытаньне паўстала ўжо летась. Архітэктары зразумелі, што прыйдзецца распрацоўваць сур'ёзны праект І рабіць яго не для кожнай вежы паасобку, а спараджваць увесь комплекс Верхняга замку. Давядзецца ўмацаваць і паўднёвую вежу, рэшткі муроў якой хоць і абароненыя дахам, але, на меркаваньне спэцыялістаў, павінны мець нашмат больш прыстойны выгляд.

Прынцыповага вырашэньня чакае вялікакняскі палац на Верхнім замку. Ягоная заля з уражвальнымі скляпеньнямі, якія цалкам ацалелі, можа стаць месцам, якое пасуе і для сучасных урачыстых «княскіх» прыёмаў.

Архітэктары Гедра Філіповіч, Эвальд Пурліс і Аўдрус Воўкус падрыхтавалі чатыры варыянты праекту ўмацаваньня і добраўпарадкаваньня Замкавай гары. Прапануецца аформіць усе старажытныя збудаваньні так, каб яны добра праглядаліся, ня толькі калі вы падняліся на гару але і зьнізу І каб, нарэшце, было ясна, што гара



Гедыміна — гэта ня толькі адна ацалелая вежа, але й цэлы комплекс.

Ёсьць ідэя зрабіць для пад'ёму на гару ліфт ці што-небудзь такога кшталту. Бо колькасьць траўмаваных, асабліва ўзімку, на-прасту катастрафічная — людзі ня могуць караскацца па зьледзянелым старасьвецкім бруку.

Адна з прапановаў — пабудаваць фунікулёр там, дзе цяпер знаходзіцца грузавы пад'ёмнік. Другі варыянт — ліфт. Для гэтага можна было б скарыстаць вэнтыляцыйную шахту сховішча, вырытага немцамі падчас другой сусьветнай вайны. Гэтае сховішча, пра якое, дарэчы, таксама ведае толькі вузкае кола гісторыкаў, знаходзіцца ўсярэдзіне гары амаль пад самым замкам. Пра памеры сховішча можна меркаваць хаця б з таго, што у адной толькі вэнтыляцыйнай шахце можна ўсталяваць ліфты! Шахты сапраўды даволі прасторныя — на чатыры квадратныя мэтры У чатырох прылеглых да іх памяшканьнях можна было б разьмясьціць прыстойныя прыбіральні, якіх тут дагэтуль няма, хоць гэтага настойліва патрабаваў прэзыдэнт Літвы Бразаўскас яшчэ год таму, падчас наведаньня Верхняга замку

Г.Філіповіч к рує праектам асвятленьня віленскіх замкаў, які ствараецца ў Інстытуце рэстаўрацыі. У гэтай працы бярэ ўдзел і тэатральны мастак Р.Трэйніс. Адначаго разу Вільня ўжо бачыла вынікі гэтага праекту: у лютым адбылася рэпэтыцыя. Спэцыяльна прывезеныя тэатральныя юпітэры асьвятлялі рознаколернымі праменьнямі гару вежу, руіны замка. Уражаньне было незабыўнае — ня проста падсьветка, а драматычная гульня з колерам, фактураю і тэктонікай архітэктурных дэталяў.

Аўтары распрацавалі тры рэжымы асьвятленьня: штодзённы, сьвяточны і эканомі. Абвешчаны конкурс сярод айчынных і замежных фірмаў на рэалізацыю праекту. Хутчэй за ўсё, Гедымінава гара і віленскія замкі выбухнуць прамянямі электрычнага сьвятла на Каляды, падчас урачыстага вяртаньня на франтон Катэдральнага сабору скульптураў, скінутых у свой час камуністычнымі ўладамі.

А ў саміх замках кіпіць работа. Адна з апошніх сэнсацыяў — знаходка кафлянае майстэрні, дзе выраблялася кафля для вялікакняскіх рэзыдэнцыяў. У доме №8 на вуліцы Сьв. Міхала, у глыбокіх скляпеньнях пад трыма пластамі бруку была знойдзеная печ для абпальваньня керамікі. А яшчэ глыбей, ужо на глыбіні чатырох мэтраў была выяўленая цэлая майстэрня зь дзьвюма печамі пачатку XVI ст.

P.S. Дом на вуліцы Сьв. Міхала згадваецца ў дакумэнтах пад 1684 годам. Археолягі «састарылі» яго амаль на паўтары стагодзьдзі. Падчас вывучэньня самога дому ў адной з кватэраў выявілі... будысцкую малельню. Пад тынкам апынуліся росьпісы канца XVIII — пачатку XIX ст. з выявамі тыграў, арлоў і г.д. У кватэры да самага апошняга часу жылі будысты, да іх зьбіраліся аднаверцы. У другой кватэры існавалі здані. Жыхары дому падрабязна распавядаюць, што у адным з пакояў увесь час было чуваць нечыя крокі, уздыхі, няясныя маналёгі і рып нейкіх дзьвярэй. Новы гаспадар павесіў у пакоі на сьцяну ружанец А ў тую ж ноч павесіўся чалавек суседняе кватэры Зданяў больш не чуваць...

Сяргей Харэўскі

U N D E R G R O U N D

«Нэгатыў» усіх зьдзівіў

Сталічны клюб «Cosmopolitan» ведаюць прыхільнікі андэрграўнду Гэта бадай адзіная ў Менску пляцоўка, дзе незалежна ад уласных здольнасьцяў і стылю могуць выступіць любыя гурты. Праўда, толькі зрэдку сюды заносіць выканаўцаў з правінцыі Гэтак 24 кастрычніка разам зь менскімі камандамі «Н.ОК –key» і «Sarcastic green» выступалі берасьцейскі «Нэгатыў» і «Green snake» з Маладэчна. Больш за ўсё ўразіў «Нэгатыў». Па-першае гэта адзіная берасьцейская каманда якая здолела трапіць на менскую сцэну. Па-другое, зьдзівілі філязофскія тэксты па расейску (сталічныя «экстрэмалы» у большасьці сьпяваюць па-ангельску), у якіх выразна чытаўся пратэст супраць шэрасьці, неразуменьня грамадзтвам тых, хто нечым адрозьніваецца ад натоўпу. У якасьці выйсьця прапанаваўся суіцыд. Са словаў вакаліста Алега Сьцепанюка крэда «нэгатыўшчыкаў» — хворыя думкі пры здаровым ладзе жыцьця. Падчас выступу гурта заля нібы звар'яцела — атрымалася сапраўднае шоў.

Праўда, скончыўся выступ для лідара групы А Сьцепанюка кепска — яго абакралі

Міні-фэст у Берасьці

Апошнім часам наладзіць у Берасьці андэрграўндавы сэйшн было амаль не агчыма Яшчэ летась улады разгарнулі вялізную кампанію супраць мясцовых сатаністаў і, як гэта водзіцца, залічылі да іх музыкаў. Таму фэстываль, які адбыўся 1 лістапада ў ДК чыгуначнікаў — красамоўны ўзор падпольшчыны. Ні табе рэклямы, ні квіткоў, ні журналістаў з афіцыйных газэт. Тым ня менш, заля была поўная

Са словаў выдаўцоў нелегальнага «Sacrifical Suiside'zine» Дэна Шчапанскага і Ўладзіміра Хоміча, якія арганізавалі фэст акцыя была скіраваная супраць наркотыкаў і праводзілася пад лёзунгам «Stop the madness». Змагацца супраць сьмяротнай атруты пажадала шмат гуртоў з розных гарадоў Беларусі, аднак у гэты вечар удалося паслухаць толькі берасьцейскую «Кобру» і чарговы праект менскага гурта «Septic Shizo» пад назвай «Another one day». Арганізатары паабяцалі, што наступная частка фэсту з удзелам менскіх, гомельскіх і берасьцейскіх гуртоў адбудзецца праз тыдзень

Ю.Г.В.

© НАША НІВА. Спасылка на "Нашу Ніву" абавязковая. Наклад 5100. Нумар падпісаны ў друк 19??, 3/11/1996. Друкарня выдавецтва "Беларускі Дом друку". Менск, праспэкт Францішка Скарыны, 79. Замова № 7008. Кошт свабодны